А.Ф. Вішнеўскі
І.У. Вішнеўская



ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

FS plus

А.Ф. Вішнеўскі
І.У. Вішнеўская

ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

Даведачны дапаможнік

Мінск
ФілСерв плюс
2000

УДК 378(476-25)(0.35.5)
ББК 74.58(4Беи)я2
В55

Вішнеўскі А.Ф., Вішнеўская І.У.
В55 Гісторыя дзяржавы і права Беларусі.-Мн: ФілСерв плюс, 2000. — 134с.

ISBN 985-6489-17-2

У даведачным дапаможніку «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» ў храналагічнай паслядоўнасці асвятляюцца асноўныя этапы ўзнікнення і развіцця дзяржаўна-прававых інстытутаў. Аналізуюцца нарматыўна-прававыя акты.

Прызначаны для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыей дзяржавы і права Беларусі.

УДК 378(476-25)(0.35.5)
ББК 74.58(4Беи)я2

© Вішнеўскі А.Ф., 2000
© Вішнеўская І.У., 2000
© ФілСерв плюс, 2000

ISBN 985-6489-17-2

ДА ЧЫТАЧА

Гісторыя беларускага народа надзвычай насычана гераічнымі і драматычнымі падзеямі. Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы, Беларусь не толькі зведала дабратворны ўплыў суседніх этнасаў, але шматразова з'яўлялася арэнай крывавых канфліктаў, жорсткага супрацьстаяння розных дзяржаў. Усё ж, нягледзячы ні на што, працавіты беларускі народ, актыўны стваральнік шматлікіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, унёс свой адметны ўклад у развіццё еўрапейскай і сусветнай цывілізацыі.

Асабліва важкі ўклад нашых суайчыннікаў у развіццё прававой культуры і юрыдычнай думкі феадальнагп грамадства. Сярод такіх сусветна вядомых помнікаў права, як законы Хамурапі, Законы Ману, Законы дванаццаці табліц, Кодэкс Юсцініяна, Руская Праўда і інш., ганаровае месца належыць Статуту Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. На працягу 250 гадоў ён быў дзеючым законам на тэрыторыі Беларусі і з'яўляўся асновай усёй прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага. Статут аказаў адметны ўплыў на прававую сістэму Расіі, Польшчы, Латвіі, Эстоніі і іншых блізкіх і далёкіх краін. Вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі не толькі дапамагае асэнсаваць пэўныя аспекты жыццядзейнасці людзей, але і ўсвядоміць уплыў некаторых гістарычных акалічнасцяў як на лёс асобных пакаленняў, так і цэлых народаў.

Прадметам вывучэння гісторыі дзяржавы і права Беларусі з'яўляюцца асноўныя гістарычныя заканамернасці ўзнікнення і развіцця дзяржаўна-прававых інстытутаў, палітычнай і прававой культуры, тыпаў і форм дзяржаўнасці і г.д. Зразумела, што гісторыя дзяржавы і права галоўнымі аб'ектамі вывучэння бачыць заканадаўства, гісторыю яго развіцця. А законы — лепшы матэрыял для вывучэння грамадска-палітычнага ладу, галін права, дзяржаўнага механізму. Вось чаму гісторыя дзяржавы і права Беларусі, якая выкладаецца ў вышэйшых навучальных установах краіны, з'яўляецца адной з фундаментальных юрыдычных дысцыплін.

Адказы на пытанні, якія з'яўляюцца больш складанымі для студэнтаў, аўтарамі падрыхтаваны ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што некаторыя праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі яшчэ застаюцца недаследаванымі, многія разглядаюцца з некалькіх, часам супярэчлівых, пунктаў гледжання. У сувязі з гэтым у адказах на пытанні аўтары даюць сваё бачанне праблемы, аналізуюць погляды тых ці іншых навуковых школ, асобных вучоных.

1. Прадмет і задачы гісторыі дзяржавы і права Беларусі

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі вывучае працэсы ўзнікнення і развіцця дзяржавы і права на тэрыторыі нашай Радзімы ў іх цеснай узаемасувязі на розных этапах жыццядзейнасці нашых суайчыннікаў.

Паколькі развіццё дзяржавы і права залежыць у першую чаргу ад эканамічнага базісу, то і перыядызацыя гісторыі дзяржавы і права грунтуецца на перыядах развіцця вытворчых адносін. Асноўным грамадска-эканамічным фармацыям адпавядаюць і пэўныя тыпы дзяржавы і права.

Зразумела, што ў чыстым выглядзе нельга выдзеліць ні рабаўладальніцкага, ні феадальнага, ні буржуазнага ладу. Эканоміка любога грамадства амаль заўсёды шматукладная. Тым часам можна выдзеліць нейкую пэўную форму грамадскіх адносін, якая з'яўляецца вядучай, галоўнай. Яна і кладзецца ў аснову таго ці іншага грамадскага ладу. Тое ж можна сказаць і аб дзяржаве і праве, якія часта спалучаюць у сабе рысы розных тыпаў, але пераважаюць звычайна рысы якога небудзь аднаго, выключаючы, зразумела, пераходныя эпохі.

Праўда, у апошнія гады многія навукоўцы выказваюцца крытычна аб фармацыйным падыходзе пры вывучэнні гісторыі чалавецтва, а значыць і да тыаплогіі дзяржавы і права. Яны бяруць на ўзбраенне цывілізацыйны падыход пры асвятленні названай праблемы.

Як гістарычная навука гісторыя дзяржавы і права — частка гісторыі чалавецтва, разам з тым яна з'яўляецца навукай юрыдычнай — адной з фундаментальных прававых дысцыплін. Толькі гісторыя дзяржавы і права вывучае палітычныя і прававыя інстытуты з момангу іх з'яўлення і да цяперашняга часу. Яна, такім чынам, займаецца не толькі вывучэннем права, якое дзейнічала ў мінулым, але і дзеючым зараз, прававымі галінамі і інстытутамі, якія развіваюцца.

Калі тэорыя дзяржавы і права вывучае галоўным чынам агульныя заканамернасці развіцця дзяржавы і права розных народаў, то гісторыя дзяржавы і права займаецна канкрэтнымі дзяржавамі і прававымі сістэмамі, у прыватнасці, што існавалі і існуюць на тэрыторыі нашай краіны, разглядае іх асаблівасці і характэрныя рысы. Гісторыя дзяржавы і права выкарыстоўвае абагульненні, якія робіць тэорыя дзяржавы і права, і ў той жа час, даследуе, а значыць, і дае канкрэтны матэрыял для такіх абагульненняў.

Гісторыка-прававая навука прызвана несці чытачу праўдзівыя звесткі. Праўдзівасць гісторыка-прававога матэрыялу абавязкова неабходная для яго практычнага выкарыстання. Гістарычны аналіз

заканадаўства неабходны і для правільнага разумення дзеючых норм права (гістарычнае тлумачэнне закона), і для крытычнай ацэнкі састарэлых норм.

Разам з тым вывучэнне гісторыі дзяржавы і права сваей краіны беларускаму народу неабходна і для таго, каб умацаваць уласную нацыянальную годнасць, вызначыць сваё месца сярод народаў свету.

2. Грамадскі лад усходнеславянскіх княстваў у IX - першай палове XIII стагоддзя

У разглядаемы перыяд на тэрыторыі сучаснай Беларусі існаваў раннефеадальны лад. Асноўнымі класамі былі феадалы і феадальна-залежныя сяляне. Пры гэтым адзначым, што ў грамадстве адначасова з феадаламі і феадальна-залежным насельніцтвам існавалі рабы (халопы, чэлядзь нявольная), свабодныя гарадскія жыхары (рамеснікі, купцы, госці) і сяляне-даннікі. Апошнія не знаходзіліся ў залежнасці ад асобных феадалаў, а выконвалі пэўныя павіннасці і ўносілі феадальную рэнту непасрэдна на карысць дзяржавы.

Зразумела, што ў IX-XI стст. працэс феадалізацыі развіваўся марудна. У IX ст. князь не жалаваў сваёй дружыне зямель і не заводзіў сваей гаспадаркі, а абкладаў свабоднае і паўсвабоднае насельніцтва данінай. Збор дароў з свабоднага насельніцтва на тэрыторыі, якой уладаў князь, называўся «палюддзем». Дружыннікі таксама атрымлівалі ад князя правы збіраць даніну і «карміцца» з той ці іншай воласці. Так, яшчэ да з'яўлення буйнога княжацкага землеўладання ва ўсходніх славян узнікалі прыкметы васальнай залежнасці. Яна выглядала ў якасці права атрымання дружынікамі даніны з пэўнай тэрыторыі. У якасці васалаў вялікага князя дружыннікі неслі ў яго службу за «лен».

Ваенная дружына была важнай апорай княжацкая ўлады. Дружыннікі акружалі князёў, абаранялі ўсе іх інтарэсы. З імі князь раіўся па пытаннях арганізацыі паходаў, а таксама суда і адміністрацыйнага кіравання. Калі князь перамяшчаўся на новае княства, дружына ішла за ім. Так, калі ў 1088 годзе тураўскі князь Святаполк Ізяславіч перайшоў на вялікакняжацкі стол у Кіеў, то з сабой ён забраў і тураўскую дружыну.

Дружыны ў полацкіх князеў, як і ў іншых князёў «рускіх», складаліся з дзвюх груп: у першую — старэйшую дружыну, уваходзілі

«бояри», «сильные мужи»; у другую — малодшую дружыну, якая жыла пры двары князя, — «гридь», «отроки», «детские» 3 яе выходзілі слугі князя, яго целаахоўнікі, малодшыя службовыя асобы. Земскія ратнікі, якія не належалі да сталага княжацкага войска, насілі найменне «вояў».

Такім чынам, грамадства распалася на некалькі пластоў. Вышэйшы складалі князі, баяры, старэйшая і малодшая дружыны, духавенства. Феадалы былі ўзаемазвязаны сістэмай васалітэта, якая рэгулявала правы і абавязкі паміж імі, а таксама іх перад дзяржавай.

Эканамічная магутнасць класа феадалаў дазволіла яму заняць пануючае становішча ў палітычным жыцці грамадства, захапіць у свае рукі ўсе ключавыя пасады ў дзяржаўным апараце. Клас феадальназалежных людзей утвараўся:

1. За кошт замацавання халопаў і іншых несвабодных людзей на зямлі, бо для феадала значна важней станавілася валодаць правам распараджацца павіннасцямі сялян, чым іх асобамі.

2. Шляхам гвалтоўнага пазаэканамічнага прымусу былых свабодных абшчыннікаў уносіць пэўныя даніны і выконваць павіннасці на карысць асобных феадалаў або дзяржавы ў цэлым.

3. У выніку маёмаснага расслаення свабодных сялян, якія, збяднеўшы, трапілі ў даўгавую кабалу.

Разам з тым на пачатку развіцця феадальных адносін на тэрыторыі Беларусі працягвалі яшчэ захоўвацца свабодныя сяляне-данікі, якія вялі сваю ўласную гаспадарку і абавязаны былі ўносіць на карысць цэнтральных і мясцовых органаў кіравання пэўную даніну натурай або грашыма, выконваць шэраг дзяржаўных павіннасцей (нясенне ваеннай службы ў апалчэнні, рамонт і будаўніцтва замкаў, мастоў, шляхоў (дарог) і г.д.). Сяляне-даннікі захоўвалі сваю свабоду да XVII ст.

Наяўнасць у разглядаемы пярыяд значнай колькасці свабодных сялян-даннікаў і рабоў у канчатковым выніку не мяняла феадальнага характару грамадскіх адносін. Свабодныя сяляне-даннікі плацілі рэнту на карысць феадальнай дзяржавы і рабы эксплуатаваліся таксама феадаламі. У эканамічнай структуры грамадства праца свабодных сялян-даннікаў і чэлядзі нявольнай не мела вядучай ролі, а насіла дапаможны характар.

У гарадах таксама ішоў працэс маёмаснага расслаення. Пануючае становішча ў гарадской эканоміцы занялі купцы і багатыя рамеснікі. Яны аказвалі значны ўплыў і на палітыку дзяржавы.

3. Палітычны лад дзяржаў-княстваў

На тэрыторыі Беларусі ў IX-XIII стст. існавалі такія буйныя дзяржавы-княствы, як Полацкае, Тураўскае, Менскае, Новагародскае, Смаленскае і іншыя.

Нягледзячы на недастатковасць гістарычных крыніц, ўсё ж можна скласці пэўнае меркаванне аб палітычным ладзе старажытных дзяржаў-княстваў, арыентуючыся перш за ўсё на палітычны лад Полацкага княства, паколькі сістэма органаў улады і кіравання ў дзяржавах-княствах IX-XII ст.ст. на тэрыторыі Беларусі была таго ж тыпу, што і ў іншых дзяржавах, якія складалі Кіеўскую Русь. Вышэйшую ўладу ажыццяўлялі князь, рада князя, веча. Функцыі органаў цэнтральнага кіравання выконвалі такія службовыя асобы, як пасаднік, тысяцкі, падвойскі, ключнік, цівун і інш.

Галоўнай асобай у сістэме ўлады быў князь. Ён стаяў на чале дзяржавы і ўсіх выканаўчых органаў, меў права вырашаць усе бягучыя справы дзяржаўнага кіравання. Асноўным абавязкам князя была арганізацыя абароны дзяржавы ад знешняга нападу і падтрыманне ўнутранага парадку. Уладарныя паўнамоцтвы князя абумоўліваліся як яго асабістымі якасцямі і аўтарытэтам сярод насельніцтва, так і падтрымкай вярхоў пануючага класа.

Уступленне на прастол суправаджалася строгім рытуалам, у час якога прыносілася прысяга з абяцаннем ахоўваць тэрыторыю дзяржавы і інтарэсы грамадзян, дзейнічаць у адпаведнасці з мясцовымі дзяржаўна-прававымі звычаямі. Умовы ўступлення князя на пасаду афармляліся ў дагаворы-радзе, які заключаўся князем з вярхушкай пануючага класа. Напрыклад, полацкі князь абавязваўся не ўмешвацца ў царкоўныя справы, не адымаць маёмасці ў палачан, старых рашэнняў судоў не пераглядаць, не перашкаджаць выезду свабодных людзей за межы княства і г.д.

Як бачым, паўнамоцтвы князя ажыццяўляліся ў асноўным у сферы выканаўча-распараджальнай дзейнасці. Правам выдання новых законаў князь не валодаў. Такое права мелі рада князя і веча. Займацца правасуддзем князь мог толькі з сябрамі яго рады і іншымі службовымі асобамі. Такім чынам і судовая дзейнасць князя абмяжоўвалася.

Што сабой уяўляла рада князя? Па-першае, яна не мела пастаяннага складу. Князь мог запрашаць да сябе на нарады ўсіх, каго ён жадаў. Аднак князь не мог ігнараваць думкі найбольш уплывовых у дзяржаве людзей, асабліва службовых асоб цэнтральнага і дварцовага кіравання.

Па-другое, кампетэнцыя рады фактычна злівалася з кампетэнцыяй

князя, бо ўсе пытанні, якія вырашаліся князем, як правіла, ён абмяркоўваў са сваімі дарадчыкамі. Аб залежнасці князя ад свайго акружэння расказвае ісландская «Сага аб Эймундзе». У ёй гаворыцца, што калі скандынавец Эймунд прыйшоў з дружынай наймацца на службу да князя Брачыслава, то князь сказаў яму: «Дайце мне час параіцца з маімі мужамі, таму што яны даюць мне грошы, а я толькі іх трачу».

На пасяджэннях Рады прысутнічалі не ўсе асобы, якія мелі права прымаць удзел у нарадах з князем, а толькі тыя, хто ў гэты момант быў каля яго. Пры вырашэнні асабліва важных пытанняў рада збіралася ў поўным складзе. Акрамя пытанняў бягучай выканаўча-распараджальнай дзейнасці ў Радзе князя вырашаліся і найбольш важныя судовыя справы, якія тычыліся інтарэсаў феадалаў і вышэйшых службовых асоб дзяржаўнага апарата. На Радзе рыхтаваліся пытанні, якія трэба было абмеркаваць на вечы.

У палітычным жыцці Полацка пэўнае значэнне мела веча — агульны сход палачан, які збіраўся для вырашэння розных праблем. Гэта была пачатковая форма гарадскога самакіравання, у пэўнай ступені падуладнага мясцовай знаці. У пачатку XII ст. роля веча ўзрасла настолькі, што яно актыўна вырашала пытанні вайны і міру, запрашала на прастол князёў і нярэдка праганяла іх з горада, устанаўлівала раскладку павіннасцей і падаткаў, прымала захады па арганізацыі апалчэння і абароны, разглядала найбольш важныя судовыя справы, ажыццяўляла заканадаўчую ўладу.

Княжацкая ўлада ў Полацку была значнай нават у перыяды найбольш актыўнай дзейнасці веча. Князь узначальваў ваенныя сілы, меў пры сабе дружыну, ажыццяўляў унутранае кіраванне, мог заключыць мір і г.д., раздаваў воласці разам з гарадамі іншым князям-васалам.

У перыяды падпарадкавання беларускіх княстваў Кіеву адносіны паміж кіеўскім князем і мясцовымі князямі (полацкімі, тураўскімі і інш.) будаваліся на прынцыпах васалітэту. Кіеўскі князь быў сюзерэнам і аказваў дапамогу мясцовым князям, якія, у сваю чаргу, абавязваліся быць «у яго паслушэнстве», выстаўляць войска, перадаваць частку сабранай даніны. У выпадку парушэння васалам сваіх абавязкаў, ён мог быць пакараны пазбаўленнем сваіх уладанняў. Ажыццявіць жа гэта магчыма было толькі шляхам прымянення сілы (ваенным шляхам).

Пра грамадска-палітычны лад у Тураўскім княстве і яго гарадах звестак мала, але яны вельмі важныя. Верагодна, што ў Тураве, як і ў Полацку, актыўна дзейнічала веча. Паводле звестак, узятых з «Жыція Кірылы Тураўскага», ён стаў епіскапам па просьбе князя «і людзей таго

горада». З гэтага вынікае, што гараджане ў Тураве мелі права голасу, калі вырашалася пытанне пра выбранне епіскапа. Факт цікавы яшчэ і таму, што звычайна епіскап прызначаўся кіеўскім мітрапалітам.

Як мы ўжо гаварылі вышэй, функцыі органаў кіравання выконвалі пасаднік, тысяцкі, падвойскі, ключнік, цівун і інш.

Пасаднік абіраўся вечам, або прызначаўся князем у іншыя гарады дзяржавы, дзе ён з'яўляўся намеснікам князя. Знаходжанне ў горадзе адначасова князя і пасадніка, акрамя як у Ноўгарадзе Вялікім, — з'ява незвычайная. Аб існаванні пасадніка ў Полацку звестак няма, а ў Тураве, паводле іпацьеўскага летапісу, у сярэдзіне XII ст. знаходзіліся адначасова князь і пасаднік. Такі факт можа сведчыць аб асаблівасцях грамадска-палітычнага ладу ў Тураўскім княстве.

Галоўным абавязкам тысяцкага з'яўлялася ваеннае кіраўніцтва. У час вайны ён камандаваў апалчэннем. А ў мірны — сачыў за падтрыманнем парадку ў горадзе.

Падвойскаму даручалася сачыць за выкананнем рашэнняў веча і распараджэнняў князя.

Гаспадарчымі справамі і некаторымі судова-адміністрацыйнымі пытаннямі ў дзяржаве займаліся ключнік і цівун.

Важным элементам палітычнай сістэмы была царква, цесна звязаная з дзяржавай. Па сутнасці, у яе веданні знаходзілася ідэалагічная апрацоўка насельніцтва. Вярхушка духавенства прымала актыўны ўдзел у палітычным жыцці дзяржавы і грамадства.

4. Станаўленне права старажытнай Беларусі і яго характарыстыка

У першым тысячагоддзі нашай эры ва ўсходніх славян фарміравалася ўстойлівая сістэма агульнапрынятых звычаяў, якая вызначала правілы паводзін людзей. Паступова частка звычаяў пачала набываць рысы абавязковасці, нярэдка суправаджалася прымусам, які быў санкцыяваны родаплямённымі органамі і абшчынамі, і набыла якасць звычаёвага права. Яно выяўлялася, напрыклад, у кроўнай помсце за забойства родзічаў, у спосабах заключэння шлюбу і парадку атрымання спадчыны, у выгнанні з абшчыны за парушэнне міру і г.д.

Узнікненне старажытных дзяржаў на тэтыторыі Беларусі суправаджалася фарміраваннем старажытнага феадальнага права. Першай крыніцай права, яго асновай, і былі старажытныя звычаі. З таго

моманту, калі звычай санкцыяваўся дзяржавай, ён станавіўся нормай звычаёвага права. Гэтыя нормы маглі існаваць як у вуснай, так і ў пісьмовай форме.

Частка норм звычаёвага права паступова замацоўвалася ў дзяржаўным пісьмовым заканадаўстве, частка відазмянялася, або заканадаўча забаранялася. Кроўная помста, напрыклад, была забаронена ўжо ў XI ст.

Такім чынам, у старажытнасці пануючым было звычаёвае права. Яно ўяўляла сабой сістэму прававых норм, якія ўзніклі непасрэдна з грамадскіх адносін, што абапіраліся на агульнапрымальнасць і даўнасць ужывання і былі санкцыяваны дзяржавай.

З далейшым развіццём і ўмацаваннем феадальных адносін ствараліся ільготы для пануючага класа. Таму ад дзяржавы патрабавалася выданне спецыяльных законаў, дапаўненняў і тлумачэнняў да нормаў звычаёвага права. Так ствараліся нормы пісанага права, якія спачатку не адмянялі нормаў звычаёвага права, а толькі дапаўнялі іх, надавалі ім агульнадзяржаўны характар. Таму не выпадкова, што ва ўсіх старажытных помніках пісанага права асноўны змест складалі нормы, узятыя са звычаёвага права.

Звычаёвым правам у старажытнасці рэгуляваліся ў грамадскім жыцці ўсе праваадносіны: структура і кампетэнцыя дзяржаўных устаноў, правы і абавязкі розных класаў, станаў (саслоўяў) і сацыяльных груп насельніцтва, грамадзянскія, сямейна-шлюбныя, зямельныя, судова-працэсуальныя, крымінальныя і інш. На Беларусі звычаёвае права было пануючым да XV ст. Паступова яно выцяснялася пісаным правам. Многія нормы звычаёвага права набылі форму закона ў выглядзе шматлікіх грамат, лістоў, прывілеяў, соймавых пастаноў, статутаў, іншых прававых актаў.

Для старажытнага звычаёвага права Беларусі характэрны наступныя рысы: партыкулярызм, традыцыяналізм і дуалізм.

Партыкулярызм права звязаны з наяўнасцю ў кожнай мясцовасці сваіх звычаяў, норм, правіл і адсутнасцю агульнадзяржаўнай прававой сістэмы.

Традыцыяналізм і кансерватызм прававых норм, іх нязменнасць у многім былі абумоўлены ўплывам царквы. Справа ў тым, што ў аснове старажытнай прававой тэорыі ляжала царкоўнае вучэнне аб тым, што ў грамадстве і ва ўсім свеце наогул пануе нязменны, раз і назаўсёды ўстаноўлены Богам парадак. Усякія спробы крытыкаваць ці змяняць сацыяльна-эканамічную, палітычную, ці прававую сістэму лічыліся ерассю, выступленнем супраць царквы і Бога. Гэта значна абмяжоўвала

заканадаўчую дзейнасць князя, бо ён не быў упаўнаважаны ствараць або змяняць нормы права. Нават у XV-XVI ст. урад вымушаны быў абяцаць не парушаць традыцыі і не ўводзіць новых парадкаў. З традыцыяналізмам у звычаёвым праве цесна звязана іерархічнасць грамадства з яго складанай сацыяльнай структурай і прававой рэгламентацыяй саслоўяў і сацыяльных груп.

У сувязі з гэтым асоба мела вельмі мала самастойнасці: усё жыццё кожнага чалавека павінна было ўкладвацца ў рамкі свайго класа, саслоўя, сацыяльнай або рэлігійная групы.

Дуалізм (дваістасць) звычаёвага права заключаўся ў ідэі поўнага бяспраўя рабоў (халопаў, чэлядзі нявольнай) і фармальнай роўнасці свабодных людзей пры фактычным стварэнні ільгот і пераваг пануючаму класу. Халопы, чэлядзь нявольная не прызнаваліся самастойнымі суб'ектамі праваадносін. Адноснае раўнапраўе свабодных гараджан, сялян-даннікаў і іншых праяўлялася ў тым, што яны маглі быць выбранымі ў органы кіравання, неслі роўныя павіннасці, у тым ліку і вайсковую па абароне свайго горада, воласці, княства. З далейшым развіццём феадальных адносін праваздольнасць простых людзей пачала абмяжоўвацца.

Найбольш старажытнымі помнікамі пісанага права на Беларусі былі граматы, якія тычыліся адносін Полацка і Віцебска з Рыгай і нямецкімі купцамі, а таксама шэраг дагавораў беларускіх зямель з нямецкімі гарадамі.

Аналіз юрыдычных помнікаў старажытнай Беларусі дазваляе сцвярджаць аб тым, што з далейшым развіццём і ўмацаваннем феадалізма пашыралася роля прававых норм у рэгуляванні грамадскіх адносін і перш за ўсё норм цывільнага і крымінальнага права.

У першую чаргу гэта адбілася на ўсталяванні рознай праваздольнасці простых людзей і феадалаў. Найбольш абаронены законам былі князі, баяры і вышэйшыя слаі духавенства. Яны, у прыватнасці, маглі распараджацца сваімі маёнткамі, учыняць розныя грамадзянска-прававыя здзелкі, мець залежных ад сябе людзей, а таксама халопаў. Меншай праваздольнасцю валодалі свабодныя людзі, якія знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад буйных землеўладальнікаў, яшчэ меншай — феадальна-залежныя сяляне. Халопы і чэлядзь нявольная былі амаль зусім абмежаваны ў правах. Напрыклад, яны не мелі права валодаць нерухомай уласнасцю, не маглі выступаць у судзе.

Крыніцы дазваляюць сцвярджаць аб тым, што ў залежнасці ад класавай прыналежнасці пацярпеўшага і злачынцы ўстанаўлівалася і розная крымінальная адказнасць. Напрыклад, у адпаведнасці з

дагаворам 1229 г., за забойства свабоднага чалавека з вінаватага спаганялася 10 грыўнаў серабра, за папа або пасла - 20, за халопа - 1 грыўна серабра.

Заканадаўства разглядаемага перыяду перш за ўсё вылучае такія віды пакарання, як маёмасныя спагнанні і выдача злачынцы пацярпеўшаму. За асабліва цяжкія злачынствы закон прадугледжваў расправу і рабаванне як самога вінаватага, так і яго сям'і.

У сямейным праве галоўнае значэнне надавалася шлюбу. Асабістыя адносіны ў сям'і будаваліся на падпарадкаванні жонкі мужу. Апошні прызнаваўся галавой сям'і, але калі муж ішоў у сям'ю жонкі, то ўласнікам гаспадаркі лічылася жонка, або яе бацькі. У адпаведнасці з нормамі старажытнага права жанчыны карысталіся значнымі правамі і павагай. Так, за злачынствы, учыненыя супраць жанчыны, вінаваты нёс пакаранне ў двайным памеры, жорстка караліся антымаральныя ўчынкі.

Прыняцце хрысціянства і яго далейшае распаўсюджванне на тэрыторыі сучаснай Беларусі адбілася на ўсіх баках жыцця грамадства, у тым ліку і на праве, перш за ўсё сямейным. Так, была ўстаноўлена царкоўная форма шлюбу з абавязковым вянчаннем у храме. Толькі дзеці, якія нарадзіліся ад бацькоў, што знаходзіліся ў царкоўным шлюбе, мелі права на атрыманне спадчыны.

У судах дзяржаў-княстваў Беларусі панаваў абвінаваўча-спаборны працэс. Ён ужываўся пры разглядзе грамадзянскіх і крымінальных спраў. Кожны бок спрабаваў даказаць сваю праўду.

Галоўную ролю ў доказах мелі паказанні сведкаў, прысяга (цалаванне крыжа), «суд боскі» (выпрабаванне агнём ці вадой).

Князі, іх пасаднікі, іншыя службовыя асобы выконвалі функцыі пасрэднікаў у судовым працэсе, спаганяючы за гэта пэўную суму (штраф-віру).

Нескладаная сацыяльныя структура старажытных дзяржаў-княстваў і недастаткова выяўлены сацыяльны антаганізм не дазволілі суду заняць важнае месца ў сістэме ўлады старажытнай Беларусі.

5. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага

Пытанне аб утварэнні Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) з'яўляецца адным з самых складаных і спрэчных у сучаснай і гістарычнай навуцы. Аб першапачатковым палітычным і тэрытарыяльным цэнтры Літвы ў навукоўцаў склаліся дзве асноўныя канцэпцыі. Першая, якая адлюстравана ў шматлікіх публікацыях савецкіх гісторыкаў, звязвае ўзнікненне ВКЛ з паскораным развіццём феадальных адносін на тэрыторыі ўсходняй часткі сучаснай Літвы (Аўкштайціі). Вынікам гэтага з'явілася палітычная кансалідацыя пляменаў, што пражывалі на азначанай тэрыторыі, і ўзнікненне моцнага дзяржаўнага ўтварэння на чале з уласнай княжацкай дынастыяй. Такі пункт гледжання азначае, што Вялікае Княства Літоўскае ўтворана знешнімі сіламі без удзелу ўсходніх славян, а таму ВКЛ было чужым для беларусаў і ўкраінцаў.

Больш памяркоўныя даследчыкі адзначаюць, што ўтварэнне ВКЛ не мела ў сваёй аснове ваеннай сілы, а больш важную ролю тут адыгрывалі працэсы натуральнай сацыяльна-эканамічнай і, адпаведна ёй, палітычна-тэрытарыяльнай кансалідацыі беларуска-літоўскіх зямель. Але яны не рашаліся выказаць думку, што ВКЛ — гэта гістарычная форма дзяржаўнасці нашых продкаў, і што нашы продкі не адчувалі сябе чужынцамі ў гэтым «Літоўскім княстве».

Другая канцэпцыя атрымала права на жыццё з выхадам у свет работ беларускага гісторыка М.Ермаловіча.

Выкарыстоўваючы дадзеныя летапісаў, тапанімікі, археалогіі, аўтар прасочвае лёс нашай зямлі са старажытнасці і да ўтварэння і ўмацавання Вялікага Княства Літоўскага.

М. Ермаловіч сцвярджае, што гістарычная Літва не мела нічога агульнага з тэрыторыяй сучаснай Літвы, а таксама з яе ўсходняй часткай — Аўкштайціяй. На яго думку, летапісная Літва знаходзілася ў Верхнім Панямонні, прыблізна паміж Навагрудкам і Мінскам з захаду на ўсход, і паміж Маладзечнам і Слонімам з поўначы на поўдзень. «Яна ўрэзвалася клінам паміж Полацкай, Турава-Пінскай і Новагародскай землямі і побач з імі з'яўлялася гістарычнай вобласцю Беларусі».

У працэсе вывучэння ўмоў утварэння ВКЛ М.Ермаловіч прыйшоў да высновы, што не літоўскія князі захапілі частку новагародскай і іншых беларускіх зямель, а наадварот, «Навагародак паставіў яго (Міндоўга — А.В.) сваім князем для больш паспяховага ажыццяўлення

сваёй дзяржаўнай мэты — заваявання Літвы.

Такім чынам, кіруючыя колы Новагародскага княства выкарысталі палітычныя супярэчнасці ў літоўскай зямлі і пры дапамозе Міндоўга падпарадкавалі яе сабе. А Новагародак і Новагародскае княства ёсць падставы лічыць тым палітычным цэнтрам, вакол якога пачалася кансалідацыя беларускіх, літоўскіх, а потым і ўкраінскіх зямель.

Некаторыя даследчыкі разглядалі ўтварэнне Вялікага Княства Літоўскага як адну з магутных плыняў палітычнага развіцця ўсходніх славян (Масква і ВКЛ). Адсюль і бярэ паходжанне тэрмін «Літоўская Русь».

На наш погляд, Вялікае Княства Літоўскае з'яўляецца вынікам беларуска-літоўскага грамадскага сінтэзу. Галоўнай рухаючай сілай аб'яднання беларускіх і літоўскіх княстваў у адну буйную дзяржаву было развіццё прадукцыйных сіл і эканамічных сувязей паміж княствамі. Паскарэнню гэтага працэса паслужыла неабходнасць аб'яднання ваенных сіл у барацьбе з крыжакамі, а таксама з нашэсцем манголататараў. Здаецца, Полацкае княства, якое мела багатыя традыцыі самастойнага існавання, павінна было стаць аб'ядноўваючым цэнтрам навакольных зямель. Але ж справа ў тым, што Полаччына XIII ст. не была ўжо настолькі багатай і магутнай, як у папярэднія стагоддзі, бо страта выхаду да Балтыкі, зацяжная барацьба з крыжацкай агрэсіяй падтачылі яе сілы. Наадварот, цэнтрам палітычнага жыцця на беларускіх землях у сярэдзіне XIII ст. паступова становіцца і Новагародак, які падчас двух вялікіх супрацьстаянняў — з крыжакамі і татара-манголамі — быў адносна бяспечнай тэрыторыяй.

Менавіта Новагародская зямля разам с суседнімі з ёй літоўскімі землямі стала ядром зараджэння новай дзяржавы, якая атрымала назву Літоўскае княства. Нездарма ж першы князь гэтага дзяржаўнага ўтварэння — Міндоўг зрабіў Новагародак сталіцай сваёй краіны.

Становішча маладой дзяржавы было даволі хісткім у небяспечным суседстве з магутнай Галіцкай зямлёй, Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі. Стабільнасць дасягалася не толькі выгадным геаграфічным становішчам, тонкай дыпламатыяй, але сілай і крывею. Цэлае стагоддзе, нават крыху больш працягвалася пераўтварэнне Літоўскай дзяржавы ў Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. Да сярэдзіны XV ст. гаспадарства афіцыйна называлася Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім, а пазней - Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім, Жамойцкім і іншых зямель. Аднак звычайна ўжывалася скарочаная форма: «Вялікае Княства Літоўскае», ці ўвогуле — «Літва». У Вялікім

Княстве Літоўскім тэрмін «Літва» тады адносіўся да тэрыторыі верхняга і сярэдняга Панямоння, а пад «Руссю» разумелася верхняе Падзвінне і Падняпроўе. Сучасныя заходнія этнічна літоўскія землі (Жмудзь) канчаткова далучыліся да Вялікага княства ў першай палове XV ст.

З сярэдзіны XII да сярэдзіны XIV ст. у склад Літоўскай дзяржавы ўвайшлі практычна ўсе беларускія землі. Шляхі іх уваходжання былі рознымі. Большасць гарадоў і княстваў уваходзіла ў склад новай дзяржавы добраахвотна, прытрымліваючыся перш за ўсё ваенна-палітычнай мэтазгоднасці. Так, на дабравольна-дагаварной аснове ўвайшлі ў склад Літоўскай дзяржавы Полацкая і Віцебская землі. Аб гэтым сведчаць земскія прывілеі вялікіх князёў, якія зацвярджалі статус гэтых зямель у складзе Вялікага княства.

Некаторыя тэрыторыі заваёўваліся і ўключаліся гвалтоўна, іншыя адбіраліся ў суседзяў. Трэба адзначыць, што гвалтоўнае падпарадкаванне сўседніх княстваў, заваёва моцным слабейшага не былі з'явамі выключнымі для таго часу. На працягу XIV ст. да Вялікага княства былі далучаны ўкраінскія і некаторыя рускія княствы. У XIV-XV стст. Вялікае Княства Літоўскае межавала на поўначы з Лівоніяй, Пскоўскай і Наўгародскай землямі, на ўсходзе - з Маскоўскім і Разанскім княствамі, на захадзе — з Польшчай, на паўночным захадзе — з Крыжацкім Ордэнам (выходзіла да Балтыйскага мора), на паўднёвым усходзе — з Залатой Ардой, на поўдні — з Крымскім ханствам (выходзіла да Чорнага мора). Яго тэрыторыя складала 900 тыс.кв.км.

Сталіцай дзяржавы з 1254 па 1323 г. быў Новагародак, пазней — Вільня.

6. Грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага ў XIV — першай палове XVI стагоддзя (да 1569 г.)

У Вялікім Княстве Літоўскім, у склад якога да сярэдзіны XIV ст. ўвайшлі ўсе беларускія землі, панаваў феадальны грамадскі лад. Як і ва ўсякім класавым грамадстве феадальнага перыяду ў Беларусі ў адзначаны час існавалі два галоўныя класы: феадалаў — землеўладальнікаў і феадальна-залежныхх сялян. Акрамя таго, у гарадах і сёлах пражывала значная колькасць людзей, якія лічыліся асабіста свабоднымі. Да гэтай катэгорыі насельніцтва можна аднесці мяшчан, сялян-даннікаў і інш.

Клас феадалаў, які займаў пануючае становішча ў эканамічных і прававых адносінах, не ўяўляў сабой адзінага цэлага і падраздзяляўся на шэраг груп.

У вышэйшую сацыяльную групу ўваходзіла найбольш багатая, прывілеяваная частка феадалаў: князі (нашчадкі знакамітых радоў) і паны. Дакументы адрозніваюць паноў-радных (сябраў вышэйшага органа - Рады) і паноў харугоўных, якія маглі ў час ваенных дзеянняў выставіць вялікую колькасць войска пад сваім сцягам (харугвай). Валодаючы вялікімі зямельнымі плошчамі і значнай колькасцю залежных сялян, гэта група займала важнейшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ. У гістарычнай літаратуры князі і паны вельмі часта сустракаюцца пад тэрмінам «магнаты». Яны мелі шырокія судовыя паўнамоцтвы і ўласныя ўзброеныя сілы. Некаторыя з іх займалі адначасова некалькі важных дзяржаўна-адміністрацыйных пасад, хаця гэта забаранялася заканадаўствам.

Акрамя буйных былі яшчэ сярэднія і дробныя феадалы, якія валодалі невялікімі маёнткамі, меншай колькасцю зямлі і залежных сялян.

Калі першыя мелі значную ролю ў дзяржаўным апараце, то другія з цягам часу маглі разарыцца ў выніку драблення гаспадаркі і перайсці ў больш нізкія сацыяльныя групы. Як сярэднія, так і дробныя феадалы знаходзіліся ў васальнай залежнасці ад князёў і паноў.

У феадальным грамадстве розніца паміж класамі выяўлялася ў саслоўным дзяленні насельніцтва, суправаджалася ўстанаўленнем асобнага юрыдычнага месца ў дзяржаве для кожнага класа. У Беларусі прадстаўнікі класа феадалаў увайшлі ў прывілеяванае саслоўе (стан) шляхты.

Трэба заўважыць, што ў саслоўе шляхты ўваходзілі не толькі феадалы, але і прадстаўнікі іншых сацыяльных груп. Напрыклад, у

саслоўе шляхты на Беларусі былі залічаны многія свабодныя людзі, якія, валодаючы невялікімі зямельнымі надзеламі, вялі сваю гаспадарку ўласнай працай. Некаторыя шляхцічы арандавалі невялікія надзелы зямлі ў буйных феадалаў, або знаходзіліся ў іх на службе ў якасці ляснічых, канюшых і г.д. Гэтых асоб нельга аднесці да класа феадалаў, іх трэба разглядаць як асобную катэгорыю юрыдычна свабодных людзей.

Шляхецкія саслоўныя правы пераходзілі нашчадкам-мужчынам ад патомных шляхцічаў, а таксама дочкам (але не іх дзецям, калі яны выходзілі замуж не за шляхціча). Жанчына простага стану, выходзячы замуж за шляхціча, станавілася шляхцянкай пажыццёва, нават калі выходзіла другі, ці трэці раз замуж не за шляхціча. Шляхецтва можна было атрымаць ад вялікага князя літоўскага, а таксама за мужнасць на полі бою. Шляхецтва давалася дзіцяці, у сувязі з яго ўсынаўленнем, абвешчаным у судзе шляхцічам (адопцыя).

Страта шляхецкай годнасці магла наступіць па суду ў сувязі з учыненым злачынствам, а таксама ў тым выпадку, калі шляхціч пачынаў здабываць сабе сродкі для жыцця гандлем або рамяством.

Трэба адзначыць, што пачатак юрыдычнаму афармленню правоў шляхецкага стану (саслоўя) паклалі агульназемскія прывілеі (граматы) 1387, 1413, 1432, 1447 гг. Першапачаткова правы і прывілеі замацоўваліся толькі за шляхтай каталіцкага веравызнання (прывілеі 1387 і 1413 гг.), а затым прывілеем 1432 г. такія ж правы былі нададзены і праваслаўнай шляхце. Асаблівае значэнне для ўмацавання карпарацыйных палітычных правоў шляхты меў прывілей 1492 г. вялікага князя Аляксандра. Гэты нарматыўна-прававы акт можна назваць першай агульна-дзяржаўнай хартыяй шлахецкіх вольнасцей.

Усе прадстаўнікі шляхты, незалежна ад эканамічнага і палітычнага становішча, мелі агульныя саслоўныя прывілеі: валодаць зямлёй у неабмежаваных памерах на праве ўласнасці; прыцягвацца да адказнасці толькі па суду; займаць пасады ў дзяржаўным апараце і ўдзельнічаць у фарміраванні дзяржаўных і судовых органаў; права асабістай недатыкальнасці і недатыкальнасці маёмасці; былі вызвалены ад падаткаў і павіннасцей, акрамя выплаты падатку на ваенныя патрэбы і ўдзелу ў шляхецкім апалчэнні (паспалітым рушэнні) і інш.

Аналізуючы пытанні прававога становішча сялянства, трэба звярнуць увагу на тое, што да канца XVI ст. яно ў ВКЛ было запрыгонена. Першым заканадаўчым актам Вялікага Княства Літоўскага, які не толькі сведчыў аб наяўнасці прыгонных, але і аформіў прыгоннае права, з'яўляецца Прывілей 1447 г. Працэс запрыгоньвання,

які распачаўся ў XV ст., больш выразна ўвасобіўся ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 гг. і быў завершаны ў апошняй рэдакцыі агульнадзяржаўнага заканадаўства ў 1588 г.

У разглядаемы перыяд сяляне ВКЛ падзяляліся на тры сацыяльныя групы, якія адрозніваліся адна ад другой па эканамічнаму становішчу і ступені феадальнай залежнасці:

1. Гаспадарскіх, якія залежалі непасрэдна ад вялікакняжацкай адміністрацыі і жылі на дзяржаўных землях.

2. Панскіх, якія жылі на прыватнаўласніцкіх землях і залежалі ад асобных феадалаў.

3. Царкоўных, якія жылі на землях царквы, манастыроў і кляштароў, вышэйшага духавенства, і залежалі ад адміністрацыі духоўнага ведамства.

У сваю чаргу, гэтыя групы таксама падзяляліся на шэраг катэгорый.

Амаль да канца XVI ст. звычайнай прыналежнасцю панскіх двароў была нявольная чэлядзь, якая з'яўлялася заканадаўча замацаваным аб'ектам падаравання. Паводле статутаў ВКЛ існавала некалькі прычын ператварэння сялян у нявольную чэлядзь. Лічыліся нявольнымі дзеці, якія нарадзіліся ў законным шлюбе нявольных і вольных. Першапачаткова сяляне гублялі волю ў выніку самапродажу ў няволю, але ў XVI ст. такія здзелкі закон пачаў прызнаваць несапраўднымі. Да сярэдзіны XVI ст. нявольнікамі станавіліся іншы раз і крымінальныя злачынцы, якім пакаранне смерцю са згоды пацярпеўшага замянялася выдачай у няволю, але ўжо ў Статуце 1566 г. апошняе палажэнне адсутнічае.

На працягу ўсяго разглядаемага перыяду асноўнай прычынай няволі з'яўляўся палон. У выніку заканадаўчай адмены ўсіх прычын няволі (акрамя палону), а таксама надзялення нявольнай чэлядзі невялікімі зямельнымі ўчасткамі ў XVI ст. большасць яе ператварылася ў прыгонных сялян-агароднікаў.

Такім чынам, збліжэнне сацыяльна-эканамічных статусаў нявольнай чэлядзі і прыгоннага сялянства і запрыгоньванне сялянства паспрыялі таму, што ў асноўным сфарміраваўся адносна адзіны клас — эксплуатуемае і прыгоннае сялянства. Разам з запрыгоньваннем сялянства ішло і заканадаўчае афармленне гэтага працэсу, назіралася ўмацаванне прыгоннага права, г.зн. фарміраваліся сістэмы юрыдычных норм, якія павінны былі абараняць права ўласнасці феадала на прыгонных сялян.

Што тычыцца юрыдычнага статуса прыгонных сялян, то яны не мелі права ўласнасці на зямлю, ім забаранялася набываць маёнткі, без

згоды феадала яны не маглі мяняць месца жыхарства і род заняткаў; яны таксама не маглі займаць пасады ў дзяржаўным апараце (акрамя некаторых пасад у сельскай адміністрацыі) і былі ў падсуднасці свайго гаспадара. Гонар, жыццё і маёмасць сялян абараняліся крымінальным правам у меншай ступені, чым прадстаўнікоў прывілеяваных саслоўяў.

Насельніцтва беларускіх гарадоў у сваёй асноўнай масе складалася з простых людзей. Да сярэдзіны XVI ст. яны выдзяліліся ў саслоўе мяшчан.

Прававы статус гараджан вызначаўся ўзроўнем сацыяльна-эканамічнага развіцця іх горада. Па маёмаснаму становішчу насельніцтва гарадоў умоўна можна падзяліць на тры групы: вярхушку (патрыцыят), куды ўваходзілі заможныя купцы і ўладальнікі буйных рамесных майстэрань; сярэднія пласты (слаі) - дробныя гандляры і простыя рамеснікі; гарадскія нізы - вучні майстроў, хатняя прыслуга і інш. Зразумела, што ў залежнасці ад эканамічнага стану мяшчан знаходзілася і іх прававое становішча, якое вызначалася: прыналежнасцю горада (прыватнаўласніцкі, ці вялікакняжацкі); наяўнасцю ў горадзе Магдэбургскага права; займаемай пасадай у органах гарадскога самакіравання і г.д. Напрыклад, найбольш заможныя багацеі прывілеяваных вялікакняжацкіх гарадоў (Вільня, Берасце, Полацк, Менск) мелі права валодаць маёнткамі па-за межамі горада і павінны былі выконваць вайсковыя абавязкі асабіста, або выстаўляць за сябе пэўную колькасць узброеных людзей нароўні з іншымі феадаламі.

Мяшчане гарадоў з Магдэбургскім правам вызваляліся ад прыгонных работ, падводнай павіннасці, уплаты праяздных пошлін (мыта) на ўсёй тэрыторыі ВКЛ і некаторых іншых павіннасцей. Крымінальнае права ўстанаўлівала павышаную адказнасць за іх забойства. Увогуле, можна адзначыць, што жыхары гарадоў, якія мелі Магдэбургскае права, атрымлівалі шэраг правоў і прывілеяў. Перш за ўсе гэта тычыцца права ўдзельнічаць у фарміраванні органаў гарадскога самакіравання і суда, правоў на стварэнне рэлігійных брацтваў і на аб'яднанне ў цэхі па прафесіях. Адначасова трэба звярнуць увагу на тое, што кіраванне агульнымі справамі ў гарадах, якія карысталіся Магдэбургскім правам, знаходзілася, як правіла, у руках заможных гараджан.

Меншым комплексам правоў валодалі жыхары гарадоў і мястэчкаў Беларусі, якія не мелі льготных грамат. Больш таго, яны падлягалі падсуднасці ваявод і старастаў, а не гарадскога магістрата, як гэта было ў прывілеяваных гарадах.

Мяшчане прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак знаходзіліся пад уладай феадала, які вызначаў памер грашовых збораў і натуральных павіннасцей. Выконвалі натуральныя павіннасці (баршчына, рамонт насыпаў, а чыстка прудоў, лоўля рыбы і інш.) і тыя мяшчане, якія мелі ворыўныя ўчасткі зямлі, астатнія плацілі грашовыя падаткі.

Некаторым прыватнаўласніцкім гарадам таксама было дадзена Магдэбургскае права, але з абмежаваннямі на карысць уладальнікаў.

Горад служыў феадалу не толькі ў якасці крыніцы грашовых даходаў, але і як адміністрацыйна-палітычны цэнтр, абарончы апорны пункт.

7. Палітычны лад ВКЛ

Пытанне дзяржаўнага ладу ВКЛ, у склад якога ўваходзіла Беларусь, — адно з найбольш складаных, асабліва ў раскрыцці праблемы дзяржаўнага ўладкавання.

У XIV-XVI стст. Вялікае Княства Літоўскае па форме праўлення было феадальнай манархіяй. На чале дзяржавы стаяў манарх, які называўся гаспадаром, або вялікім князем. Ён ажыццяўляў заканадаўчую, судовую і адміністрацыйна-гаспадарчую ўладу. У прыватнасці, вялікі князь кіраваў пытаннямі знейшняй палітыкі, камандаваў узброенымі сіламі, выдаваў граматы і іншыя прававыя акты, ажыццяўляў вышэйшы суд у дзяржаве, валодаў правам заканадаўчай ініцыятывы і г.д. Але ж найбольш важныя пытанні ён павінен быў вырашаць разам з Радаю Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, улада гаспадара не была абсалютнай, яна была абмежавана Радай, у склад якой уваходзілі вярхі класа феадалаў. Акрамя таго, улада манарха абмяжоўвалася соймам, дзе былі прадстаўнікі і павятовай шляхты.

Прававое становішча Рады замацавана ў прывілеях 1492 і 1506 гг. Напрыклад, у 1492 г. законам было ўстаноўлена, што ў выпадку разыходжання ў Радзе думак вялікага князя і радных паноў гаспадар быў абавязаны выконваць тое, што параяць яму паны-рада. Абмежаванне ўлады вялікага князя ў далейшым было заканадаўча замацавана і ў Статуце 1529 г.

Рада з'яўлялася пастаянна дзейнічаючым дзяржаўным органам. Яна не мела строга акрэсленай кампетэнцыі і магла вырашаць любое пытанне ўнутранага і знешняга жыцця дзяржавы. У прыватнасці, у

кампетэнцыю Рады ўваходзіла: выбранне вялікага князя, абарона дзяржавы, вырашэнне міжнародных спраў, абмеркаванне і прыняцце заканадаўчых актаў, заслухоўванне справаздач некаторых службовых асоб, разгляд найважнейшых судовых спраў і інш.

Такім чынам, Рада была выканаўча-распарадчым, заканадаўчым і кантралюючым органам. Яе галоўнае прызначэнне заключалася ў тым, каб ахоўваць правы магнатаў ад замахаў з боку манарха — вялікага князя, а таксама ахоўваць тэрытарыяльную недатыкальнасць дзяржавы.

Сойм вышэйшы агульнадзяржаўны заканадаўчы орган бярэ пачатак ад старажытных вечавых сходаў, якія пры феадалізме пераўтварыліся ў саслоўна-класавыя органы феадалаў. Пачатак рэгулярнага склікання соймаў адносіцца да XV ст.

Парадак работы сойма, яго кампетэнцыя да XIV ст. рэгуляваліся звычаёвым правам. Спачатку ў сойм уваходзілі ўсе буйныя феадалы, якія з'яўляліся сябрамі Рады, службовыя асобы цэнтральнай і мясцовай адміністрацыі, а таксама ўся шляхта. Але рашэнні, як правіла, выносіліся вялікім князем і панамі-радай, а дробныя і сярэднія феадалы пры гэтым толькі прысутнічалі, інакш кажучы, валодалі дарадчым, а не рашаючым голасам. Таму соймы гэтага перыяду былі больш дарадчымі, чым заканадаўчымі.

У XVI ст. заканадаўчыя функцыі сойму пашырыліся. У гэты час ён з усесаслоўнага перарос у прадстаўнічы орган на пасяджэнні якога з'яўлялася не ўся шляхта, а толькі яе прадстаўнікі — па два дэпутаты (паслы) ад кожнага павета, якія выбіраліся на павятовых соймiках. Акрамя гаспадара, паноў-рады, службовых асоб цэнтральнага і мясцовага кіравання ў рабоце вальных соймаў прымалі ўдзел каталіцкія і праваслаўныя епіскапы, ігумены манастыроў і кляштароў.

У сістэме органаў дзяржаўнага кіравання значная роля належала вышэйшым службовым асобам, паўнамоцтвы якіх рэгуляваліся пераважна звычаёвым правам.

Важнае месца займаў маршалак земскі, які з'яўляўся ахоўнікам парадку і этыкету пры вялікакняжацкім двары. Яго намеснікам быў маршалак дворны.

Узброенымі сіламі дзяржавы кіраваў гетман найвышшы, які меў, асабліва ў час вайны, вялікія паўнамоцтвы. Яго намеснікам быў маршалак дворны.

Дзяржаўную канцылярыю ўзначальваў канцлер, пры ім былі пісары, сакратары і іх памочнікі (дзякі). Канцлер зберагаў дзяржаўную пячатку, без прыкладання якой законы не набывалі сілы, падпісваў найважнейшыя дзяржаўныя дакументы, разам са сваім намеснікам —

падканцлерам — удзельнічаў у падрыхтоўцы і канчатковым рэдагаванні заканадаўчых актаў.

Падскарбій земскі загадваў дзяржаўнымі фінансамі, скарбам. Яго намеснікам быў падскарбій дворны, а памочнікамі — скарбнікі і скарбавыя пісары.

Спецыфічнае становішча сярод службовых асоб займалі вялікакняжацкія дваране і ўраднікі. Яны непасрэдна неслі службу ў вялікага князя і вышэйшых прадстаўнікоў улады, выконвалі судовыя рашэнні, уводзілі ва ўладанне маенткамі, рабілі рэвізіі (люстрацыі), спаганялі нядоімкі па падатках, сачылі за будаўніцтвам дарог, мастоў і інш.

Мясцовыя органы ўлады і кіравання на дзяржаўных землях будаваліся ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам. Да ўтварэння ваяводстваў і паветаў, асобныя землі кіраваліся намеснікамі вялікага князя. Пры намесніках былі такія службовыя асобы, як ключнік, гараднічы, цівун, канюшы, ляснічы, пасады якіх у асноўным засталіся і пасля адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1565-1566 гг., што падзяліла Вялікае Княсгва Літоўскае на ваяводствы (акрамя існаваўшых раней уводзіліся і новыя), паветы і воласці.

Саслоўна-прадстаўнічымі органамі мясцовай улады выступалі павятовыя і ваяводскія соймікі. У іх удзельнічалі ўсе землеўласнікі павета ці ваяводства.

Мясцовыя органы ўлады мелі шырокія паўнамоцтвы і мала залежалі ад цэнтральных органаў. У сваёй дзейнасці яны кіраваліся агульнадзяржаўнымі нарматыўнымі актамі і мясцовым звычаёвым правам, а таксама актамі мясцовай адміністрацыі.

На тэрыторыі ваяводства прадстаўніком вышэйшай улады быў ваявода. Ён узначальваў адміністрацыйныя, гаспадарчыя, ваенныя і, у значнай ступені, судовыя органы. Ваявода прызначаўся вялікім князем і Радай пажыццёва з ліку буйных феадалаў — ураджэнцаў ВКЛ. Бліжэйшым памочнікам ваяводы быў каштэлян, які ўзначальваў войска галоўнага замка і апалчэнне.

Ключнік адказваў за спагнанне падаткаў і чыншу, гараднічы быў камендантам замка, лоўчы і ляснічы наглядалі за ляснымі і паляўнічымі ўгоддзямі.

Кіраўніком адміністрацыі ў павеце быў староста, які таксама прызначаўся вялікім князем і Радай з ліку буйных феадалаў. Намеснікам яго быў падстароста. Паўнамоцтвы старасты былі блізкія да паўнамоцтваў ваяводы, у тым ліку і ў галіне правасуддзя. Памочнікам старасты па ваенных справах быў павятовы маршалак, які камандаваў

павятовым апалчэннем шляхты. Ён жа, як правіла, старшынстваваў на пасяджэннях павятовага соймика.

Ніжэйшым звяном у сістэме мясцовага кіравання (на ўзроўні воласці) былі дзяржаўцы — кіраўнікі дзяржаўных і вялікакняжацкіх маёнткаў.

Органы мясцовага кіравання і самакіравання ў гарадах Беларусі, якія рэгулявалі жыццядзеннасць карпарацый мяшчан, значна адрозніваліся ад другіх мясцовых органаў улады і кіравання на месцах. Па арганізацыі кіравання і па характару залежнасці ад вышэйшых органаў улады беларускія гарады падзяляліся на тыя, якія мелі спецыяльныя граматы (прывілеі) на Магдэбургскае права, і тыя, якія не мелі такіх грамат. Гарады, якія атрымалі прывілеі, выключаліся з адміністрацыі ваявод і староств, у іх утвараліся органы гарадскога кіравання (магістрат) у спалучэнні з некаторымі элементамі самакіравання.

У магістрат (Раду) уваходзілі войт, бурмістры, радцы і лаўнікі. Войт стаяў на чале гарадской адміністрацыі суда, прызначаўся на гэтую пасаду ўрадам з ліку феадалаў або граждан. Правасуддзе войт ажыццяўляў сумесна з сябрамі гарадской Рады і лаўнікамі (засядацелямі). Войт мог прызначыць сабе намесніка — лент-войта. Памочнікам войта па кіраванню справамі ў горадзе былі бурмістры, якія прызначаліся або зацвярджаліся войтам з ліку сяброў гарадской Рады.

У большасці беларускіх гарадоў Рада складалася прыкладна з 6-20 чалавек. Як правіла, у яе ўваходзілі найбольш багатыя купцы, кіраўнікі рамесных цэхаў, багатыя майстры-рамеснікі. У адных гарадах Рада выбіралася мяшчанамі, у другіх — войт кампанаваў Раду. Рада вызначала асноўны напрамак развіцця гарадской гаспадаркі і кіравала пытаннямі добраўпарадкавання і утрымання ў баявой гатоўнасці абарончых збудаванняў, займалася зборам сродкаў на гарадскія патрэбы, ажыццяўляла кантроль за іх расходаваннем і г.д.

Прыватнаўласніцкія гарады былі ўласнасцю асобных князёў і паноў. Таму кіраванне ў іх залежала ад волі ўладальніка, які мог дазволіць утварэнне мясцовых органаў у адпаведнасці з Магдэбургскім правам або прызначыць у горад свайго намесніка-кіраўніка.

8. Люблінскі сойм і ўмовы аб'яднання ВКЛ з Польшчай

10 студзеня 1569 г. пачаў работу Люблінскі сойм, які працягваўся амаль шэсць драматычных месяцаў. Кожны бок ставіў свае ўмовы уніі.

Канчатковы ліцвінскі праект аб'яднання дзвюх дзяржаў быў такім: «Агульны ўладар, які захоўваў тытул вялікага князя літоўскага; агульныя соймы вырашаюць толькі справы абедзвюх дзяржаў; на Літве працягваюць дзейнічаць свае вальныя соймы і... павятовыя соймікі: пры ўладары знаходзіцца і ліцвінская рада, а ў Княстве застаецца вялікакняжацкая рада».

Умовы польскага боку былі наступнымі: «Польскае каралеўства і Вялікае Княства Літоўскае злучаюцца ў адну дзяржаву з адным уладаром, польскім каралём, якога абіраюць палякі і ліцвіны ў Польшчы, адным соймам, адной агульнай пячаткай, адным сенатам, адным войскам, адной манетай — словам, ад Вялікага княства не павінна застацца і назвы».

Зразумела, што ліцвіны не прынялі польскі праект уніі. Неаднойчы прадстаўнікі Вялікага Княства Літоўскага паўтаралі, што яны будуць абараняць сваю дзяржаву, якая не саступае каралеўству польскаму і другім хрысціянскім краінам. Больш таго, калі паслы Вялікага княства ўбачылі пагрозу гвалтоўнага заключэння уніі на непрымальных для іх умовах, яны 1 сакавіка 1569 г. пакінулі Люблін.

І тут польскі бок — юрыдычны саюзнік, звязаны з Вялікім Княствам персанальнай уніяй, - пайшоў на дэманстрацыю сілы. Скарыстаўшы цяжкае знешнепалітычнае становішча ВКЛ, польскія феадалы дамагліся ад Жыгімонта Аўгуста здрады інтарэсам Вялікага Княства. Апошняя заключалася ў тым, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі 5 сакавіка 1569 г. выдаў незаконны акт аб адлучэнні ад Вялікага Княства Літоўскага Падляшскай зямлі (ваяводства) з гарадамі Драгічынам, Мельнікам, Бельскам і інш. і далучэнні яе да Польшчы. Феадалам і службовым асобам Падляшша было загадана пад страхам канфіскацыі маёмасці прысягнуць на вернасць Польшчы. Калі гэты захопніцкі акт не атрымаў належнага адпору, Жыгімонт Аўгуст далучыў да Польшчы і ўкраінскія землі — Валынь, Падолле і Кіеўшчыну. З юрыдычнага боку акты аб далучэнні беларускіх і ўкраінскіх зямель да Польшчы былі незаконныя і належала лічыць, што яны не маюць сілы. Паводле заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага вялікі князь, уступаючы на прастол, даваў прысягу і абяцаў дзейнічаць згодна з дзяржаўнымі законамі. Адпаведна з параграфамі 12 і 15 прывілея 1492 г. і артыкуламі 1,2, 12 раздела II Статута ВКЛ 1566 г. вялікі князь не меў права

памяншаць тэрыторыю дзяржавы і выдаваць якія-небудзь заканадаўчыя акты без згоды Рады і сойма. У артыкуле 4 таго ж раздзела проста ўстанаўлівалася забарона выдаваць прывілеі, якія парушаюць нормы Статута.

Таму акты аб аддзяленні ўкраінскіх і заходняй часткі беларускіх зямель, выдадзеныя ў Любліне, належала прызнаць несапраўднымі. Апошняя выснова пацвярджаецца і граматай Жыгімонта Аўгуста ад 21 снежня 1568 г., дзе ён кляўся захоўваць старыя законы і звычаі і не парушаць тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы. Дакументы аб аддзяленні зямель не былі замацаваныя пячаткай Вялікага Княства, што таксама рабіла іх несапраўднымі. Але мы павінны адзначыць: нягледзячы на незаконныя акты Польшчы па далучэнню часткі зямель ВКЛ да Кароны, сітуацыя складалася такая, што вялікакняжацкі ўрад не мог ісці на ваенны канфлікт з Польшчай перш за ўсе таму, што на значнай частцы княства гаспадарыла маскоўскае войска і самастойна весці вайну ў яго не было сілы. У такім становішчы прадстаўнікі ВКЛ вымушаны былі вярнуцца за стол перамоў з Польшчай. Супольны сойм зноў распачаў работу.

1 ліпеня 1569 г. быў падпісаны акт Люблінскай уніі.

Акт Люблінскай уніі быў аформлены ў выглядзе прывілея-дагавора. Галоўная ідэя прывілея зафіксавана ў яго трэцім параграфе: «З гэтага часу абедзве дзяржавы ўяўляюць сабой адно непадзельнае цела, а таксама адну агульную Рэч Паспалітую, у якой абодва гаспадары і абодва народы ўз'ядналіся ў адзіны народ і адзіную дзяржаву».

Вышэйшым органам улады станавіўся агульны сойм, які мог збірацца на тэрыторыі Польшчы. Асобных соймаў як для Кароны, так і для Вялікага Княства не прадугледжвалася. Манарх бачыўся агульным: «над абодвума народамі будзе панаваць адзін кароль, абіраемы супольнымі галасамі Польшчы і Літвы».

Аднак трэба заўважыць, што тытул вялікага князя захоўваўся. Так, у зацверджаным акце гаворыцца: «...новы гаспадар пры выбранні і каранацыі павінен аб'яўляцца каралем Польскім, вялікім князем Літоўскім, Рускім, Прускім, Жмудзкім, Кіеўскім, Валынскім, Падляшскім, Інфляндскім... Выбранне і ўзвядзенне князя на прастол Вялікага Княства Літоўскага, якое да гэтага часу праводзілася асобна, павінна спыніцца».

Выключна да кампетэнцыі Рэчы Паспалітай адыходзіла знешняя палітыка. Усе ранейшыя законы і дагаворы, што былі накіраваны супраць інтарэсаў аднаго з бакоў, павінны былі быць скасаваны. Акт

засяроджваў увагу на прынцыповым для польскага боку пытанні. «Статуты і ўсе якія быто ні былі пастановы, ухваленыя ў Літве супраць польскага народа па пытаннях аб набыцці і валоданні палякамі маёнткаў у Літве, надалей не павінны дзейнічаць. Дазваляецца набываць маёнткі і валодаць імі паляку ў Літве, а літоўцу ў Польшчы».

Такім чынам, Люблінскі акт павінен быў выклікаць і некаторыя змены ў заканадаўстве Вялікага Княства. Разам з тым Вялікаму Княству Люблінскім актам не адводзілася роля польскай каланіяльнай украіны. Тут захоўваліся былы адміністрацыйны апарат, асобнае ад Польшчы заканадаўства і судовая арганізацыя, тытул «Вялікае Княства Літоўскае» і дзяржаўная пячатка, а таксама войска.

9. Заканадаўчае замацаванне самастойнасці Вялікага Княства Літоўскага пасля Люблінскай уніі

Погляды гісторыкаў права на змест Люблінскага акта доўгі час зводзіліся да аднаго: гэта юрыдычнае і фактычнае аб'яднанне двух народаў у адзін і дзвюх дзяржаў у адну Рэч Паспалітую.

Архіўныя дакументы і матэрыялы пацвярджаюць думку аб тым, што нельга трактаваць Люблінскі акт, як паглынанне Польшчай Вялікага Княства Літоўскага. Хаця трэба прызнаць, што на першым часе ўражанне пануючага класа ВКЛ ад вынікаў уніі, падзей, што ёй папярэднічалі, было такім. Гэта тычылася як магнатаў, так і шляхты, якая ў свой час дамагалася злучэння з Польшчай. Уплывовай жа знаці Люблінская унія пагражала поўнай згубай былога палітычнага ўплыву. Справа ў тым, што ў ВКЛ сойм, дзе магнацтва праводзіла свае рашэнні, юрыдычна пераставаў існаваць. У агульны сенат Рэчы Паспалітай многа былых сяброў паноў-рады проста не трапіла. Тыя ж нешматлікія галасы сенатараў з Вялікага княства заглушаліся больш мнагалюдным польскім прадстаўніцтвам у сенаце Рэчы Паспалітай. Тое ж самае адбывалася і ў Пасольскай ізбе, дзе з 180 выбраных па ўсёй Рэчы Паспалітай паслоў толькі 46 прыходзілася на Вялікае Княства Літоўскае (у тым ліку 34 паслы з беларускіх паветаў).

На прыкладзе прыведзеных лічбаў можна меркаваць аб палітычнай дыскрымінацыі ВКЛ. Гэта, па-першае. Па-другое, юрыдычнае замацаванне ў Люблінскім акце за польскай шляхтай магчымасці атрымання ў межах Вялікага Княства Літоўскага зямельных плошчаў стварыла небяспечнага канкурэнта для шляхты мясцовай. Безумоўна,

што гэтыя фактары вялі да з'яўлення ў большай часткі пануючага класа Вялікага Княства Літоўскага сепаратысцкіх, антыпольскіх настрояў. Яны праўляліся ў рэзкім непрыняцці шляхтай, як буйнай, так і дробнай, уніі, ды і наогул палітыкі польскіх каралёў.

Незалежніцкія настроі не разыходзіліся са справамі, перш за ўсё яны выявіліся ў палітычнай сферы, а таксама і ў духоўнай.

Насуперак Люблінскаму акту на працягу 70-80-х гг. у Вялікім княстве рэгулярна збіраліся агульнадзяржаўныя соймы («Віленская канвакацыя»). Пасля смерці ў 1572 г. караля і вялікага князя Жыгімонта Аўгуста не толькі фактычна, але і юрыдычна было прызнана захаванне адасобленасці ВКЛ.

Прычым у час безкаралеўя (1574-1576 гг.) на Віленскім сойме дэбатавалася пытанне аб выбранні караля, а на сойме 1580 г. прысутнічаў нават кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторый. Больш таго, у 1581 г. ствараецца, а ў 1582 г. пачынае дзейнічаць Галоўны трыбунал Вялікага Княства.

Але найлепшым сведчаннем дзяржаўнай незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага было прыняцце звода законаў, які атрымаў назву Трэцяга Літоўскага Статута (Статуга ВКЛ 1588 г.).

Статут, па сутнасці, скасаваў многія пастановы Люблінскай уніі. Паказальна, што ў гэтым юрыдычным помніку ніводнага разу не ўпамінаецца пра акт уніі. Паводле гэтага звода законаў, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі да 1840 г., Вялікае Княства Літоўскае заставалася самастойнай дзяржавай не толькі з асобым заканадаўствам, але і са сваім дзяржаўным апаратам, войскам, фінансамі, тэрыторыяй. Статут прадугледжваў таксама адмену звышпрынцыповага для палякаў пункта пастановы Люблінскага сойма 1569 г. аб праве набыцця зямельнай уласнасці ў межах ВКЛ. Пасля ўвядзення Статута 1588 г. у дзеянне шляхта Польскага каралеўства не мела юрыдычнага права не толькі набываць землі, але і займаць дзяржаўныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Аўтары Статута 1588 г. не ўнеслі ў тэкст ніводнага артыкула, які б абмяжоўваў суверэнітэт Княства. Наадварот, Статут абавязваў гасудара захоўваць недатыкальнасць тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, вяртаць раней страчаныя землі.

Звод законаў зафіксаваў адно з карэнных патрабаванняў беларускай шляхты — дзяржаўнасць «рускай» (старабеларускай) мовы на ўсёй тэрыторыі гаспадарства. Гэта радыкальна розніла Княства ад Польшчы, дзе моваю юрыдычных дакументаў была лацінская.

Як сімвал дзяржавы ВКЛ мела свой дзяржаўны герб і пячатку (Раздзел IV, арт. 12).

Статут убачыў свет у выніку доўгай і цяжкай барацьбы за незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. Ужо сам ход барацьбы паказвае ВКЛ як самастойную дзяржаву, якая вядзе сябе з Польшчай, як роўная з роўнай. Зразумела, што калі Статут 1588 г. з'явіўся ў выніку барацьбы за незалежнасць, то ен павінен быў адлюстраваць і замацаваць на сваіх старонках палітычныя жаданні беларуска-літоўскіх кіруючых колаў і ўсталяваць новыя адносіны да Кароны, бо ўмовы існавання Княства ў складзе Рэчы Паспалітай на аснове пастаноў Люблінскага сойма не задавальнялі магнатаў і шляхту ВКЛ.

Статут 1588 г. па сваёй значнасці з'яўляецца Канстытуцыяй Вялікага Княства Літоўскага пасля Люблінскай уніі.

Трэба асабліва падкрэсліць той факт, што такія галоўныя прынцыпы Статута, як прэзумпцыя невінаватасці, дзяржаўны ды нацыянальна-культурны суверэнітэт, рэлігійная талерантнасць і іншыя, былі надзвычай прагрэсіўнымі для таго часу. Яны да сённяшняга дня выступаюць у ліку прынцыпова важных палажэнняў заканадаўчых актаў многіх дэмакратычных краін свету.

Такім чынам, канкрэтна-гістарычны матэрыял сведчыць аб тым, што дзяржаўна-прававыя сувязі паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай пасля 1569 г. будаваліся не на аснове акта Люблінскай уніі, а на ўмовах, якія прадугледжвалі адасобленасць абедзвюх дзяржаў пры адным гасудары і адным парламенце (сойме). Разам з тым гэтае аб'яднанне спарадзіла і новую дзяржаву — Рэч Паспалітую, у кампетэнцыю якой уваходзілі ў асноўным пытанні сумеснай міжнароднай палітыкі і ўзаемнай абароны.

10. Крыніцы права феадальнай Беларусі

Вывучэнне прававой культуры Беларусі паказвае, што яе развіццё вызначалася паступовым пераходам ад звычаёвага да пісанага права. Прыкладна ў XV ст. пісанае права становіцца асноўнай крыніцай права на тэрыторыі Беларусі. У ім многія нормы звычаёвага права набылі форму закона ў выглядзе шматлікіх грамат, лістоў, соймавых пастаноў, прывілеяў, статутаў і іншых прававых актаў.

Мэтазгодна пачынаць разгляд крыніц беларускага феадальнага права з характарыстыкі агульназемскіх, абласных, гарадскіх і валасных грамат (прывілеяў), якія ў дзяржаўна-прававым жыцці Вялікага Княства Літоўскага мелі асабліва важнае значэнне.

Агульназемскія прывілеі звычайна выдаваліся пры ўступленні новага князя на прастол, або пасля якіх небудзь важных падзей у жыцці дзяржавы. Гэтыя прывілеі дзейнічалі на ўсёй тэрыторыі ВКЛ (зразумела, і на ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі) і былі абавязковы для выканання ўсімі жыхарамі дзяржавы, у тым ліку і службовымі асобамі. У названых прывілеях змяшчаліся нормы крымінальнага, цывільнага, дзяржаўнага права, у якіх закраналіся толькі асноўныя палажэнні і прынцыпы гэтых галін права. Напрыклад, агульныя прынцыпы крымінальнай адказнасці, асноўныя палажэнні права ўласнасці, спадчыннага, абавязацельнага права і гэтак далей,

Першымі агульнадзяржаўнымі (земскімі) прывілеямі лічыліся тры прывілеі, выдадзеныя ў 1387 г. вялікім князем Ягайлам пасля заключэння з Польшчай Крэўскай уніі (1385 г.).

Выданнем прывілея ад 7 снежня 1506 г. практычна завяршыўся першы этап развіцця беларускага дзяржаўнага права ў форме прывілеяў, бо наступныя, выдадзеныя ў 1529, 1547 і 1551 гг., у асноўным пацвярджалі законнасць ранейшых прывілеяў і паўтаралі іх.

Пасля выдання Статута 1529 г. галоўнае значэнне ў развіцці права належыць не прывілеям, хаця і яны працягвалі выдавацца, а статутам і соймавым пастановам.

У разглядаемы перыяд агульназемскія прывілеі ў сваёй сукупнасці ўяўлялі сабой асноўныя законы дзяржавы, г.зн. складалі своеасаблівую канстытуцыю, у якой былі замацаваны асноўныя палажэнні дзяржаўнага і іншых галін права.

Абласныя граматы (прывілеі) даваліся землям Беларусі, якія ўвайшлі ў склад Вялікага Княства Літоўскага і захоўвалі свае аўтаномныя правы. Таму выдача абласных прывілеяў, напрыклад, Полацкай і Віцебскай землям, ставіла мэту юрыдычна замацаваць аўтаномныя правы тых ці іншых тэрыторый, абмежаваць уладу вялікага князя і яго адміністрацыі. Аўтаномны характар земляў, якія атрымалі прывілеі, праяўляўся ў заканадаўчым замацаванні норм мясцовага звычаёвага права, права на мясцовы суд і органы кіравання, права на забеспячэнне аховы маёмасных і асабістых правоў насельніцтва і г.д.

Першапачатковыя тэксты земскіх прывілеяў да нас не дайшлі, але пры ўступленні на прастол новага князя, ці пры парушэнні ўстаноўленых граматамі норм выдаваліся пацвярджаючыя прывілеі тым землям, якія мелі іх раней. Гэтыя прывілеі ўтрымлівалі нормы раней выдадзеных прывілеяў.

Такім чынам, выдача абласных прывілеяў і іх пацвярджэнне мелі дзяржаўна-прававы характар, бо сама наяўнасць гэтых прывілеяў

сведчыла аб асаблівым становішчы дадзенай зямлі ў Вялікім Княстве Літоўскім, яе адасобленасці і непадзельнай цэласнасці.

Валасныя прывілеі выдаваліся, як правіла, па хадайніцтву жыхароў той ці іншай воласці з мэтай абароны іх інтарэсаў ад самавольства адміністрацыі. Але ж мы павінны адзначыць, што выдаючы валасныя граматы і тым самым абмяжоўваючы ўладу службовых асоб, вялікі князь у першую чаргу бараніў інтарэсы не насельніцтва, а дзяржаўнага скарбу, бо са збяднелых сялян немагчыма было б збіраць падаткі. Таму змест валасных прывілеяў у асноўным забяспечваў юрыдычнае замацаванне павіннасцяў і некаторыя правы жыхароў воласці, у тым ліку права выбару старца — прадстаўніка сялянскай мясцовай адміністрацыі.

Валасныя прывілеі цікавыя і тым, што ў іх змяшчаюцца шматлікія водгукі яшчэ больш старажытных прававых звычаяў.

Аналіз абласных і валасных грамат дазваляе зрабіць вывад аб тым, што асноўнай крыніцай права гэтых дакументаў было мясцовае звычаёвае права. Да спецыяльных актаў, якія выдаваліся толькі для гараджан, трэба аднесці прывілеі на Магдэбургскае права; прывілеі, што выдаваліся ў сувязі з цяжкім становішчам жыхароў горада, якое магло быць выклікана стыхійнымі бедствамі (пажарам, паводкай, ваеннымі дзеяннямі), а таксама самавольствам адміністрацыі; прывілеі, што выдаваліся з мэтай развіцця горада і прыцягнення ў яго новых жыхароў.

Больш падрабязна разгледзім граматы на Магдэбургскае права. На працягу XV і XVI стст. граматы на Магдэбургскае права былі выдадзены ўсім буйным гарадам Беларусі, а таксама многім мястэчкам. Грамата давалася гарадам вярхоўнай ўладай ВКЛ, або (прыватна-ўласніцкім гарадам) уладальнікам горада. У абодвух выпадках гэты прывілей выконваў ролю юрыдычнага акта на самакіраванне гарадоў, спрыяў саслоўнай кансалідацыі гараджан, вызваляў іх ад феадальнай залежнасці.

Першаступеннае значэнне ў граматах надавалася нормам, што ўстанаўлівалі парадак утварэння і кампетэнцыю гарадскіх органаў кіравання. У прыватнасці, ва ўсіх граматах змяшчаліся ўказанні аб вызваленні гараджан ад улады і суда ваявод, стараст і іншых службовых асоб агульнага кіравання і аб перадачы ўладных паўнамоцтваў у рукі гарадскога войта, бурмістраў, радцаў (саветнікаў) і лаўнікаў (засядацеляў). Войт прызначаўся на пасаду вялікім князем ці феадалам або выбіраўся насельніцтвам з заможных шляхцічаў ці мяшчан. Рада, якая складалася з радцаў і лаўнікаў, выбіралася з ліку купцоў, багатых

майстроў, цэхмістраў. Узначальваў Раду выбарны бурмістр (ці бурмістры). Паўнамоцтвы войта і бурмістраў у розных гарадах не былі аднолькавыя.

11. Судзебнік Казіміра 1468 г.

Пашырэнне і колькаснае павелічэнне заканадаўчых актаў па розных пытаннях сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця краіны выклікала патрэбу ў сістэматызацыі і кадыфікацыі бягучага прававога матэрыялу.

Першай спробай сістэматызацыі норм права ў агульнадзяржаўным маштабе з'явіўся Судзебнік Казіміра 1468 г. Ён быў невялікім па аб'ёму і аб'ядноўваў нормы крымінальнага, адміністрацыйнага і працэсуальнага права. Рукапісны тэкст Судзебніка не быў падзелены на артыкулы. Толькі пры публікацыі яго падзялілі на 25 артыкулаў. Гэта дзяленне захавана і ў сучаснай гісторыка-прававой літаратуры. Ён, як большасць заканадаўчых актаў Вялікага Княства Літоўскага таго часу, быў напісаны на старабеларускай мове.

Акрамя абагульнення бягучага заканадаўства, норм мясцовага звычаёвага права і судовай практыкі па названых галінах права Судзебнік увёў шэраг новых прынцыпаў і падыходаў дзяржавы да пакарання злачынцаў. Так, напрыклад, Судзебнік устанаўліваў адзіныя для ўсёй дзяржавы віды пакаранняў за злачынствы супраць феадальнай уласнасці, абмяжоўваў адказнасць жонкі і дзяцей за злачынствы мужа і бацькі. Тым самым у Судзебніку атрымала замацаванне ідэя індывідуалізацыі пакарання. Новым было і вызначэнне злачынства як супрацьпраўнага дзеяння. Быў устаноўлены новы прынцып вызвалення ад крымінальнай адказнасці дзяцей да сямігадовага ўзросту. У прыватнасці, уводзілася прававая норма, якая забараняла перадаваць пацярпеўшаму дзяцей ва ўзросце да сямі гадоў.

У Судзебніку ўпершыню змешчаны артыкул, які прадугледжваў аналогію закону.

Выявіўся ў Судзебніку і новы погляд на мэты пакарання. Так, у ім упершыню атрымала заканадаўчае замацаванне «запалохванне» як адна з асноўных мэт пакарання ў феадальным праве, хаця не выключаліся і маёмасныя кампенсацыі. Забаранялася вызваляць злачынцу ад кары. Паводле звычаёвага права, злачынца, які быў асуджаны да смяротнай кары, мог адкупіцца або быць перададзеным у няволю пацярпеўшыму ці яго блізкім.

Судзебнік прадугледжваў пакаранне смерцю асоб, якія садзейнічалі ўцёкам чэлядзі нявольнай і феадальназалежных сялян ад сваіх паноў. Прадугледжвалася таксама пакаранне за захоп чужых зямель феадаламі, за іх міжусобіцы і зямельныя спрэчкі. Судзебнік абавязваў усіх жыхароў трымаць у належным стане дарогі і масты.

Такім чынам, выданнем у 1468 г. Судзебніка быў пакладзены пачатак новаму этапу ў развіцці прававой тэорыі і практыкі заканадаўчай дзейнасці дзяржаўных органаў, з'яўленню новых прынцыпаў сістэматызацыі і кадыфікацыі феадальнага права, што завяршылася выданнем Статутаў Вялікага Княства Літоўскага.

12. Статуты Вялікага Княства Літоўскага

Вяршыняй сістэматызатарскай і кадыфікацыйнай дзейнасці стала распрацоўка і прыняцце сусветна вядомых Зводаў законаў Вялікага Княства Літоўскага — Статутаў 1529, 1566 і 1588 гг. Па сваёй унутранай дасканаласці і шырыні рэгулюемых адносін яны не мелі сабе роўных юрыдычных актаў ва ўсёй Еўропе. Датаго ж, напісаны яны былі не на традыцыйных лацінскай або царкоўнаславянскай мовах, а на мове шырока вядомай народным масам — старабеларускай. Базавай асновай Статутаў былі: мясцовае звычаёвае права, адміністрацыйная і судовая практыка, нормы папярэдняга пісанага права і у некаторай ступені нормы заходнееўрапейскага, польскага, кананічнага і рымскага права.

Падрыхтоўка першага Статута ВКЛ вялася ў першай чвэрці XVI ст. Ужо ў 1522 г. быў падрыхтаваны праект Статута, але ён не быў зацверджаны і праца над ім працягвалася. Толькі ў верасні 1529 г. Статут быў уведзены ў дзеянне. Яго рыхтавалі мясцовыя вучоныя і юрысты-практыкі на аснове кадыфікацыі і сістэматызацыі норм мясцовага звычаёвага права, рашэнняў судовых і дзяржаўных устаноў, прывілеяў. Пры распрацоўцы тэкста Статута былі ўпершыню вырашаны многія складаныя тэарэтычныя і практычныя задачы: выпрацавана сістэма і структура размяшчэння прававых норм у залежнасці ад іх зместу, уключаны тыповыя і абагуленыя нормы; дадзена дакладная рэдакцыя кожнага артыкула; уведзены шэраг прававых норм, у якіх адлюстраваны тагачасныя таварна-грашовыя адносіны; уключаны нормы дзяржаўнага, адміністрацыйнага, цывільнага, шлюбна-сямейнага, крымінальнага, судова-працэсуальнага і іншых галін права.

Складальнікі Статута не прытрымліваліся сістэмы кадыфікацыі, прынятай у рымскім праве, а выпрацавалі сваю. У яе аснову пакладзены новыя прынцыпы: сувярэннасць дзяржавы (насуперак сярэдневяковаму касмапалітызму); адзінства права, прыярытэт пісанага права і спецыяльныя нормы, якія забяспечвалі прывілеі пануючаму класу або яго групам. Гэтыя нормы былі не выключэннем, а састаўной часткай у сістэме Статута, хаця і не адпавядалі яго асноўным прынцыпам.

Статут складаўся з 13 раздзелаў і 244 артыкулаў. Пазней у сувязі з дапаўненнямі колькасць артыкулаў павялічылася да 283. У I-III раздзелах змешчаны асноўныя нормы дзяржаўнага права або прынцыповыя палажэнні іншых галін права; у IV і V — шлюбна-сямейнага і спадчыннага, у VI — працэсуальнага, VII — крымінальнага, VIII — зямельнага, IX — ляснога і паляўнічага, X — цывільнага і ў XI-XIII — крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права.

У Статуце юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу, прававое становішча класаў, станаў (саслоўяў) і сацыяльных груп насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых органаў дзяржаўнага кіравання і суда. Абвяшчалася правіла, паводле якога ўсе асобы «як убогія, так і багатыя», павінны былі судзіцца ў адпаведнасці з нормамі, якія былі выкладзены ў Статуце. Вялікі князь (гасудар) абавязваўся захоўваць тэрытарыяльную цэласнасць краіны, не дапускаць чужаземцаў на дзяржаўныя пасады, не даваць ім маёнткаў, не адбіраць у мясцовых феадалаў пасады і маемасць без суда, прытрымлівацца ўсіх старых законаў і звычаяў.

Асаблівая ўвага ў Статуце надавалася судова-працэсуальнаму праву. Суд быў важным органам, які забяспечваў ахову правапарадку. Дзейнасць яго была накіравана на поўнае абмежаванне самавольства феадалаў, наданне праву аўтарытэту. Асаблівая ўвага надавалася парадку ажыццяўлення правасудзя, абвяшчаўся прынцып публічнасці правасуддзя, фармальнай роўнасці бакоў у працэсе, права абвінавачваемага на абарону з удзелам адваката. Адначасова ў Статуце абвяшчалася захаванне прывілеяў і льгот для феадалаў, што на практыцы замацоўвала бяспраўе простых людзей і захоўвала паўнату правоў толькі для буйных феадалаў. Аднак у перыяд феадалізму нават абвяшчэнне ідэі правапарадку было значным крокам наперад.

Ідэі гуманізму паўплывалі на нормы крымінальнага і цывільнага права. Так, у 7 артыкуле I раздзела абвяшчалася, што ніхто не павінен адказваць за чужую віну, а крымінальнае пакаранне трэба назначаць толькі асобам, віна якіх устаноўлена судом. У 7 артыкуле XI раздзела зроблена спроба абмежаваць халопства. Вольнага чалавека за

злачынства не павінны былі аддаваць у вечную няволю.

Даволі поўна выкладзены нормы, якія забяспечвалі права ўласнасці феадалаў. Шмат увагі нададзена сямейна-шлюбнаму праву. Падрабязна рэгламентаваўся парадак назначэння апекуноў непаўналетнім дзецям, якія засталіся без бацькоў.

Такім чынам, прававыя нормы, змешчаныя ў Статуце, ў сваёй сукупнасці складалі своеасаблівую феадальную канстытуцыю, у якой упершыню вызначаліся структура і характар дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, замацоўваліся асноўныя правы і прывілеі пануючага класа і саслоўя шляхты.

Змены, якія адбываліся ў сярэдзіне XVI ст. у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці дзяржавы выклікалі правядзенне аграрнай, судовай і адміністрацыйнай рэформ, патрабавалі ўдасканалення права. Недахопы ў заканадаўстве адчуваў і сам урад. Таму для падрыхтоўкі праекта новага Статута ў 1551 г. была створана камісія з 10 чалавек (5 католікаў і 5 праваслаўных).

Праект Статута быў аддадзены сойму на папярэдні разгляд у 1561 г., але канчаткова законную сілу ён набыў толькі ў 1566 г.

Асноўнымі крыніцамі Статута 1566 г. былі агульназемскія і абласныя прывілеі, Судзебнік 1468 г., Статут 1529 г. і некаторыя нормы звычаёвага права, выкарыстаны таксама нормы рымска-каталіцкага і грэка-праваслаўнага царкоўнага права, нормы «инших прав христианских».

Калі рыхтаваўся другі Статут ВКЛ, некаторыя члены рэдакцыйнай камісіі (Аўгусцін Ратундус, Пётр Ронзій) настойвалі на замене «рускай» (старабеларускай) мовы лацінскай. Але супраць гэтага выступілі патрыятычна настроеныя юрысты, у прыватнасці, дзяк вялікакняжацкай канцылярыі Марцін Валадковіч. Іх падтрымаў падканцлер Астафей Валовіч, у выніку чаго Статут быў падрыхтаваны на старабеларускай мове.

Па сваёй структуры Статут складаўся з 14 раздзелаў і 367 артыкулаў. Першыя тры раздзелы ахоплівалі нормы дзяржаўнага, ваеннага і адміністрацыйнага права, IV — судовага ладу і судовага працэсу, V-VI — сямейнага і апякунскага права, VII, VIII і IX — цывільнага права, X — ляснога і паляўнічага права, XI-XIV — крымінальнага права.

Былі замацаваны асноўныя прынцыпы права: адзінства права для ўсіх грамадзян (хоць яно не было роўным для ўсіх); дзяржаўны суверэнітэт (насуперак царкоўнаму касмапалітызму); абмежаванне ўлады вялікага князя (гаспадара); прыярытэт пісанага права.

Упершыню намячалася аддзяленне суда ад органаў улады і кіравання. Для гэтага ствараліся земскія і падкаморскія суды. Больш поўна рэгламентавалася кампетэнцыя органаў дзяржаўнай улады і кіравання, якія былі заснаваны на агульных прынцыпах феадальнага права; стварэнне льгот і пераваг для класа феадалаў і саслоўя шляхты; недапушчэнне простых людзей у органы кіравання; замацаванне прававой няроўнасці розных сацыяльных груп насельніцтва.

Кіраўніком дзяржавы і галоўнай асобай ва ўсёй сістэме дзяржаўных органаў прызнаваўся вялікі князь, які ў Статуце называўся «господарем». Яго прававое становішча было тыповым для абмежаванага манарха, хаця і ўтрымлівала некаторыя асаблівасці. Паўнамоцтвы князя рэгламентаваліся прававымі нормамі Статута 1566 г. Ён не мог без рашэння сойма пачынаць вайну або ўстанаўліваць падаткі на ваенныя патрэбы, выдаваць новыя законы. Статут забараняў даваць маенткі, пасады і званні чужаземцам, у тым ліку ўраджэнцам Польшчы, замацоўваў галоўную ролю буйных феадалаў у дзяржаве.

У Статуце 1566 г. акрэслены пераход ад феадальнага права ўласнасці да буржуазнага. Тут значна паўней, чым у папярэднім Статуце, выкладзены нормы спадчыннага права, істотныя змены ўнесены ў крымінальнае права: суб'ектам злачынства прызнаваўся толькі сталы чалавек. Непаўналетнія маглі быць пакараны толькі пасля дасягнення імі 14-гадовага ўзросту; абвяшчалася прэзумпцыя невінаватасці; крымінальнае пакаранне павінна было ажыццяўляцца толькі па суду; асоба, якая абвінаваціла каго-небудзь у злачынстве і не даказала яго віны, несла такое ж пакаранне, якім мог быць пакараны абвінавачаны ёю.

Другі Статут Вялікага Княства Літоўскага (звод законаў феадальнага права) дзейнічаў на Беларусі і ў Літве ў 1566-1588 гг., а на Правабярэжнай Украіне і ў XVII-XVIII стст., атрымаўшы назву «Валынскі Статут». Вядомы яго пераклады на лацінскую і польскую мовы.

Пасля таго, як быў прыняты Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 г., кадыфікацыйныя работы не спыніліся. Ужо на Берасцейскім сойме 1566 г. былі ўнесены папраўкі ў некалькі артыкулаў. Праз два гады Гродзенскі сойм таксама ўнёс папраўкі ў некаторыя артыкулы і стварыў камісію, для дапрацоўкі Статута. Гэта камісія была зацверджана і Люблінскім соймам (за выключэннем тых яе сяброў, якія прадстаўлялі землі, што адышлі да Кароны). Ужо да канца 1584 г. работа над Статутам была закончана, але ў сувязі з тым што новы звод ігнараваў акт Люблінскай уніі 1569 г., Польшча не дапускала яго

зацвярджэння на агульным сойме Рэчы Паспалітай.

Каб захаваць вялікакняжацкі трон, Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут сваім прывілеем 28 студзеня 1588 г. Галоўнае значэнне дзяржаўна-прававых норм Статута заключалася ў тым, што ён заканадаўча аформіў захаванне ВКЛ як дзяржавы насуперак акту Люблінскай уніі.

Статут 1588 г. меў 14 раздзелаў і 488 артыкулаў.

У I-IV раздзелах змяшчаліся нормы дзяржаўнага права і судовага ладу, у V-X і, часткова, у XIII — шлюбна-сямейнага, зямельнага і цывільнага права, у XI-XII, XIV і, часткова XIII — крымінальнага права. Трэба заўважыць, што нормы джяржаўнага права ў Статут 1588 г. былі амаль поўнасцю перанесены з Статута 1566 г. з некаторымі ўдакладненнямі і дапаўненнямі. Яны юрыдычна замацоўвалі адносіны, якія склаліся паміж ВКЛ і Польшчай пасля 1569 г.

Сістэматызацыя права, на аснове якой ствараўся Статут 1588 г., рабілася на новых прынцыпах, уласцівых для пераходнай эпохі ад сярэдневякоўя да новага часу і зараджэння буржуазных адносін. Гэта выяўлялася перш за ўсё ў абмежаванні ўлады гаспадара і імкненні да падзелу ўладаў; у абвяшчэнні неабходнасці прытрымлівацца дзяржаўнага суверэнітэту насуперак сярэдневяковаму касмапалітызму і ў юрыдычным замацаванні адзінства права для ўсёй дзяржавы і ўсіх паўнапраўных людзей. Заканадаўчая ўлада замацоўвалася за соймам, выканаўчая — за вялікім князем і Радай, судовая — за вялікакняжацкім і галоўным судамі, а таксамі за мясцовымі судамі.

Статут адначасова з канчатковым запрыгоньваннем сялян прадугледжваў крымінальную адказнасць за забойства простага чалавека, абвяшчаў ідэю верацярпімасці, забараняў перадачу вольнага чалавека за даўгі або злачынства ў няволю, устанаўліваў наступленне крымінальнай адказнасці з 16 гадоў.

Адзначым, што Статут прызнаваў ільготы і прывілеі для пануючых саслоўяў. Гэтым падрываўся агульны прынцып адзінства права. Але мы павінны ведаць, што прывілеі былі не выключэннем, а састаўной часткай усяго феадальнага права, хаця і не адпавядалі новым прынцыпам. У гэтым заключалася ўнутраная супярэчлівасць феадальнай прававой сістэмы.

Праз увесь Статут праводзіцца ідэя ўмацавання прававога парадку, пры якім усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы абавязаны дзейнічаць толькі ў адпаведнасці з законам. Гэта ідэя была накіравана супраць дэспатызму гаспадара, буйных феадалаў і сярэдневяковай тэакратычнай тэорыі паходжання і сутнасці дзяржавы.

Крыніцамі для распрацоўкі трэцяга Статута былі Статуты 1529 і 1566 г, соймавыя пастановы 1573, 1578, 1580 і 1584 гг., каралеўскія прывілеі, пастановы павятовых соймікаў.

Статут 1588 г. закончыў кадыфікацыю права ў Вялікім Княстве Літоўскім. У гэтым заканадаўчым акце адлюстраваліся не толькі дзяржаўна-прававыя ідэі таго часу, але і тыя, што апярэджвалі час, выявілася багатая прававая культура беларускага і літоўскага народаў. Статут быў надрукаваны на старабеларускай мове ў 1588 г. у Віленскай друкарні Мамонічаў пад наглядам і на сродкі Л.Сапегі. Гэта першы і адзіны настолькі поўны звод законаў у Еўропе XVI ст.

Статут 1588 г. быў выдадзены на польскай мове ў 1614 г. (перавыдаваўся ў 1619, 1648, 1694, 1744, 1786, 1819 гг.), у 1811 г. — на рускай і польскай мовах у Санкт-Пецярбургу. У канцы XVI ст. гэты звод законаў быў выкарыстаны пры кадыфікацыі прускага права, а таксама пры падрыхтоўцы Саборнага Улажэння 1649 г. у Расіі, у XVII ст. перакладзены на нямецкую мову, ужываўся ў судах Латвіі і Эстоніі; у 1735-1738 гг. перакладзены на ўкраінскую мову, быў асноўнай крыніцай права на Украіне, пра што сведчаць 50 украінскіх рукапісаў Статута.

Перакладалі Статут таксама на французскую і лацінскую мовы.

Пасля далучэння Беларусі і Літвы да Расійскай імперыі трэці Статут ВКЛ дзейнічаў у Віцебскай і Магілёўскай губернях да 1831 г., у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях — да 1840 г.

13. Вышэйшыя судовыя органы Вялікага Княства Літоўскага

Да канца XV - пачатку XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім дзейнічаў тыповы для раннефеадальнага перыяду прынцып, згодна з якім органы дзяржаўнай улады адначасова выконвалі судовыя функцыі. На працягу XVI ст. назіраецца адыход ад гэтага парадку спраў. У выніку склаліся дзве сістэмы судовых органаў: агульнасаслоўныя суды, што былі заснаваны на звычаёвым праве і законе і саслоўныя суды (для духавенства, шляхты, мяшчан, сялян). Саслоўныя суды для шляхты былі аддзелены ад адміністрацыі і дзейнічалі на падставе закона ў адпаведнасці з тэорыяй аб падзелу ўлад. Астатнія саслоўныя суды дзейнічалі на аснове біблії, карана, торы, спецыяльных нарматыўных актаў ці старажытнага копнага права.

Вышэйшым агульнасаслоўным судом лічыўся вялікакняжацкі (гаспадарскі) суд, а таксама суд паноў-рады і камісарскі суд. Апошнія з'яўляліся разнавіднасцю гаспадарскага суда.

Кампетэнцыя гаспадарскага суда была вельмі шырокай. Ён разглядаў справы як па першай, так і па другой інстанцыях. У якасці суда першай інстанцыі разглядаліся справы аб дзяржаўных злачынствах, «споры о силе и значении различных жалованных грамот, затрагивающих интересы государственной казны», аб прыналежнасці да саслоўя шляхты, аб палітычных злачынствах, аб скаргах на незаконныя дзеянні вышэйшых службовых асоб і інш. Выключна да падсуднасці гаспадарскага суда адносіліся справы аб злачынствах супраць паноў-рады, ваявод, каштalянаў, стараст, суддзяў у час выканання імі сваіх службовых абавязкаў.

У якасці суда другой інстанцыі гаспадарскі суд разглядаў любыя справы, якія прыходзілі ў парадку апеляцыі на рашэнні з мясцовых судоў. Разгляд спраў у гаспарадскім судзе вёўся пры ўдзеле вялікага князя і радных паноў. Рашэнні гаспадарскага суда лічыліся канчатковымі і абскарджанню не падлягалі.

Па даручэнню вялікага князя суд паноў-рады мог разглядаць тыя справы, якія паступалі на імя гаспадара. Па сутнасці, як адзначалася вышэй, гэты суд быў разнавіднасцю гаспадарскага суда. Суд паноў-рады мог разглядаць справы незалежна ад колькасці членаў Рады, якія прысутнічалі на судовым пасяджэнні.

Калі суд паноў-рады па даручэнню гаспадара разглядаў розныя справы, то камісарскі суд утвараўся ім для рашэння спраў, якія паступалі на імя вялікага князя і тычыліся толькі зямельных спрэчак феадалаў, што закраналі інтарэсы вялікакняжацкіх уладанняў. Спецыяльна прызначаныя камісары выязджалі на месца і там разглядалі спрэчку па сутнасці справы і прымалі па ёй рашэнне.

Соймавы суд першапачаткова праводзіўся вялікім князем і панамі-радай у час склікання соймаў. Згодна з Статутам 1588 г., справы ў соймавым судзе разглядаліся вялікім князем, панамі-радай і васьмю дэпутатамі сойма.

Адной з разнавіднасцей гаспадарскага суда быў маршалкаўскі суд. Яго мог узначальваць адзін маршалак ці два. Гэты суд разглядаў справы па даручэнню або загаду гаспадара. Месцам правядзення яго пасяджэнняў быў звычайна гаспадарскі двор, а калі ўзнікала неабходнасць, то ён мог пераязджаць і ў іншыя месцы.

З мэтай разгрузіць гаспадарскі суд, граматай караля Стэфана Баторыя ад 1 сакавіка 1581 г. быў утвораны Галоўны суд (трыбунал) —

найвышэйшы суд Вялікага Княства Літоўскага.

З утварэннем Галоўнага трыбунала судовая ўлада вялікага князя і паноў-рады абмяжоўвалася. Гэта з'ява ўказвае на пастаянную тэндэнцыю да аслаблення ўлады вялікага князя ў дзяржаве і ўмацавання ролі шляхты. Мяркуем, што з утварэннем Галоўнага трыбунала ўзмацняўся і суверэнітэт Вялікага Княства Літоўскага.

Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага (Галоўны суд) ствараўся для апеляцыйнага перагляду спраў, але асобныя справы ён мог разглядаць у парадку першай інстанцыі. Пастановы яго мелі сілу пастаноў сойма. Галоўны суд складаўся з 46 суддзяў-дэпутатаў, якія выбіраліся на соймах з мясцовай шляхты, па два ад кожнага павета, тэрмінам на адзін год. Пры гэтым трэба адзначыць, што выбранымі маглі быць толькі шляхцічы, якія мелі ўласныя зямельныя ўладанні, дасведчаныя ў праве і мясцовых звычаях.

Галоўны суд разглядаў апеляцыі на рашэнні земскіх, замкавых і падкаморскіх судоў, а таксама скаргі на рашэнні павятовай адміністрацыі. Трыбунал разглядаў скаргі на рашэнні (выракі) панскіх судоў у адносінах служылых шляхцічаў, прыгавораных да пакарання смерцю, турэмнага зняволення ці буйных грашовых штрафаў.

Па першай інстанцыі Галоўны суд разглядаў справы, якія раней былі ў кампетэнцыі вялікакняжацкага суда. Асаблівую катэгорыю спраў складалі скаргі на незаконныя дзеянні і злоўжыванні мясцовых службовых асоб і суддзяў. Галоўны суд разглядаў і тыя справы, якія былі адкладзены гаспадарскім судом да 1581 г.

Сесіі Трыбунала праходзілі пад старшынствам выбранага суддзямі маршалка.

Справы разглядаліся судовай калегіяй з двух-сямі чалавек. Пастановы прымаліся большасцю галасоў на аснове Статутаў Вялікага Княства Літоўскага, соймавых канстытуцый і звычаёвага права. Не прымалі ўдзелу ў разглядзе справы члены суда з таго самага павета, што і бакі ў спрэчцы. Як адзначалася, рашэнні (дэкрэты) Галоўнага суда мелі сілу соймавых пастаноў, таму яны не маглі быць абскарджаны і адменены нават вялікім князем. Выкананне рашэнняў праводзілася павятовымі судамі або павятовымі старастамі.

Разам з разглядам судовых спраў Галоўны суд выконваў і натарыяльныя абавязкі: завяраў завяшчанні, розныя дагаворы (пазыкі, куплі-продажу маёнткаў і інш.).

Акрамя Галоўнага трыбунала было яшчэ некалькі судоў вышэйшай інстанцыі, у прыватнасці, суд літоўскай скарбавай камісіі, або «Скарбавы трыбунал». Ён быў утвораны ў Вялікім Княстве

Літоўскім у 1609 г. і складаўся з падскарбіяў (земскага і дворнага), з аднаго сенатара і сямі шляхцічаў, выбраных на сойме. Да кампетэнцыі скарбавага трыбунала адносіліся ўсе справы, якія тычыліся гандлёвых кантрактаў, спрэчак паміж купцамі і ісках па векселях, злачынных дзеянняў, накіраваных супраць службовых асоб дзяржаўнага скарба. Нарэшце, гэтаму трыбуналу належалі справы, звязаныя з нявыплатай дзяржаўных падаткаў. У 1726 г. пастановай Гродзенскага сойма частка функцый скарбавага трыбунала была перададзена Галоўнаму літоўскаму трыбуналу.

14. Мясцовыя судовыя органы ВКЛ

Сярод мясцовых судоў найбольш старадаўнім быў замкавы («гродскі») суд, пасяджэнні якога праводзіліся ў замку («гродзе»). Замкавы суд з'яўляўся агульнасаслоўным. У ім разглядаліся справы па абвінавачванню шляхты і простых людзей (мяшчан і сялян).

Падсуднасць замкавага суда была даволі шырокай і ахоплівала асноўныя катэгорыі крымінальных спраў. Аднак трэба падкрэсліць, што замкаваму суду былі падсудныя крымінальныя справы аб найбольш цяжкіх злачынствах асоб, якія былі затрыманы на месцы злачынства ці былі злоўлены на працягу 24 гадзін з моманту яго здзяйснення.

Замкавы суд мог дзейнічаць у двух саставах: вышэйшым (як першая і другая інстанцыі) і ніжэйшым (толькі ў якасці першай інстанцыі).

У склад вышэйшага замкавага суда ўваходзілі ваявода ці староста або дзяржаўцы і прадстаўнікі мясцовых феадалаў, а ў Полацку — і прадстаўнікі мяшчан.

Ніжэйшы замкавы суд складаўся з памешчыкаў, ваяводы або старасты ці дзяржаўцы, а таксама суддзі і пісара. Па Статуту 1566 г. на гэтыя пасады ў судзе маглі быць прызначаны толькі ўраджэнцы Вялікага Княства Літоўскага — добрачынныя шляхцічы, якія валодалі нерухомай маёмасцю ў дадзеным павеце. Статут 1588 г. патрабуе таксама, каб шляхцічы, якія выбраны ў склад суда, ведалі беларускую грамату і законы.

Такім чынам, галоўная роля ў замкавым судзе належала службовым асобам мясцовай адміністрацыі. Аднак сам факт уключэння ў склад гродскага (замкавага) суда суддзі і пісара, якія таксама былі з мясцовых феадалаў і ведалі законы, сведчыць пра пэўныя зрухі ў

судаводстве, развіцці права. Суд пачаў аддзяляцца ад адміністрацыі і ў феадалаў узнікла неабходнасць набываць спецыяльныя юрыдычныя веды.

Калі вышэйшы гродскі суд атрымліваў скаргу на пастанову ніжэйшага суда, то ён павінен быў разгледзець яе не пазней чатырох тыдняў. Апеляцыі на рашэнні вышэйшага гродскага суда падаваліся ў Галоўны суд.

Справаводства замкавага (гродскага) суда вёў пісар.

Дастаўка заяў і выкананне рашэнняў суда ажыццяўляліся павятовымі вознымі і судовым прыставам. Пры замкавам судзе знаходзіўся кат, была турма, у якой утрымліваліся зняволеныя па рашэннях замкавага, земскага і Галоўнага судоў. Важнай функцыяй замкавага суда было выкананне прыгавораў і рашэнняў іншых судоў.

У кампетэнцыю гродскага суда ўваходзілі і некаторыя адміністрацыйныя функцыі: у час работы сваёй сесіі і сесіі земскага суда ён вызначаў памяшканне для судовага паседжання, размяркоўваў кватэры для членаў земскага суда і іншых чыноўнікаў, якія прыязджалі на сесію.

Гродскі суд выконваў і некаторыя натарыяльныя дзеянні: рабіў копіі дакументаў, фіксаваў завяшчанні, акты дарэння, куплі-продажу, залогу, пазыкі, усынаўлення і інш. Усе натарыяльныя дзеянні фіксаваліся ў актавых кнігах, якія вяліся ў гродскім судзе.

Найбольш тыповым, аддзеленым ад адміністрацыі саслоўным судом для шляхты быў земскі павятовы суд. У асноўным ён разглядаў грамадзянскія іскі і крымінальныя справы па абвінавачанню шляхты. Земскі суд выконваў таксама функцыі натарыята, запісваў скаргі на незаконныя дзеянні службовых асоб павета. Канчатковае прававое афармленне земскага суда праведзена Бельскім прывілеем 1564 г. і Статутамі 1566 і 1588 гг. У склад земскага суда ўваходзілі суддзя, падсудак і пісар, якія выбіраліся на з'ездзе з павятовай шляхты. На кожную пасаду з'езд вылучаў чатырох кандыдатаў з мясцовых аселых шляхцічаў — хрысціян («веры годных»), якія валодалі беларускай граматай, ведалі права і не займалі духоўных і дзяржаўных пасад. Са спіса кандыдатаў вялікі князь зацвярджаў па аднаму на кожнае месца. Суддзі прызначаліся пажыццёва і ніхто, нават вялікі князь, не мог вызваліць іх ад абавязкаў. Суддзям забаранялася сумяшчаць сваю працу з іншай службай.

На першай сесіі новы суддзя публічна прысягаў, што будзе судзіць справядліва, не зважаючы на грамадскае і матэрыяльнае становішча людзей, асабістыя адносіны да іх.

Сесіі земскага суда збіраліся тры разы на год: у студзені, чэрвені і кастрычніку. Кожная доўжылася тры-чатыры тыдні.

Судаводства вялося на падставе Бельскага прывелея 1564 г. і Статутаў Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. на старабеларускай (да канца XVII ст.), а пазней на польскай мове.

Калі на судзе сярод прысутных былі людзі, дасведчаныя ў пытаннях права, то суддзі запрашалі іх да «рассудку праўнага», і яны мелі дарадчы голас пры вынясенні судовых пастаноў. Кожны, хто быў на судзе, мог сказаць тое, што ведаў па разглядаемай справе, выказаць свой погляд на яе.

Такім чынам, стварэнне земскіх судоў сведчыла пра важны этап у развіцці судовага ладу і права ў феадальнай Беларусі. Гэтыя суды далі пачатак арганізацыі судовай сістэмы, заснаванай на аснове падзелу ўлад, «бо яны былі першымі судамі, цалкам аддзеленымі і незалежнымі ад мясцовай адміністрацыі». Няма сумнення ў тым, што ўзнікненне такіх судоў стала магчымым дзякуючы пашырэнню ролі норм пісанага права, што, у сваю чаргу, выклікала неабходнасць з'яўлення спецыяльнай прафесіі юрыста.

Другім судом, што быў аддзелены ад органаў дзяржаўнага кіравання, стаў падкаморскі суд, створаны ў 1566 г. Ён разглядаў зямельныя і межавыя спрэчкі феадалаў, што раней уваходзіла ў кампетэнцыю гаспадарскага суда.

Па Статуту 1566 г. справы ў падкаморскім судзе вырашаў суддзя — падкаморый, з удзелам зацікаўленых бакоў. На пасаду падкаморыя прызначаў вялікі князь. З 1588 г. на павятовых соймiках на пасаду падкаморыя выбіралі чатырох кандыдатаў, аднаго з якіх і зацвярджаў вялікі князь літоўскі.

Разгляд справы адбываўся на месцы спрэчных межаў. Падкаморый выслухоўваў тлумачэнні бакоў, дапытваў сведак, аглядаў дакументы і іншыя пісьмовыя доказы, прымаў рашэнне і вызначаў на мясцовасці межы землеўладання, а пасля, з дапамогай сваіх памочнікаў (каморнікаў), устанаўліваў межавыя знакі.

Рашэнне падкаморскага суда падлягала неадкладнаму выкананню, але магло быць абскарджана ў вялікакняжацкі суд ці ў трыбунал Вялікага Княства Літоўскага.

Пастановы падкаморскага суда і рэестры спраў запісваліся ў кнігі земскага павятовага суда. Іскі аб праве землеўладання не адносіліся да кампетэнцыі падкаморскага суда і разглядаліся, адпаведна, земскім ці камісарскім судом. Падкаморскія суды на Беларусі існавалі да XIX ст.

На новых прынцыпах выбарнасці і ўдзелу прадстаўнікоў

гарадскога насельніцтва ствараліся войтаўска-лаўніцкія і бурмісцерскія суды, якія дзейнічалі ў гарадах, што мелі Магдэбургскае права, ім былі падсудны крымінальныя і грамадзянскія справы гараджан.

Войтаўска-лаўніцкі суд складаўся з войта, які старшынстваваў на пасяджэннях, яго намесніка і лаўнікаў (засядацеляў), якія выбіраліся мяшчанамі.

Нязначныя правапарушэнні і спрэчкі мяшчан разглядалі гарадскія бурмістры, якія прызначаліся войтам ці выбіраліся мяшчанамі.

Пры разглядзе спраў войтаўска-лаўніцкія і бурмісцерскія суды акрамя Магдэбурскага права кіраваліся мясцовым гарадскім правам, Статутамі Вялікага Княства Літоўскага.

Такім чынам, стварэнне незалежных ад мясцовай адміністрацыі выбарных судоў, хаця б і для некаторых саслоўяў, сведчыла аб новым этапе ў развіцці прававой культуры грамадства, імкненні да паступовага ўсталявання прававога парадку ў дзяржаве. Выбарны незалежны суд быў прасякнуты ідэямі служэння не толькі інтарэсам дзяржавы, але і правам асобных людзей, задачамі абароны правапарадку нават ад органаў дзяржаўпай улады. Так, скаргі на незаконныя дзеянні ваявод, стараст і іншых службовых асоб маглі падавацца ў земскія і гродскія суды, а апеляцыі на іх пастановы — ў Галоўны суд. Гэты радыкальны паварот у прававой тэорыі і поглядах на ролю суда ў грамадстве Беларусі ў XVI ст. пачаў ажыццяўляцца ў Заходняй Еўропе толькі ў XVII-XVIII стст. Статут 1588 г. у значнай ступені паставіў дзейнасць мясцовай адміністрацыі пад кантроль суда.

На Беларусі існавалі спецыяльныя каптуровыя суды, а таксама сялянскія копныя суды.

Каптуровы суд, які дзейнічаў у перыяд безкаралеўя, быў надзвычайным, часовым судом для феадалаў. Першыя каптуровыя суды з'явіліся паводле пастановы сойма Вялікага Княства Літоўскага ад 29 студзеня 1587 г. У склад суда ўваходзілі ваявода ці павятовы староста (іх намеснікі), суддзя і пісар замкавага суда, падкаморый, а таксама суддзя, падсудак і пісар земскага суда. Суд лічыўся правадзейным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш пяці членаў яго складу. Каптуровы суд разглядаў крымінальныя справы аб забойствах, разбоях, падпалах, нападах на маёнткі, фальсіфікацыі маёмасных правоў, а таксама цывільныя справы магнатаў, шляхты, манастыроў. Пастановы каптуровага суда, якія прымаліся большасцю галасоў, былі канчатковымі і апеляцыі не падлягалі.

Копны суд дзейнічаў на падставе норм звычаёвага права. Ён разглядаў галоўным чынам справы простых людзей: сялян, вольных

пасяленцаў, мяшчан гарадоў, якія не карысталіся Магдэбургскім правам. Збіраўся суд у пэўных месцах, якія называліся капавішчамі.

Судаводства мела 2 формы: звычайную і гвалтоўную. Звычайная капа збіралася па ініцыятыве зацікаўленых асоб у загадзя вызначаныя тэрміны. Разглядаліся ў асноўным цывільныя справы, а таксама межавыя спрэчкі, дробныя крадзяжы, сваркі, факты прычынення шкоды, чараўніцтва і інш. Суддзямі маглі быць усе жыхары мясцовасці, але часцей за ўсё на капу збіраліся 10-20 копных мужоў і старцаў. На судзе прысутнічалі і прадстаўнікі дзяржаўнай або панскай адміністрацыі. Яны сачылі за правільнасцю выканання норм копнага права. Пастанова суда была канчатковай і не абскарджавалася.

Гвалтоўная капа збіралася для разгляду забойстваў, падпалаў, нападаў. Пэўнага месца збору яна не мела. Пакрыўджаны чалавек «падымаў гвалт» і ўсе дарослыя, хто чуў, павінны былі бегчы на месца здарэння, дзе і адбываўся суд. Калі злачынцу ўдавалася ўцячы ці схавацца, то ўся капа ішла па «гарачаму следу» і ў выпадку затрымання ў межах воласці (горада) выносіла прыгавор, нават смяротны. Калі злачынец уцякаў у суседнюю воласць, капа спынялася на мяжы і перадавала «гарачы след» суседзям. Дзейнасць копнага суда на Беларусі спынілася ў другой палове XVIII ст.

Феадальна-залежных сялян звычайна судзілі іх уладальнікі.

15. Працэсуальнае права Вялікага Княства Літоўскага

Па Статуту 1588 г. працэсуальнае права было адзіным і для крымінальных, і для цывільных спраў. Панаваў іскавы характар працэсу, згодна з якім ісцец сам павінен быў збіраць доказы, прад'яўляць іх суду і падтрымліваць абвінавачанне. У любой стадыі працэсу ісцец мог адмовіцца ад іску ці абвінавачання, заключыць міравое пагадненне або памілаваць злачынцу. Калі абвінавачванне не знаходзіла пацвярджэння, ісцец мог быць прыцягнуты да адказнасці.

Роля суда пры іскавым судаводстве была параўнаўча пасіўнай, «ён нібы падсумоўваў доказы, што прад'яўлялі бакі, а затым выносіў рашэнне ці прыгавор на аснове фармальнай ацэнкі доказаў у залежнасці ад іх колькасці і зараней прадугледжанай у законе сілы».

Па Статуту 1588 г. суб'екты працэсу мелі розную працэсуальную праваздольнасць. Поўнай працэсуальнай праваздольнасцю карысталіся найбольш багатыя феадалы. Чэлядзь дворная і феадальна-залежныя

сяляне былі пазбаўлены праваздольнасці. За іх у судах павінны былі выступаць паны або, па даручэнню апошніх, адвакаты ці іншыя прадстаўнікі феадалаў.

Судовы працэс пачынаўся з падачы скаргі («пратэстацыі»), пасля чаго складалася позва. Яна адначасова была выклікам у суд і іскавай заявай з пераказам сутнасці справы. Позва ўручалася адказчыку праз вознага, аб чым рабіўся адпаведны запіс у судовай кнізе.

Такім чынам, у працэсе ўдзельнічалі два бакі: той, хто ўзбуджаў справу, адносіўся да боку павадовага, той, хто адказваў ці абвінавачваўся, — да боку адпорнага.

Асноўным працэсуальным абавязкам бакоў было добрасумленнае вядзенне працэсу. Працэсуальныя правы бакоў былі даволі шырокімі і давалі ім магчымасць актыўна ўздзейнічаць на ўвесь ход працэсу.

Пры судах працавалі прафесіянальныя адвакаты (прокуратары). Пры неабходнасці прадстаўнікі старон мелі права карыстацца іх паслугамі. Як правіла, адвакаты мелі спецыяльную юрыдычную падрыхтоўку, якую атрымлівалі не толькі ў Кракаве і Вільні, але нават у Італіі, шэрагу іншых дзяржаў.

Агульная тэрытарыяльная падсуднасць спраў у адносінах да вольных людзей вызначалася паводле звычаёвага права: у месцы жыхарства адказчыка па грамадзянскіх справах і ў месцы, дзе адбылося злачынства, — па крымінальных. Бакі мелі права заключаць пагадненне аб змене падсуднасці (тэрытарыяльнай і інш.).

Да 1564 г. буйныя феадалы карысталіся правам выключнай падсуднасці, іх справы разглядаў вялікакняжацкі суд, што ўскладняла парадак прад'яўленняў ім іскаў дробнымі і сярэднімі феадаламі. Бельскі прывілей 1564 г. абвясціў роўную падсуднасць для ўсёй шляхты.

У працэсуальным заканадаўстве першараднае значэнне надавалася вызначэнню сродкаў, з дапамогай якіх суд мог рабіць вывад аб правах і абавязках бакоў і прымаць пэўнае рашэнне. Тэорыя фармальных доказаў, што панавала ў феадальным працэсуальным праве, грунтавалася на ўстаноўленай у законе сіле доказаў, якія дзяліліся на дасканалыя і недасканалыя («доводы зуполные» і «незуполные»). Колькасць і якасці доказаў вызначалася для кожнай катэгорыі спраў асобна. Напрыклад, пры разглядзе спрэчак аб уласнасці на зямлю патрабавалася, каб кожны бок прадстаўляў па дзевяць сведак. Па іншых справах хапала сведчання двух сведак.

Важнейшы прынцып працэсуальнага права Вялікага Княства Літоўскага заключаўся ў тым, што бок павадовы (ісцец) па грамадзянскіх справах павінен быў прывесці факты, якія б сведчылі аб

наяўнасці шкоды, а па крымінальных справах — віны. Ніхто не мог быць асуджаны без наяўнасці паўнаты неабходных доказаў. Закон прадугледжваў вызваленне падсуднага ад пакарання пры недастатковасці доказаў і пры з'яўленні ў суда сумнення ў яго вінаватасці. Пры аднолькава няпоўных доказах істца і адказчыка суд аддаваў перавагу апошняму.

Асноўнымі відамі доказаў лічыліся тлумачэнні бакоў, іх прызнанне; паказанні сведак; прысяга; пісьмовыя і рэчавыя доказы: вывады і тлумачэнні экспертаў. Тлумачэнне істца або адказчыка займала адно з цэнтральных месц у сістэме судовых доказаў. Прызнанне адказчыкам іску, зробленае ў судзе, разглядалася як поўны доказ і было дастатковай падставай для прыняцця судовага рашэння. Адказчык, або падсудны, прызнаўшы іск або абвінавачанне, пазбаўляўся права абскарджваць пастанову суда, у аснову якой было пакладзена прызнанне.

Самымі распаўсюджанымі доказамі былі паказанні сведкаў. Статут 1588 г. вызначаў, хто мог быць сведкам і працэсуальную працэдуру атрымання паказанняў. Прысяга і клятва лічыліся дапаможнымі доказамі і звычайна выкарыстоўваліся, калі паказанняў сведак ці іншых доказаў для вырашэння справы было недастаткова. Вышэйшай ступенню дакладнасці, як лічылася, валодалі сведчанні духоўных і службовых асоб дзяржаўнай адміністрацыі.

У працэсе разгляду грамадзянскіх спраў важнае значэнне надавалася пісьмовым доказам, бо закон патрабаваў заключаць многія пагадненні, дагаворы куплі-продажу, пазыкі і інш. у пісьмовай форме. Усе гэтыя акты складаліся па вызначанай форме, што паграбавала наяўнасці пэўных рэквізітаў (подпісы, пячаткі). Найбольш важныя з актаў рэгістраваліся ў судовых кнігах. Падробка пісьмовых доказаў каралася смерцю. Рэчавы доказ разглядаўся як самы пераканаўчы, асабліва калі злачынец быў затрыманы на месцы злачынства.

У адпаведнасці з заканадаўствам Вялікага Княства Літоўскага па найбольш цяжкіх злачынствах (дзяржаўныя, ваенныя, некаторыя крымінальныя) вышук, следства і суд былі абавязковымі, незалежна ад таго, ці рабілася пацярпеўшым адпаведная заява. Папярэдняе следства (шкрутынім) па найбольш цяжкіх і небяспечных злачынствах ажыццяўлялася службовымі асобамі дзяржаўнага апарату; звычайна старастамі, іх намеснікамі ці замкавымі суддзямі. Яны выязджалі на месца, дапытвалі сведак, падазроных, запісвалі іх паказанні і перадавалі ў суд, які разглядаў справу. У якасці гарантыі ад злоўжыванняў службовых асоб і выключэння магчымай адмовы падазронага ці сведак у судзе ад сваіх паказанняў на папярэднім допыце

прысутнічалі панятыя («два шляхціча веры годные»).

Непасрэдны разгляд справы пачынаўся з аб'явы суда аб пачатку судовага працэсу і выкліку ў судовае пасяджэнне бакоў. Першым выкладаў свае пэтрабаванні ісцец, потым адказчык даваў на іх тлумачэнні. Ісцец меў магчымасць адвяргаць пярэчанні адказчыка, а адказчык — сцвярджэнні ісца, Пасля выступлення бакоў, іх адвакатаў, даследавання доказаў, прыняцця прысягі бакоў і сведак суд прыступаў да вынясення рашэння (выраку, дэкрэта). Адкладваць вынясенне рашэння суд мог не больш як на тры дні. Ісцец і адказчык па большасці спраў мелі права падаць апеляцыю ў вышэйшы суд, але аб гэтым яны павінны былі заявіць адразу ў судзе пасля вынясення рашэння. Калі такой заявы не паступала, то пастанова суда набывала законную сілу і падлягала выкананню.

Такім чынам, аналіз норм працэсуальнага права, выкладзеных у Статуце 1588 г., паказвае, што на ўзроўні іх тэарэтычнай распрацоўкі яны на той час былі даволі развітымі, рэгулявалі ўсе асноўныя дзеянні суда і ўдзельнікаў працэсу. Атрымала развіццё новая торыя доказаў, заснаваная на лагічным метадзе іх ацэнкі, пры захаванні фармальных доказаў, што было ўласціва феадальнаму праву. Новая тэорыя грунтавалася на зводнай ацэнцы пісьмовых і рэчавых доказаў, паказанняў бакоў, сведак, гэта значыць на такіх сродках, якія б маглі лагічна пераканаць суддзяў. Хоць гэта тэорыя ў Вялікім Княстве Літоўскім яшчэ не стала дамінуючай, аднак яна значна паўплывала на развіццё тагачаснага і далейшага судаводства.

16. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай

Як мы гаварылі вышэй, па акту Люблінскай уніі Вялікае Княства Літоўскае павінна было зліцца з Польшчай і страціць сваю самасюйнасць. Але згодна з артыкуламі Статута 1588 г. ВКЛ здолела захаваць свой суверэнітэт. Можна сцвярджаць, што ў выніку Люблінскай уніі ў Еўропе ўтварылася новая канфедэратыўная шматнацыянальная дзяржава — Рэч Паспалітая.

Заканадаўчая ўлада ў краіне належала Вальнаму Сойму. Соймы падраздзяляліся на звычанныя, што склікаліся каралём і надзвычайныя. Надзвычайныя соймы мог склікаць кіраўнік каталіцкай царквы ў Рэчы Паспалітай — прымас (арцыбіскуп Гнезненскі) — у выпадку смерці караля або яго адмаўлення ад трона. Для выбрання новага караля

склікаліся тры соймы: канвакацыйны, элекцыйны і каранацыйны. На канвакацыйным сойме вызначалі час і месца выбараў караля, выпрацоўвалі ўмовы дагавора з кандыдатамі на прастол. На элекцыйным сойме праводзілі выбары і заключалі пагадненне «Пакта канвента». Урачыстая каранацыя і прысяга караля ажыццяўляліся на каранацыйным сойме.

Вальны сойм быў двухпалатны і складаўся з Сената і Пасольскай ізбы (палата дэпутатаў). Вышэйшай палатай сойма з'яўляўся Сенат. Сюды ўваходзілі пэўныя вышэйшыя службовыя асобы дзяржаўнага апарату, вярхі каталіцкага духавенства, ваяводы і кашталяны. Колькасць сенатараў даходзіла да 150 чалавек, гэта лічба магла быць большай або меншай, што залежала ад памяншэння ці павелічэння тэрыторыі дзяржавы і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу. Першае месца ў Сенаце займаў Гнезнескі арцыбіскуп, прымас каталіцкай царквы ў Рэчы Паспалітай. За ім сядзелі звычайныя біскупы і толькі потым — свецкія службовыя асобы (кашталяны, ваяводы і г.д.). Такі расклад сенатараў сведчыць аб клерыкальным накірунку ўлады ў Рэчы Паспалітай. Старэйшыя сенатары размяшчаліся ў крэслах, а малодшыя - на лавах. Як пераважыла мінулага, сойм выбіраў з ліку сенатараў 28 чалавек ў Каралеўскую раду тэрмінам на два гады. Сенатары — дарадчыкі караля дзяліліся на чатыры групы (па 7 чалавек у кожнай) і працавалі ў Каралеўскай радзе па шэсць месяцаў.

Ніжэйшай палатай сойма была Пасольская ізба. У яе ўваходзілі прадстаўнікі (паслы-дэпутаты) ад шляхты асобных паветаў, ці земляў канфедэратыўнай дзяржавы, а таксама у невялікай колькасці дэпутаты ад мяшчан найбольш важных у палітычных і эканамічных адносінах гарадоў. Пасольская ізба з цягам часу стала галоўнай часткай сойма. Дэпутаты ў Пасольскую ізбу выбіраліся шляхтай на павятовых соймiках, якія склікаліся ў ВКЛ за шэсць тыдняў да Вальнага сойма. Выбарчая акруга, у залежнасці ад гістарычных умоў складання, ці велічыні сваёй тэрыторыі, пасылала на агульны дзяржаўны сойм ад 1 да 8 паслоў. Агульная колькасць дэпутатаў Пасольскай ізбы залежала ад тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У XVI-XVII ст.ст. яна даходзіла да 200 асоб, а ў сярэдзіне XVIII ст. - да 236.

Вальны сойм склікаўся каралём праз кожныя два гады ў Варшаве. Аднак у сувязі з сепаратысцкім шляхецкім рухам у Вялікім Княстве Літоўскім ў сярэдзіне XVII ст. супраць караля Рэчы Паспалітай Яна Сабескага, Польшча пайшла на ўступкі шляхце ВКЛ і на сойме 1673 г. было прынята рашэнне, каб кожны трэці сойм збіраць у Горадні.

Пачыналася работа сойма ўрачыстым набажэнствам, пасля якога

выбіралі маршалка (старшыню) сойма. Калі сойм адбываўся ў Польшчы, старшынёй яго выбіраўся паляк, калі на Беларусі — ліцвін (па прыналежнасці да дзяржавы ВКЛ). Старшыня абвяшчаў пачатак работы сойма. Пасля праверкі мандатаў дэпутатаў Сенат і Пасольская ізба праводзілі сумесныя пасяджэнні, на якіх урад рабіў справаздачу аб сваёй дзейнасці за два гады, разглядаў прапановы наконт далейшай працы. Потым абедзьве палаты працавалі паасобку. За тыдзень да канца сойма праводзіліся пленарныя пасяджэнні двух палат: Пасольскай ізбы і Сената. Распрацаваныя і зацверджаныя каралём соймавыя пастановы набывалі моц законаў.

Кампетэнцыя Вальных соймаў Рэчы Паспалітай была шырокай. Практычна, сойм меў права вырашаць любыя пытанні дзяржаўнага кіравання і заканадаўства. Такія пытанні, як выбранне караля, скліканне апалчэння, аб'яўленне вайны і заключэнне міру, устанаўленне падаткаў для шляхты на выпадак вядзення вайны адносіліся да выключнай кампетэнцыі сойма. Трэба, аднак, адзначыць, што для прыняцця рашэння на сойме патрабавалася аднагалоснае яго ўхваленне. Даволі было аднаму дэпутату не згадзіцца з яго пастановай і паставіць сваё «veto» («не дазваляю»), як гэта пастанова прыпынялася. Лепшыя людзі Польшчы яшчэ ў XVII ст. рабілі спробу змагацца з гэтым вельмі шкодным для дзяржавы прынцыпам, але не здолелі дабіцца сваёй мэты. Шляхта бачыла ў скасаванні адзінагалосся і вольнага вета памяншэнне сваіх правоў. Акрамя таго, усе дэпутаты з паветаў абавязаны былі дакладна прытрымлівацца інструкцый, атрыманых на павятовых соймiках, што, у сваю чаргу, стварала цяжкасці ў рабоце. Ужо ў 1652 г. шляхціч А.Сіціньскі, які дзейнічаў па ўказанню А.Радзівіла, першы раз сарваў работу сойма, не згадзіўшыся на яго пралангацыю (адтэрміноўку). У далейшым такія бясплённыя соймы здараліся ўсё часцей.

Праўда, у некаторых выпадках, каб пазбегнуць зрыву сойма накладваннем вета, дэпутаты аб'яўлялі свой сойм канфедэрацыяй, і тады рашэнні прымаліся простай большасцю галасоў.

Рашэнні соймаў Рэчы Паспалітай падраздзяляліся на тры групы:

1) тыя, што тычыліся ўсёй канфедэрацыі — аб вышэйшых органах улады, падатках і іншых агульных справах;

2) тыя, што мелі дачыненне да Польшчы;

3) тыя, што мелі сілу ў ВКЛ.

Як правіла, апошнія складалі асобныя соймавыя канстытуцыі. Напрыклад, для кантролю за паступленнем і расходваннем грашовых сродкаў Вялікага Княства Літоўскага па рашэнню сойма ствараўся

адасоблены ад Польшчы Фінансавы трыбунал, які камплектаваўся з прадстаўнікоў ВКЛ. Фінансавая адасобленасць Вялікага Княства захоўвалася да апошніх дзён яго існавання. Да 1775 г. на граніцы з Польшчай дзейнічалі канторы і спаганялася пошліна пры ўвозе і вывазе тавараў.

Пасля Вальнага сойма, дэпутаты склікалі па паветах так званыя рэляцыйныя соймікі, на якіх яны рабілі справаздачы перад сваімі выбаршчыкамі аб рабоце сойма і сваёй дзейнасці на яго сесіях. Гісторыя ведае выпадкі, калі рэляцыйныя соймікі фактычна пераглядалі пытанні, вызначаныя Вальным соймам. Так, калі ў 1671 г. шляхце Берасцейскага павета на рэляцыйным сойміку паведалі, што ў цэнтры на сойме разглядаліся пытанні аб устанаўленні падаткаў і зборы войска, то яна, спасылаючыся на адсутнасць кворуму, не прывяла ў выканакне пастанову Вальнага сойма і адклала соймікавыя дэбаты па гэтых пытаннях. Як бачым, нават Вальны сойм не вырашаў канчаткова тое ці іншае пытанне, таму што кожны соймік паасобку пакідаў за сабой права прыняць сваё рашэнне па яго пастанове. Больш таго, мясцовыя соймікі самастойна рашалі фінансавыя і ваенныя пытанні, зацвярджалі падаткі, выбіралі кандыдатаў на адміністрацыйныя і судовыя пасады. Гэта сведчыць, што ў палітычным рэгуляванні Рэчы Паспалітай пераважалі працэсы дэцэнтралізацыі і нават анархіі, калі ўлічваць, што ў 1582-1762 гг. 40% пасяджэнняў Вальнага сойма было сарвана без прыняцця рашэнняў, а ў XVIII ст. рэдка які Сойм быў выніковым.

Дэцэнтралізацыі садзейнічала і тое, што ў Рэчы Паспалітай адсутнічалі адзіныя выканаўча-распарадчыя органы. Кожная з частак канфедэрацыі, у тым ліку ВКЛ, мела свой асобны адміністрацыйны і судовы апарат, сваю прававую сістэму. Правамоцтвы караля, якія ўсё больш і больш абмяжоўваліся, таксама не садзейнічалі ўзмацненню цэнтралізацыі.

А зараз мэтазгодна больш падрабязна разгледзіць сістэму выканаўчай улады ў Рэчы Паспалітай.

У адпаведнасці з законам краіны на чале выканаўчай улады стаяў кароль, з канца XVI ст. — выбіраемы. Прававое становішча караля рэгулявалася агульнадзяржаўнымі актамі — «Пакта канвента» і «Генрыкаўскімі артыкуламі». Яго дзеянні на тэрыторыі Беларусі і Літвы вызначаліся яшчэ і Статутам 1588 г.

У «Генрыкаўскіх артыкулах» абвяшчалася свабоднае абранне караля, свабода хрысціянскага веравызнання, абавязак склікаць сойм раз у два гады тэрмінам на шэсць тыдняў, не склікаць агульнае апалчэнне (паспалітае рушэнне) без згоды сойма. Без згоды сойма

каралю забаранялася ўстанаўліваць новыя падаткі, пошліны і інш. Прадугледжвалася, што калі кароль дзейнічаў насуперак праву і сваім абавязкам, то шляхта магла адмовіцца ад падпарадкавання каралю і выступіць супраць яго пасля трохразовага папярэджвання з боку прымаса, потым сойміка і, нарэшце, сойма.

Адмовы ад падпарадкавання абвяшчаліся ў выглядзе узброеных канфедэрацый (рокашаў), накіраваных супраць караля (Слуцкая 1767 г., Барская 1768 г., Таргавіцкая 1792 г. і інш.). Такім чынам, ні кароль пры сваім жыцці, ні сойм пры жыцці караля не мелі права намеціць яму наступніка. Гэтым забяспечвалася поўная свабода шляхты пры абранні караля. Сістэматычна, пасля смерці кожнага караля, пачыналася безуладдзе, якое цягнулася ад некалькіх месяцаў да некалькіх гадоў. Таму на перыяд безкаралеўя існавала асобая пасада інтэррэкса, якую звычайна займаў Гнезенскі арцыбіскуп, прымас Польшчы.

Па закону кароль меў права склікаць Вальны сойм і прызначаць тэрмін для его пасяджэння; ад імя караля тварылася правасуддзе; ён прызначаў службовых асоб на ўрадавыя пасады; вёў зносіны з замежнымі краінамі; пасылаў і прымаў паслоў і інш. У сваёй дзейнасці кароль адказваў перад Вальным соймам.

Фактычна ўсё жыццё караля Рэчы Паспалітай было пад кантролем. Нават такія прыватныя факты, як жаніцьба, развод, замежныя паездкі падпадалі пад кантроль сойма.

Такім чынам, Рэч Паспалітую можна вызначыць як моцна абмежаваную манархію. З другога боку, кароль Рэчы Паспалітай быў выбарны, а таму ён хутчэй нагадваў пажыццёвага прэзыдэнта, чым манарха. Прыняўшы пад увагу вышэйсказанае, мы бачым, што Рэч Паспалітая па форме хутчэй падобна на рэспубліку, чым на манархію. Так ацэньвала форму праўлення краіны і дзяржаўнае права, таму што назва «Рэч Паспалітая» у перакладзе значыць «рэспубліка». Уся ўлада ў гэтай рэспубліцы належала Вальнаму сойму і павятовым соймікам, якія складаліся выключна з паноў-магнатаў і шляхты. Ніжэйшыя станы (саслоўі) краіны ніякіх палітычных правоў не мелі і былі безгалоснай, бяспраўнай масай. Таму Рэч Паспалітая фактычна з'яўлялася панскай, шляхецкай рэспублікай без усякіх адзнак дэмакратызму.

17. Спробы ажыццяўлення рэформаў у галіне дзяржаўнага кіравання Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

У сярэдзіне XVIII ст. у Рэчы Паспалітай разгарнулася вострая палітычная барацьба паміж прыхільнікамі рэформаў дзяржаўнага ладу і рэакцыйнымі коламі каталіцкага духавенства і магнатаў. Першыя імкнуліся рэфармаваць феадальны дзяржаўны апарат і прыстасаваць яго да новых эканамічных і палітычных умоў, рэакцыйныя колы жадалі захаваць у недатыкальнасці старыя феадальныя парадкі. Дзейнасць рэфарматараў асабліва актывізавалася пасля смерці ў кастрычніку 1763 г. караля Аўгуста. Так, на канвакацыйным сойме 1764 г. было ўведзена абмежаванне на ўжыванне права «ліберум вета». З гэтага часу рашэнні па эканамічных пытаннях прымаліся большасцю галасоў, а дэпутатам дазвалялася не прытрымлівацца наказаў соймікаў, калі тыя пярэчылі думцы большасці.

У 1764, а затым у 1775 г. у Рэчы Паспалітай уводзіцца абавязковы для ўсіх саслоўяў, у тым ліку шляхты і духавенства, адзіны мытны падатак з адначасовай адменай унутраных пошлін. У 1766 г. усталёўваецца адзіная сістэма мер і вагаў на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай; у 1773 — 1775 гг. фарміруецца адукацыйная камісія, стварэнне якой стала пачаткам рэформы ў галіне асветы. У эканамічнай сферы пэўны станоўчы вынік мелі рэформы А.Тызенгаўза, дзякуючы якім на паўночным захадзе Беларусі з'явілася даволі значная колькасць мануфактур.

Такім чынам, Рэч Паспалітая, якая з 60-х гг. XVIII ст. пачала інтэнсіўна праводзіць рэфармацыйную дзейнасць, пэўна здолела б пераадолець не толькі эканамічны, але і палітычны крызіс.

Зразумела, што першыя памкненні да палітычных рэформаў не задаволілі рэакцыйных магнатаў, якія заўсёды імкнуліся да неабмежаванай улады, а ўладу ў тагачасных абставінах неслі буйным землеўласнікам на сваіх штыках суседнія Расія і Прусія. У верасні 1764 г. яны пасадзілі на каралеўскі трон свайго стаўленіка Станіслава-Аўгуста Панятоўскага і карэкціравалі яго палітычную лінію ў адпаведнасці з папярэдняй дамоўленасцю паміж сабой аб захаванні сілай зброі склаўшагася парадку ў Рэчы Паспалітай.

У другой палове 60-х гг. XVIII ст. Расія і Прусія выкарысталі «дысідэнцкую» праблему, каб яшчэ больш актыўна дыктаваць сваю волю ўладам Рэчы Паспалітай. Перад соймам расійскім бокам было

пастаўлена пытанне аб ураўноўванні ў правах некатолікаў (дысідэнтаў) з католікамі згодна з дагаворам 1686 г. паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Сойм станоўча пытанне не вырашыў. Тады пад патранажам Расіі і Прусіі ў 1767 г. ў Слуцку была створана праваслаўная, а ў Торуні — пратэстанцкая канфедэрацыі, якія ставілі перад сабой задачу дасягнуць роўнасці канфесій у Рэчы Паспалітай. У 1768 г. сойм задаволіў памкненні «дысідэнтаў», а таксама прыняў закон пад назвай «Кардынальныя правы», які замацаваў непахіснасць свабоднага прымянення вета, захавання шляхецкіх правоў і недапушчэння рэформаў дзяржаўнага ладу. Трэба таксама адзначыць, што ў «Кардынальных правах» утрымліваліся нормы, якія пазбаўлялі ўласнікаў маёнткаў права прыгаворваць залежных сялян да пакарання смерцю, устанаўлівалі крымінальную адказнасць шляхціца за забойства простага чалавека на тэрыторыі Польшчы.

У 1768 г. прыхільнікі «залатой» шляхецкай вольнасці пад старшынствам Ю. Пуласкаса арганізавалі ў г. Бары, што на Украіне, канфедэрацыю, якая аб'яднала даволі шырокія колы шляхціцаў-католікаў і заклікала іх да барацьбы за адмену раўнапраўя з праваслаўнымі і пратэстантамі. Барскіх канфедэратаў падтрымала Турцыя, якая пачала вайну з Расіяй. Скарыстаўшы момант, Аўстрыя ў 1769 — 1770 гг. акупіравала частку Польшчы і Украіны, а Прусія — паўночна-заходнюю частку Польшчы і прапанавала Расіі заключыць дагавор аб сумесным падзеле Рэчы Паспалітай. Па першым падзеле (1772 г.) да Расіі адышла Усходняя Беларусь.

Але гэта трагічная падзея не дабавіла палітычнага розуму саперніча ючым магнацкім кланам. Лёс дзяржавы вырашыла ўзяць у свае рукі прагрэсіўная частка шляхты і буржуазіі. Яна ўтварыла палітычны блок, які ўвайшоў у гістарычную літаратуру пад назвай «патрыятычная партыя».

Галоўнай мэтай патрыётаў было ўмацаванне дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай, садзейнічанне буржуазным рэформам у краіне. Кансерватары ў сваю чаргу рабілі ўсё, каб захаваць старыя феадальныя адносіны, шляхецкія прывілеі, існуючы палітычны лад.

Асабліва вялікую дзейнасць патрыятычная партыя разгарнула ў час работы Чатырохгадовага сойма (1788 — 1792 гг.), які аб'явіў сябе канфедэрацыяй, што паралізавала дзеянне прынцыпу «ліберум вета» і ўсе пытанні прымаліся простай большасцю галасоў. Па ініцыятыве патрыётаў было прынята рашэнне аб падаўжэнні паўнамоцтваў сойма яшчэ на два гады і правядзенні дадатковых выбараў дэпутатаў ад паветаў. Так сойм стаў чатырохгадовым. Дадаткова было выбрана

182 дэпутаты, з якіх 112 былі прыхільнікамі патрыётаў. У выніку з 359 дэпутатаў сойма 181 былі прадстаўнікамі шляхецка-буржуазнай патрыятычнай партыі — партыі рэформаў. Каб вырашыць пытанні, мінуючы «ліберум вета», сойм у двайным складзе таксама абвясціў сябе канфедэрацыяй.

Пераўтварэнне дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай Чатырохгадовы сойм пачаў з выкладання асноўных прынцыпаў канстытуцыйнага права, замацаваных у «Кардынальных правах» і прынятых у студзені 1791 г. Невялікі па аб'ёме — усяго 11 артыкулаў — гэты дакумент па сваёй сутнасці быў дэкларацыяй аб прынцыпах існавання Рэчы Паспалітай як самастойнай, незалежнай дзяржавы. Любая чужаземная гарантыя захавання існуючага становішча аб'яўлялася «накіраванай супраць незалежнасці Рэчы Паспалітай». Каб прадухіліць новы падзел, сойм аб'явіў яе недзялімай дзяржавай.

Такім чынам, «Кардынальныя правы» 1791 г., якія ўхваліў сойм, былі накіраваны на адмену «Кардынальных правоў» 1768 г., а гэта значыць на адмову ад старашляхецкіх парадкаў, на прагрэсіўныя змены ў грамадскіх адносінах.

«Кардынальныя правы» надавалі некаторыя канстытуцыйныя правы абывацелям, гэта значыць грамадзянам Рэчы Паспалітай. Так, адначасова з абвяшчэннем каталіцкай рэлігіі дамінуючай, дэкларавалася свабода іншых хрысціянскіх веравызнанняў. Асабліва важнае значэнне мела аб'яўленне такіх грамадзянскіх правоў, як свабода слова і друку, за выключэннем пытанняў, што тычыліся пануючай каталіцкай веры, у інтарэсах якой магла быць устаноўлена цэнзура (арт. 11). Свабоду слова мелі не толькі шляхціцы, якія прымалі ўдзел у пасяджэннях сойма, але і «кожны абывацель на публічных з'ездах». Абвяшчэнне свабоды «думак, запісаных, або надрукаваных з подпіссю імя свайго» значна падрывала ідэалагічнае панаванне каталіцкай царквы. «Кардынальнымі правамі» Рэч Паспалітая аб'яўлялася прававой дзяржавай, у якой вяршэнства належыць толькі закону, прынятаму соймам. «Ніякая ўлада нікога не можа абавязаць выконваць распараджэнні, якія не адпавядаюць праву, і не можа дазваляць сабе і іншым таго, што забараняе права, не будзе ігнараваць тое, што права абавязвае выконваць».

Буржуазны характар рэформаў выявіўся ў Законе аб соймiках ад 24 сакавіка 1791 г. і Законе аб гарадах ад 21 красавіка 1791 г. Па законе ад 24 сакавіка выбарчае права атрымлівала толькі аседлая шляхта не маладзей за 24 гады. Як бачым, гэты заканадаўчы акт быў накіраваны на абмежаванне доступу ў соймікі мала- і немаёмаснай

шляхты, якую падкуплялі і выкарыстоўвалі для прыняцця ў сойме выгадных ім рашэнняў буйныя магнаты.

Відавочна, што ў аснову закона быў пакладзены не саслоўны, а класавы прынцып, характэрны для буржуазнага выбарчага права. Па Законе «Гарады нашы каралеўскія свабодныя ў дзяржавах Рэчы Паспалітай» мяшчане атрымалі такое ж права асабістай недатыкальнасці, як і беларуска-літоўская шляхта па Статуце 1588 г.. Закон пашырыў правы мяшчан, даў ім магчымасць прадстаўляць свае інтарэсы ў соймавых камісіях, прычым пры разглядзе пытанняў, што тычыліся гарадоў, яны мелі рашаючы голас, а ў астатніх выпадках — дарадчы. Мяшчанам дазвалялася займаць ніжэйшыя пасады ў дзяржаўных установах і судах, а таксама працаваць адвакатамі. Яны атрымалі права набываць маёнткі, населеныя залежнымі сялянамі, а ўладальнікі маёнткаў коштам звыш 2 тыс. злотых маглі ўводзіцца соймам у шляхецкае званне, што стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця і збліжэння мяшчан са шляхтай і дазволіла ўмацаваць палітычныя пазіцыі прадстаўнікоў патрыятычнай партыі, якія засядалі ў сойме. Пашырэнне сацыяльнай базы патрыётаў дало ім магчымасць яшчэ больш энергічна праводзіць рэформы дзяржаўнага ладу.

Такім чынам, у перыяд са студзеня па красавік 1791 г. у выніку плённай заканадаўчай дзейнасці сойма быў прыняты шэраг законаў, якія ўвайшлі ў якасці складанай часткі ў Канстытуцыю 3 мая.

Праект Канстытуцыі быў прадстаўлены на абмеркаванне сойма 3 мая 1791 г. — у першы дзень пасля велікодных канікулаў (вакацый). Каля замка ў Варшаве, дзе засядаў сойм, былі выстаўлены вайсковыя фарміраванні, якія падтрымлівалі рэфарматараў, а на вуліцы выйшлі гараджане. У залу пасяджэнняў сойма прыбылі і прадстаўнікі мяшчан, што азначала пашырэнне сацыяльнай базы прыхільнікаў Канстытуцыі. У выніку з 150 прысутных членаў сойма толькі адзін сенатар і 27 паслоў прагаласавалі супраць прыняцця Канстытуцыі.

Канстытуцыя складалася з прэамбулы і 11 раздзелаў. Пануючай рэлігіяй у дзяржаве аб'яўляўся каталіцызм, прадстаўнікам іншых канфесій гарантавалася свабода выканання рэлігійных абрадаў. За шляхтай прызнаваліся ўсе палітычныя і эканамічныя правы і яе вяршэнства ў жыцці краіны. Закон аб гарадах аб'яўляўся часткай Канстытуцыі, што давала некаторыя правы буржуазіі. Сяляне заставаліся ў прыгоннай залежнасці. Чацвёртым раздзелам Канстытуцыі ім было гарантавана толькі заступніцтва закона і ўрада краіны.

Канстытуцыя ўносіла змяненні ў некаторыя інстытуты ўлады і

дзяржаўнага ўпарадкавання Рэчы Паспалітай. У суадносінах са сваімі ўяўленнямі аб справядлівым грамадстве патрыёты абвясцілі дэмакратычны прынцып падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую (раздзел V).

Па новай Канстытуцыі заканадаўчая ўлада належала двухпалатнаму пастаянна дзеючаму сойму, які выбіраўся на два гады. Палата дэпутатаў складалася з 204 дэпутатаў (паслоў), якія выбіраліся на павятовых соймiках. Сенат, які складаўся з азначанага кола свецкіх і духоўных службовых асоб пад старшынствам караля, налічваў 132 чалавекі. Закон, прыняты ў Палаце дэпутатаў, перадаваўся ў Сенат, які мог яго ўхваліць або адкласці да паўторнага пасяджэння сойма. У такім выпадку абедзве палаты збіраліся разам і рашэнне прымалася простай большасцю галасоў (раздзел VI).

Канстытуцыяй адмянялася права «ліберум вета», забараняліся ўсялякія канфедэрацыі. Галоўны прынцып, на якім будавалася дзейнасць сойма, заключаўся ў тым, што дэпутаты — прадстаўнікі ўсяго народа, а не толькі свайго павета, і таму павінны клапаціцца аб агульных інтарэсах грамадства. Сойму былі прадастаўлены вельмі шырокія паўнамоцтвы. У прыватнасці, ён разглядаў усе праекты законаў наогул, гэта значыць праекты канстытуцыйных, грамадзянскіх, крымінальных законаў, а таксама тых, што тычыліся ўстанаўлення пастаянных і часовых падаткаў; праекты соймавых пастаноў аб канчатковай ратыфікацыі саюзных і гандлёвых дагавораў, вайне, міры і г.д.

Выканаўчая ўлада належала цэнтральнаму для ўсёй Рэчы Паспалітай ураду, у які ўваходзілі кароль як старшыня, кіраўнік каталіцкай царквы прымас і пяць міністраў: паліцыі, унутраных і замежных спраў, ваенны і фінансаў. Міністраў прызначаў кароль. Умацаванню дзяржавы, на думку аўтараў рэформаў, павінна было садзейнічаць устанаўленне спадчыннай манархіі. Таму каралеўская ўлада аб'яўлялася спадчыннай, але толькі ў межах адной дынастыі.

Кароль надзяляўся шырокімі паўнамоцтвамі. Ён быў вышэйшым распараджальнікам усіх узброеных сіл дзяржавы, прызначаў і здымаў службовых асоб органаў дзяржаўнага кіравання, сенатараў, біскупаў. Аднак усе акты караля патрабавалі подпісу адпаведнага міністра, які і адказваў перад соймам за дадзены акт. У выпадку, калі міністр не згаджаўся падпісаць рашэнне, пытанне пераносілася на разгляд сойма.

Стварэнне адзінага для ўсёй Рэчы Паспалітай ўрада ператварала канфедэратыўны лад у федэрацыю, садзейнічала цэнтралізацыі дзяржавы і ўмацоўвала аўтарытэт цэнтральных органаў улады і кіравання.

Канстытуцыя мела прагрэсіўнае для свайго часу значэнне. Яна карэнным чынам змяніла структуру вышэйшых органаў улады; сойм стаў сапраўды заканадаўчым і кантралюючым органам у дзяржаве; была зроблена спроба ажыццявіць прынцып парламенцкага спосабу кіравання. Але палажэнні Канстытуцыі не былі ўведзены з-за непрыняцця іх рэакцыйнай польскай шляхтай, асабліва арыстакратыяй, якая 19 мая 1792 г. абвясціла Таргавіцкую канфедэрацыю дзеля захавання «рэспубліканскай формы і шляхецкіх вольнасцей». Лідэры канфедэрацыі уступілі ў перамовы з Кацярынай II «аб вызваленні Рэчы Паспалітай ад спадчыннасці трона і Канстытуцыі 3 мая».

Царскі ўрад накіраваў на дапамогу таргавічанам 100-тысячную армію, што прывяло да іх хуткай перамогі. У студзені 1793 г. Прусія дамовілася з Расіяй аб другім падзеле Рэчы Паспалітай, у выніку якога да Расіі далучалася цэнтральная частка Беларусі, на якой была ўтворана Мінская губерня.

Сойм Рэчы Паспалітай, які сабраўся ў чэрвені 1793 г. у Гародні, прызнаў другі падзел дзяржавы, а таксама адмяніў Канстытуцыю 3 мая і прыняў новую, асноўны змест якой заключаўся ў наступным: аднаўляліся Пастаянны савет і выбарнасць кароля; сойм заставаўся вышэйшым заканадаўчым органам краіны, які павінен быў склікацца кожныя чатыры гады на восем тыдняў; рашэнні ў сойме прымаліся большасцю галасоў; кароль меў права вета на соймавыя рашэнні, якія тычыліся асноўных законаў. Аднак і гэта Канстытуцыя засталася на паперы, бо Рэч Паспалітая страчвала сваю незалежнасць.

Пасля паражэння паўстання пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі Аўстрыя, Прусія і Расія ў 1795 г. правялі трэці падзел Рэчы Паспалітай. Да Расіі адышлі Заходняя Беларусь, а таксама Літва, Курляндыя і частка Заходняй Украіны. Прусія і Аўстрыя падзялілі паміж сабой Польшчу.

18. Кароткі агляд права Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.

У другой палове XVI — XVIII ст. галоўнай крыніцай права на Беларусі, як і ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім, з'яўляўся III Статут Вялікага княства Літоўскага. У сувязі з тым, што пасля прыняцця Люблінскай уніі ўтварылася канфедэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая, пачалі рабіцца шматлікія спробы ўнесці ў яго змены.

Справа ў тым, што Статут 1588 г. насуперак акту Люблінскай уніі заканадаўча аформіў захаванне Вялікага княства Літоўскага як дзяржавы. Складальнікі новага Статута нібы не заўважылі ці не зразумелі акта уніі аб уключэнні ВКЛ у склад Польшчы, а таму прадстаўнікі апошняй патрабавалі ўнясення паправак у некаторыя артыкулы, асабліва ў тыя, што забаранялі іншаземцам займаць пасады і набываць землі ў Вялікім княстве Літоўскім. Польская шляхта лічыла, што гэтыя артыкулы супярэчаць акту Люблінскай уніі і павінны быць скасаваны. Аднак дамаганні кароннай шляхты былі адхілены і змест Статута некаторы час заставаўся без карэнных змяненняў. Аднак з цягам часу прымаліся новыя законы, якія дапаўнялі Статут або нават уносілі ў яго змены. Напрыклад, калі ў 1668 г. быў выдадзены закон, па якім за адыход ад каталіцкай веры вінаватыя караліся канфіскацыяй маёмасці і выгнаннем з дзяржавы, то нормы гэтага акта распаўсюджваліся і на тэрыторыю княства Літоўскага. Па законе 1733 г. праваслаўныя і пратэстанты былі пазбаўлены права быць дэпутатамі сойма і суддзямі Галоўнага трыбунала. Згодна з соймавай пастановай у канцы XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім у якасці дзяржаўнай замест беларускай абвяшчалася польская мова.

Важнай крыніцай права ў XVIII ст. становіцца звод законаў пад назвай «Валюміна легум» («Кніга законаў»), у якім былі сабраны соймавыя пастановы, прывілеі і іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы, Вялікага княства Літоўскага і Правабярэжнай Украіны да 1793 — 1795 гг. Упершыню 8 тамоў «Валюміна легум», у якіх сабраны акты за 1347 — 1779 гг., былі выдадзены ў Варшаве ў 1732 — 1782 гг.

Такім чынам, у гэтым выданні былі змешчаны нарматыўна-прававыя акты, якія дзейнічалі, і тыя, што фактычна страцілі юрыдычную сілу.

Дарэчы, «Валюміна легум» — неафіцыйнае выданне і не з'яўляецца поўным зборам законаў. Побач з актамі з арыгінальных крыніц у гэты зборнік уключаны і дакументы, якія былі змешчаны ў працах асобных аўтараў. Для вывучэння гісторыі дзяржавы і права Вялікага княства Літоўскага асаблівую каштоўнасць маюць акты «Валюміна легум» аб дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання і ўлады, сацыяльна-эканамічным становішчы насельніцтва.

Значэнне крыніцы права мелі таксама акты, якія былі змешчаны ў якасці дадатка да Статута 1588 г. і выдадзены на польскай мове ў 1648, 1693, 1744 і 1786 гг. У тэксце трэцяга Статута Вялікага княства Літоўскага выдання 1786 г. былі змешчаны закон аб утварэнні

Галоўнага трыбунала і каментарыі да яго, алфавітна-прадметны ўказальнік і некаторыя соймавыя пастановы XVIII ст.

Найбольш значныя змяненні права адносяцца да другой паловы XVIII ст., асабліва да перыяду дзейнасці Чатырохгадовага сойма, які зацвердзіў Канстытуцыю 3 мая 1791 г.

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай па наказе Кацярыны II ад 28 мая 1772 г. на ўключанай у склад Расіі тэрыторыі былі створаны Пскоўская і Магілеўская губерні. Устанаўлівалася, што «суд і расправа» ў гэтых землях, якія тычацца асабістых спраў, павінны разглядацца на падставе мясцовых «законаў і звычаяў і іх моваю», гэта значыць — па Статуце 1588 г. «Справы ж, што парушалі спакой і цішыню грамадзян», падлягалі разгляду ва ўстановах, «кои от власти верховной на то устроены».

Такім чынам, крыніцамі права ў Пскоўскай і Магілеўскай губернях па найбольш важных крымінальных справах, асабліва па справах аб дзяржаўных злачынствах, з'яўляліся Саборнае ўлажэнне 1649 г., «Артыкул воінскі» і іншыя акты расійскай дзяржавы. Дакладнага размежавання, па якіх крымінальных справах прымяняліся нормы Статута 1588 г., а па якіх — рускае заканадаўства, не было. Указам Сената ад 8 мая 1773 г. у далучаных да Расійскай Імперыі дзвюх беларускіх губернях ствараліся губернскія і правінцыяльныя суды. Суддзі гэтых судоў выбіраліся шляхтай, якая мела не менш 10 сялян мужчынскага полу, а выбранымі маглі быць шляхціцы, якія мелі не менш чым 20 сялян. Змяняўся час пасяджэнняў земскіх судоў. Яны павінны былі разглядаць справы толькі ў чатыры восеньска-зімовыя месяцы (з 1 лістапада па 1 сакавіка). Указам Сената ад 28 жніўня 1772 г. забаранялася прадаваць беларускіх сялян без зямлі, бо «белорусское шляхетство издавна не имело сего в обыкновении».

Далучэнне ўсходніх раёнаў Беларусі да Расіі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай выклікала неабходнасць унесці змены ў парадак разгляду спраў у Галоўным судзе ВКЛ (трыбунале). Згодна з соймавай пастановай 1775 г. ён павінен быў праводзіць свае сесіі замест Вільні, Менска і Наваградка толькі ў Вільні і Гародні. Пачатак Віленскай сесіі Галоўнага суда ўстанаўліваўся 15 лістапада, Гарадзенскай — 1 мая.

Сойм Рэчы Паспалітай у 1786 г. змяніў тэрміны правядзення сесій земскіх судоў. Так, суды Менскага і Берасцейскага ваяводстваў павінны былі разглядаць справы на адной сесіі з 1 кастрычніка да 31 студзеня замест трох сесій, якія прадугледжваліся Статутам. Змяняліся тэрміны правядзення сесій земскіх судоў і ў іншых ваяводствах і паветах.

19. Судовыя ўстановы і права Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст.

Трэба адзначыць, што судовая сістэма Беларусі захавала шэраг адметнасцей. Так, вышэйшым судом у заходніх губернях быў Галоўны суд, падзелены на два дэпартаменты — крымінальных і цывільных спраў. Членамі і засядацелямі суда маглі быц толкі дваране, якія выбіраліся на павятовых дваранскіх сходах тэрмінам на тры і адзін год адпаведна. Галоўны суд, як правіла, выконваў свае функцыі ў якасьі апеляцыйнага суда па скаргах на пастановы гродскага, земскага і падкаморскага судоў. Ён таксама разглядаў некаторыя справы па першай інстанцыі. Апеляцыі на рашэнні Галоўнага суда падаваліся ў Сенат.

У губернях Беларусі існаваў і так званы маршалкаўскі камісарскі суд. Ён ствараўся па рашэнні Галоўнага суда для разглядаў скаргаў на прыгаворы падкаморскага суда па зямельных спрэчках. Маршалкаўскі камісарскі суд складаўся з павятовага маршалка і некалькіх членаў, якія выбіраліся бакамі па узаемнай згодзе.

Асноўным тыпова саслоўным дваранскім судом першай інстанцыі быў земскі павятовы суд. У яго ўваходзілі суддзя, два падсудкі і пісар, якія выбіраліся дваранамі на тры гады. У яго кампетэнцыі знаходзіліся ўсе крымінальныя справы, за выключэннем тых, якія уваходзілі ў сферу дзейнасці Галоўнага і гродскага судоў. Земскі павятовы суд разглядаў і некаторыя грамадзянскія справы. Апеляцыі на рашэнні земскага дваранскага суда падаваліся ў Галоўны суд на працягу шасці тыдняў.

У пачатку XIX ст. члены павятовых земскіх судоў пачалі выбірацца на падставе агульнага закону Расійскай Імперыі, які быў прыняты 7 кастрычніка 1775 г.. Прэтэндэнты на пасаду членаў земскага павятовага суда выбіраліся тэрмінам на тры гады. Царызм скараціў кола асоб, якія мелі права ўдзельнічаць у выбарах. Бедныя шляхцічы гублялі права ўдзельнічаць у дваранскіх выбарах. Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі царскі ўрад кіраваўся не толькі саслоўным прынцыпам, але і класавым для таго, каб камплектаваць мясцовыя суды найбольш вернымі рэжыму чыноўнікамі.

Пры разглядзе некаторых крымінальных спраў павятовым земскім судам прадпісвалася карыстацца нараўне з нормамі Статута Вялікага княства Літоўскага і агульнымі законамі Расійскай Імперыі.

Царскі ўрад прыняў шэраг указаў, якія карэнным чынам мянялі парадак прывядзення ў выкананне прыгавораў і рашэнняў павятовага земскага суда. Калі па Статуце 1588 г. яно праводзілася возным і

гродскім судамі, то ў XIX ст. «исполнительная часть во всех губерниях, на особенных правах оставленных, от судной отделена» і рэгулявалася агульнымі законамі Расійскай Імперыі. Па гэтай прычыне «судебные приговоры в губерниях, от Польши возвращенных, приводнть в исполнение в городах полициям, а в уездах — нижним земским судам».

Усе справы аб зямельных спрэчках знаходзіліся ў кампетэнцыі падкаморскага суда. Справы ў гэтым судзе разглядаў адзін суддзя-падкаморый непасрэдна на спрэчным зямельным участку. Рашэнне прыводзілася ў выкананне праз абазначэнне мяжы ўчастка. У дапамогу падкаморыю выбіраўся адзін каморнік (землямер), які ў выпадку адсутнасці падкаморыя сам разглядаў справу падкаморскага суда і выносіў рашэнне. Апеляцыі на рашэнні падкаморскага суда падаваліся ў Галоўны суд.

Акрамя названых судовых устаноў у першай трэці XIX ст. у заходніх губернях (Віленскай і Гродзенскай) працавалі гродскія суды. Іх членамі былі гродскі суддзя, падсудак і пісар. Усе яны зацвярджаліся на пасады генерал-губернатарам або губернатарам. Пасяджэнні гродскага суда праходзілі штомесячна на працягу двух тыдняў.

Гродскі суд разглядаў у асноўным крымінальныя справы. Апеляцыі на рашэнні гродскага суда падаваліся ў Галоўны суд. Разам з судовай дзейнасцю гродскі суд выконваў і шэраг адміністрацыйных функцый.

Судовая дзейнасць гарадскога магістрата была даволі абмежаванай. Ён разглядаў нязначныя грамадзянскія (аб спагнанні пазыкі па вэксалі, аб прыналежнасці зямельнага ўчастка і г.д.) і крымінальныя (аб пабоях, знявазе, самаўпраўстве і інш.) справы.

Пасля няўдалага паўстання 1830—1831 гг. на Беларусі пачалася ліквідацыя старой судовай сістэмы і яе уніфікацыя. У 1831 г. замест галоўных судоў у губернях былі створаны палаты крымінальнага і цывільнага судоў, земскія і гродскія пераўтвораны ў павятовыя, усё судаводства пераведзена на рускую мову. Нагляд за дзейнасцю мясцовых судоў выконвалі генерал-губернатары і губернатары, якія мелі права адмяняць іх пастановы. Вышэйшай касацыйнай інстанцыяй для ўсіх судоў стаў Сенат.

У канцы XVIII — першай трэці XIX ст. на тэрыторыі заходніх губерняў галоўнай крыніцай права заставаўся Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г.

Суды, якія дзейнічалі на Беларусі ў гэты перыяд, выкарыстоўвалі нормы як Статута, так і агульнаімперскага права. Аднак у 1831 г. прымяненне дзейнасці першага было скасавана ў Віцебскай і Магілёўскай, а ў 1840 г. — у Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях.

Варта памятаць, што адмена Статута 1588 г. азначала прыпыненне дзеяння толькі той часткі мясцовага права, якая да гэтага часу ўжывалася толькі на тэрыторыі Беларусі. Што тычыцца значнай часткі нормаў дзяржаўнага і некаторых іншых галін права, то з часу ўваходжання заходніх губерняў у склад Расіі яны фактычна не дзеннічалі, хаця пэўнага заканадаўчага акта, адмяніўшага такія нормы, выдадзена не было.

У 1826 г. пад кіраўніцтвам М.М. Сперанскага пачалася работа па падрыхтоўцы Звода законаў Расійскай Імперыі. У гэты ж час было прынята рашэнне пачаць падрыхтоўку Звода мясцовых законаў заходніх губерняў, які меркавалася ўключыць у агульны Звод законаў Расійскай Імперыі. Яго падрыхтоўкай кіраваў вядомы беларускі вучоны-юрыст І. Даніловіч.

У структурных адносінах праект Зводу мясцовых законаў распадаўся на тры часткі. У першай разглядалася прававое становішча розных катэгорый насельніцтва (шляхты, духавенства, сялянства і мяшчанства). Другая частка была прысвечана шлюбна-сямейнаму і грамадзянскаму праву. У галіне сямейнага права ўплыў мясцовых нормаў права найбольш бачны ў адносінах атрымання спадчыны, парадку і ўмоў заключэння шлюбаў паміж асобамі каталіцкай веры, а ў сферы грамадзянскага права — у адносінах да сервітутаў, некаторых інстытутаў абавязацельнага права. Больш за ўсё ўплыў мясцовага права адчуваецца ў трэцяй частцы Зводу мясцовых законаў, дзе выкладзены судовы лад і судаводства па пэўнай катэгорыі грамадзянскіх спраў (актаратавы працэс). Былі спрошчаныя правілы падсуднасці па грамадзянскіх справах, істотна адрозніваліся парадак іх разгляду на судовым пасяджэнні і выканання і абскарджання судовых рашэнняў. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што праект Зводу мясцовых законаў Заходніх губерняў — апошняя найбольш значная сістэматызацыя мясцовага права, у якой спалучаліся рысы мясцовага і агульнарасійскага права.

Праца па падрыхтоўцы Зводу мясцовых законаў у асноўным была завершана ў 1834 г., але па некаторых раздзелах вялася яшчэ да 1837 г. Аднак гэты Звод не быў уведзены ў дзеянне як асобны закон, а ў Агульнаімперскі звод законаў былі ўключаны толькі яго асобныя нормы. Прычынай гэтага стала тое, што пасля паўстання 1830—1831 гг. царскі ўрад перайшоў ад палітыкі лавіравання да прамога выкаранення праяўленняў нацыянальна-вызваленчага руху ў рэгіёнах, якія былі далучаны да Расіі ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай. У дзяржаўна-прававой сферы гэта выявілася ў скасаванні апошніх

рэшткаў судовай, адміністрацыйнай і прававой аўтаноміі заходніх губерняў. На тэрыторыі Беларусі былі ўведзены адміністрацыйная і судовая сістэмы, аналагічныя адпаведным сістэмам Расійскай Імперыі.

20. Рэформа 1861 г. Мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання і самакіравання пасля адмены прыгоннага права

Беларусь сярэдзіны XIX ст. уяўляла сабой аграрны рэгіён, эканамічнае становішча якога вызначала сельская гаспадарка. Асноўную масу насельніцтва (72,3 %) складалі сяляне, якія падзяляліся на памешчыцкіх і дзяржаўных.

Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі за кошт памяншэння сялянскіх надзелаў пашыралі панскую ворную зямлю і пераводзілі сялян з аброку на паншчыну (у 50-я гг. на ёй было звыш 90 % сялян).

На ўзмацыенне эксплуатацыі беларускае сялянства адказвала супраціўленнем. Толькі ў перыяд 1858 — 1860 гг. на Беларусі адбылося больш за 40 сялянскіх выступленняў. Урад Аляксандра II, разумеючы, што ў грамадстве склалася выбуховая сітуацыя і прадухіліць яе можна толькі скасаваннем прыгоннага права, пачаў падрыхтоўку сялянскай рэформы ў заходніх губернях. На думку царскага ўрада, памешчыкі гэтага рэгіёна былі найбольш падрыхтаваны да скасавання прыгону ў сувязі з тым, што многія з іх у сярэдзіне XIX ст. ужо былі ўцягнуты ў рынкавыя таварна-грашовыя адносіны.

Было распрацавана спецыяльнае "Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях, в губерниях: Виленской, Гродненской, Ковенской, Минской и части Витебской". У Магілёўскай і васьмі паветах Віцебскай губерні землеўпарадкаванне сялян праводзілася па «Местному положению для великорусских, новороссийских и белорусских губерний».

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў адобраныя Дзяржаўным саветам заканадаўчыя акты (палажэнні) аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці, і Маніфест аб адмене прыгоннага права. У адпаведнасці з законам памешчыкі пазбаўляліся права распараджацца селянінам, які атрымліваў асабістую волю і ўсе правы. У прыватнасці, ён мог сам звяртацца ў дзяржаўныя ўстановы, заключаць гандлёвыя і іншыя здзелкі, пераязджаць у горад, запісвацца ў саслоўі мяшчан і

купцоў, паступаць на службу ці ў навучальную ўстанову.

Паводле «Палажэнняў 19 лютага» ўся зямля маёнткаў абвяшчалася ўласнасцю памешчыкаў. Селяніну давалася ў карыстанне пэўная колькасць ворнай зямлі, аднак ён не з'яўляўся яе ўласнікам, а да заключэння выкупной здзелкі знаходзіўся ў стане часова-абавязанага і выконваў на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці ў выглядзе паншчыны або аброку.

Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі, у якіх указваліся памеры зямельнага надзелу і павіннасці за яго

Набыццё сялянамі зямель ва ўласнасць ажыццяўлялася праз выкуп. Выкуп жа асабістай свабоды ажыццяўляўся шляхам завышэння цаны за зямлю. На Беларусі яна была ў 3 — 4 разы большай, чым сярэдняя рынкавая. Неабходных для выкупу грошай у сялян не было, а памешчыкі хацелі атрымаць іх адразу. Выйсце з такога становішча знайшоў урад: пры выкупе сяляне плацілі 20 % адпаведнай сумы, а астатнія 80 % памешчыкам давала дзяржава. Сяляне, такім чынам, рабіліся яе даўжнікамі на 49 гадоў і павінны былі выплочваць так званыя выкупныя плацяжы з вялікімі працэнтамі за пазыку.

Умовы адмены прыгоннага права не былі прыняты беларускім сялянствам і паслужылі штуршком да развіцця шырокага сялянскага руху, кульмінацыяй якога стала паўстанне пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага. Яно было задушана, аднак царскі ўрад быў вымушаны пайсці на ўступкі. 1 сакавіка 1863 г. выйшаў указ аб адмене часоваабавязаных адносін у Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветах Віленскай губерні, а праз тры месяцы ён быў распаўсюджаны на Магілёўскую і беларускія паветы Віцебскай губерні. З 1 мая 1863 г. абавязковыя адносіны паміж сялянамі і памешчыкамі спыняліся, выкупныя плацяжы за надзельную зямлю зніжаліся на 20 %. Сяляне пераходзілі ў разрад сялян-уласнікаў і павінны былі ўносіць выкупныя плацяжы ў павятовыя казначэйствы.

Такім чынам, у 1863 г. феадальныя адносіны ў Беларусі былі ліквідаваны шляхам спынення часоваабавязанага становішча сялян, што стварыла ўмовы для больш хуткага развіцця капіталістычных адносін.

Аднак наяўнасць перажыткаў, перш за ўсё буйнога памешчыцкага землеўладання, вызначыла для Беларусі павольны, паступовы («прускі») шлях буржуазна-аграрнай эвалюцыі, дзякуючы чаму буйная памешчыцкая гаспадарка, якая перарастала ў буржуазную, надоўга захавала свае прыгонніцкія рысы.

Пасля рэформы 1861 г. адбыліся значныя змены ў мясцовых органах дзяржаўнага кіравання і самакіравання. У дапаўненне да старога дзяржаўнага паліцэйскага апарату стварапіся новыя органы ўлады і пасады: у губернях — губернскія па сялянскіх справах установы («присутствия»); у паветах — міравыя пасрэднікі і павятовыя міравыя з'езды, з 1874 г. — павятовыя па сялянскіх справах установы і з 1889 г. — земскія ўчастковыя начальнікі і іх павятовыя з'езды; у валасцях — валасныя сходы, валасны старшыня, валасное праўленне, валасны сялянскі суд; у сёлах — сельскі сход, сельскі старастат.

Губернскія па сялянскіх справах установы разглядалі скаргі на дзейнасць міравых пасрэднікаў і іх павятовых з'ездаў, кантралявала пагадненні паміж памешчыкамі і сялянамі аб зямельных надзелах, а таксама вырашалі іншыя пытанні, якія тычыліся ажыццяўлення рэформы.

У кожным павеце назначаліся тры — пяць участковых міравых пасрэднікаў, якія займаліся правядзеннем рэформы ў жыццё. Пасрэднікамі маглі быць дваране, якія мелі не менш 500 дзес. зямлі або 150 дзес. зямлі і дыплом аб заканчэнні навучальнай установы з правам на чын XII класа. Яны прызначаліся губернатарамі і зацвярджаліся Сенатам. Галоўныя функцыі, якія выконвалі міравыя пасрэднікі, — складанне і зацвярджэнне ўстаўных грамат аб умовах землеўпарадкавання паміж памешчыкамі і сялянамі, разгляд спрэчак паміж імі, а таксама скаргаў на валасных службовых асоб. У іх кампетэнцыі былі і некаторыя судова-паліцэйскія справы (аб патравах, парубках лесу і інш.).

У састаў павятовага з'езда міравых пасрэднікаў уваходзілі міравыя пасрэднікі павета, павятовы прадвадзіцель (старшыня) і прызначаны губернатарам чыноўнік. Павятовы з'езд разглядаў скаргі на рашэнні міравых пасрэднікаў.

Міравыя пасрэднікі дзейнічалі да 27 чэрвеня 1874 г. Затым іх функцыі былі перададзены новаўтвораным павятовым установам («присутствиям») па сялянскіх справах.

У 1889 г. павятовыя «присутствия» былі скасаваны і іх паўнамоцтвы перададзены земскім участковым начальнікам. Земскі начальнік прызначаўся на тры — чатыры воласці і наглядаў за сялянамі і ўсімі сельскімі ўстановамі. Ён мог судзіць сялян, адмяняць пастановы валаснога суда. Дзеянні земскага начальніка можна было абскарджваць у павятовы з'езд земскіх начальнікаў, а пастановы з'езда — у губернскае «присутствие».

«Палажэнні 19 лютага» прадугледжвалі новы парадак кіравання

сялянамі, што быў заснаваны на выбарнасці ніжэйшых службовых асоб. Жыхары сельскай грамады выбіралі на сходзе старасту, сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных дзесяці двароў на валасных сходах — валасное праўленне, валаснога старшыню і суддзю.

Валасное праўленне складалася са старшыні, усіх сельскіх старастаў і зборшчыкаў падаткаў. Асобнае месца займаў валасны пісар, які не выбіраўся сялянамі, а прызначаўся праўленнем і фактычна вырашаў большасць валасных спраў.

Гэтыя органы павінны былі выконваць усё, што патрабавалі ад іх урадавыя чыноўнікі. Да ліку галоўных абавязкаў сельскіх улад адносіліся раскладка і збор падаткаў, кантроль за выкананнем сялянамі шматлікіх павіннасцей, рэгуляваныне пазямельных узаемаадносін сялян, арганізацыя ў вёсцы паліцэйскай службы (соцкія, дзесяцкія) і г.д.

21. Судовая, земская і гарадская рэформы

Развіццё капіталістычных адносін, адмена прыгоннага права выклікалі патрэбу змены ўсёй судовай сістэмы краіны, яе дэмакратызацыі. Судовая рэформа пачала праводзіцца ў жыццё ў 1864 г.

Асноўныя палажэнні рэформы адлюстраваны ў чатырох заканадаўчых актах: «Учреждение судебных установлений», «Устав уголовного судопроизводства», «Устав гражданского судопроизводства» і «Устав о наказаниях, налагаемых мировыми судьями». У аснову рэформы была пакладзена тэорыя падзелу улад. Судовыя статуты абвясцілі аддзяленне суда ад адміністрацыі, увядзенне агульнага ўсесаслоўнага суда, роўнасць усіх перад судом, нязменнасць суддзяў і следчых, выбарнасць міравых суддзяў і прысяжных засядацеляў, галоснасць, вуснасць, непасрэднасць і спаборнасць судовага працэсу, права абвінавачанага на абарону. Важным вынікам рэформы стала заснаванне адвакатуры для абароны па крымінальных і прадстаўніцтва інтарэсаў старон па цывільных справах.

З мэтай нагляду за судамі, следствам і месцамі зняволення была рэарганізавана пракуратура, якая змяняла напрамак сваёй дзейнасці. З органа кантролю за вытворчасцю спраў у сферы кіравання («око государства») яна ператваралася ў орган абвінаваўчай улады. «Прокуратура есть постоянное судебно-административное учрежденне, состоящее из лиц, назначенных от правительства и обязанных по долгу

службы охранять законы и преследовать преступников во имя общественных интересов...».

Згодна з законам ствараліся дзве судовыя сістэмы: мясцовыя і агульныя суды. Да мясцовых належалі міравыя суды і з'езды міравых суддзяў, да агульных — акружныя суды (ад аднаго да трох на губерню) і судовыя палаты (адна на некалькі губерняў).

З'езд міравых суддзяў быў судом другой інстанцыі і разглядаў апеляцыйныя скаргі на пастановы міравых суддзяў. Міравым судам былі падсудныя цывільныя справы пры цане іска да 500 руб. і крымінальныя, па якіх прадугледжваліся арышт да трох месяцаў, грашовае спагнанне да 300 руб. ці заключэнне ў работны дом да аднаго года.

Акруговы суд, як правіла, складаўся з цывільнага і крымінальнага аддзяленняў, а апошняе — з кароннага суда і суда прысяжных засядацеляў. Акруговым судам былі падсудныя ўсе крымінальныя справы за выключэннем палітычных і пэўных службовых злачынстваў.

Крымінальныя справы разглядаліся з удзелам прысяжных засядацеляў. Каронныя суддзі прызначаліся царом па прадстаўленні міністра юстыцыі пажыццёва. Яны павінны былі мець вышэйшую юрыдычную адукацыю і стаж працы ў праваахоўных органах не менш як тры гады. Узначальваў акруговы суд старшыня, а аддзяленнямі кіравалі яго намеснікі.

Судовыя палаты дзейнічалі як суды другой інстанцыі ў адносінах да акруговых судоў. Аднак крымінальныя справы, якія разглядаліся з удзелам прысяжных засядацеляў, апеляцыйнаму перагляду не падлягалі. Па некаторых крымінальных справах, напрыклад па палітычных, судовыя палаты маглі дзейнічаць як суд першай інстанцыі.

Акруговыя суды Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губерняў падпарадкоўваліся Віленскай судовай палаце. Магілёўскі акружны суд быў аднесены да сферы дзейнасці Кіеўскай, а Віцебскі — Пецярбургскай судовай палаты.

Вышэйшым органам судовага нагляду, касацыйным і вярхоўным судом у Расіі з'яўляўся правячы Сенат, які ўключаў два дэпартаменты — цывільны і крымінальны. З канца XIX ст. Сенат займаўся абнародаваннем і тлумачэннем законаў, мог выдаваць адміністрацыйныя распараджэнні.

Аналізуючы судовую рэформу, трэба заўважыць, што ў яе правядзенні на тэрыторыі Беларусі выявіліся спецыфічныя асаблівасці. Да апошніх адносіліся: сувязь судовай рэформы з палітыкай царызму, накіраванай на падаўленне польскага нацыянальна-вызваленчага руху;

увядзенне судовых статутаў па частках; адкрыццё мясцовых і агульных судоў у розны час. Па палітычных прычынах судовая рэформа на Беларусі пачалася, па сутнасці, толькі ў 1872 г., калі былі ўведзены міравыя суды, а акруговыя суды з інстытутамі прысяжных засядацеляў былі ўтвораны ў заходніх губернях аж у 1882 г.

Свае асаблівасці меў і парадак фарміравання судовых органаў Беларусі. Па законе міравы суддзя павінен быў выбірацца на павятовым земскім сходзе са спісу кандыдатаў, які папярэдне зацвярджаў губернатар. Згодна з «Временными правилами об устройстве мировых судебных установлений в губерниях: Виленской, Ковенской, Гродненской, Киевской, Волынской, Подольской, Минской, Витебской и Могилевской, впредь до введения земских учреждений» ад 23 чэрвеня 1871 г. міравыя суддзі не выбіраліся, а прызначаліся ўрадам. Як сведчыць адзначаны нарматыўны акт, у беларускіх губернях гэта былі памешчыкі, якія заслугоўвалі поўнага даверу ў сувязі з адсутнасцю тут да 1911 г. земстваў. На Беларусі прызначаліся і ганаровыя суддзі. Акрамя таго, абмяжоўваўся ўдзел мясцовага апалячанага дваранства ў дзейнасці міравых і акружных судоў, а таксама ўразаліся правы асоб іўдзейскага веравызнання пры фарміраванні саставу прысяжных засядацеляў і разглядзе пэўных катэгорый спраў у акружных судах з удзелам прысяжных засядацеляў.

Тым часам, нягледзячы на згаданыя акалічнасці, судовая рэформа была найбольш паслядоўнай з усіх буржуазных рэформаў 60—70-х гг. XIX ст.

Як было адзначана, Беларусь у XIX ст. уяўляла сабой аграрны рэгіён, асноўную масу жыхароў якога складалі сяляне. Таму мэтазгодна сказаць некалькі слоў аб сялянскім валасным судзе, які выбіраўся штогод валасным сходам у складзе 4—12 суддзяў. Валасному суду былі падсудныя справы па спрэчках паміж сялянамі, а таксама па нязначных крымінальных або адміністрацыйных правіннасцях. Ён меў права прысуджаць сялян да сямі дзён арышту, караць дубцамі да 20 удараў, штрафаваць да 3 руб., прыгаворваць да грамадскіх работ да шасці дзён. Такім чынам, валасны сялянскі суд дзейнічаў на аснове традыцый і нормаў звычаёвага права, санкцыянаванага дзяржавай, што было пераемнасцю сярэдневякоўя.

1 студзеня 1864 г. было выдадзена «Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах», згодна з якім утвараліся губернскія і павятовыя земскія сходы як распарадчыя ўстановы і губернскія і павятовыя ўправы — як выканаўчыя.

Земскія ўстановы ствараліся для кіраўніцтва мясцовай

гаспадаркай, народнай асветай, медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва і іншымі сферамі грамадска-культурнага жыцця. Выбары тут праводзіліся на аснове маёмаснага цэнзу па трох курыях — памешчыцкай, гарадской і сялянскай. Для сялян выбары былі шматступеннымі — сельскі і валасны сходы, павятовы з'езд.

На Беларусі земская рэформа не праводзілася аж да пачатку XX ст. у сувязі з тым, што царскі ўрад пасля паўстання 1863 — 1864 гг. не давяраў мясцовым апалячаным памешчыкам, якія складалі пераважную большасць у краі і пры выбарах зёмскіх устаноў па законе 1864 г. маглі захапіць іх у свае рукі. Дапусціць такога царызм ніяк не мог. На ўтварэнне выбарных земстваў, прычым у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях і па спецыяльным выбарчым законе, урад адважыўся толькі ў 1911 г .Згодна з указам ад 14 сакавіка 1911 г. аб ажыццяўленні ў беларускіх губернях «Палажэння аб земствах з некаторымі папраўкамі і змяненнямі» сельская грамада магла пасылаць у выбарчыя сходы паветаў не больш як адну трэць усіх гласных, а ў выбарчыя сходы губерняў — толькі аднаго сялянскага гласнага ад кожнага павета.

Паводле ўказа ад 14 сакавіка 1911 г., што быў уведзены ў парадку прымянення артыкула 87 Асноўных Дзяржаўных Законаў, выбаршчыкі падзяляліся на дзве курыі: польскую і рускую. Законам істотна ўрэзваліся правы апалячанага насельніцтва Беларусі па фарміраванні земскіх устаноў і ўдзелу ў іх працы; амаль поўнасцю адхіляліся ад удзелу ў земствах асобы іудзейскага веравызнання. Быў уведзены даволі высокі маёмасны цэнз: у выбарах маглі ўдзельнічаць сяляне, якія мелі не менш 75 — 125 дзес. зямлі, і гараджане, якія валодалі нерухомай маёмасцю коштам не ніжэй чым 750 — 7500 руб. Каб колькасна ўзмацніць «рускую курыю», у яе склад уключаліся нават багатыя немцы, латышы і інш.

Што тычыцца структуры і кампетэнцыі земскіх губернскіх і павятовых сходаў і ўпраў, то губернатарам і міністру ўнутраных спраў было дадзена права прыпыняць выкананне іх распараджэнняў, «калі яны супярэчылі законам ці дзяржаўнай карысці». Такая фармулёўка заканадаўства давала магчымасць губернатарам прыпыняць практычна любое рашэнне земстваў.

Рэформа гарадскога самакіравання, паводле «Гарадавога палажэння» ад 16 чэрвеня 1870 г., пачалася на Беларусі толькі ў 1875 г. Яна грунтавалася на буржуазным прынцыпе ўсесаслоўных выбараў органаў кіравання пры адпаведным маёмасным цэнзе. Выбарным правам карысталіся ўсе плацельшчыкі гарадскіх падаткаў. Яны выбіралі на пэўны тэрмін членаў гарадской думы (гласных), якія

фарміравалі свой выканаўчы орган — гарадскую ўправу. Старшынстваваў у гарадскіх думе і ўправе гарадскі галава. Дзейнасць гэтых органаў рэгулявалася губернскімі па гарадскіх справах установамі, падначаленымі губернатарам.

Такім чынам, калі характарызаваць мясцовае кіраванне Беларусі ў перыяд капіталізму, то неабходна вылучыць спецыфічныя рысы, якія адрозніваюць яго ад управлення ва ўнутраных раёнах Расійскай Імперыі.

Так, мясцовыя павятовыя прадвадзіцелі дваранства не выбіраліся, а прызначаліся Сенатам са згоды міністра ўнутраных спраў. Большасць адміністрацыйных і судовых пасад займалі рускія дваране праваслаўнага веравызнання. Пры аналізе права, якое існавала на тэрыторыі Беларусі ў перыяд развіцця капіталізму, трэба адзначыць і тое, што ў гэты час мясцовае права было амаль поўнасцю заменена правам Расійскай Імперыі. Толькі ў грамадзянскім праве яшчэ захоўваліся некаторыя мясцовыя асаблівасці (чыншавае карыстанне нерухомай маёмасцю, некаторыя сервітуты і інш.).

22. Першы усебеларускі з'езд і абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі

З першых дзён Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі на Беларусі пачалі стварацца новыя органы ўлады. У ноч з 3 на 4 сакавіка 1917 г. у Мінску адбылася нарада прадстаўнікоў гарадской думы, губернскага і павятовага земстваў, а таксама іншых уплывовых дзеячаў, мэтай якой было стварэнне замест губернскага праўлення новага органа ўлады. На нарадзе быў створаны Камітэт грамадскага парадку і бяспекі як орган мясцовай улады, які падпарадкоўваўся Часоваму ўраду ў Петраградзе.

У гэты ж час у Мінску быў створаны Савет рабочых дэпутатаў і выбраны яго выканаўчы камітэт. Пачалі стварацца рабочыя, сялянскія і салдацкія саветы і камітэты ў іншых гарадах, паветах, валасцях і воінскіх часцях.

Разам з тым уладныя функцыі на Беларусі ў значнай ступені захоўваліся ў руках ваеннага камандавання, таму што ў Мінску знаходзіўся штаб Заходняга фронту, а ў Магілёве — Стаўка Вярхоўнага камандавання. Тэрыторыя Беларусі, не акупіраваная германскімі войскамі, была аб'яўлена на ваенным становішчы.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі фактычна ўстанавілася не двоеўладдзе, як у цэнтры Расіі, а троеўладдзе — улада органаў Часовага ўрада, Саветаў і ваеннага камандавання.

Усе гэтыя ўлады варожа адносіліся да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, а значыць, і да нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння. Таму з мэтай аб'яднання сіл ужо 25 — 27 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся першы з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый як правага, так і левага кірунку, на якім быў выбраны выканаўчы орган — Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) у складзе 18 чалавек, што прадстаўлялі розныя нацыянальна-дэмакратычныя партыі і рухі. З'езд даручыў Камітэту пачаць распрацоўку канстытуцыі Беларускага краёвага ўрада. Разам з тым з'езд выказаўся за гатоўнасць падтрымаць Часовы ўрад Расіі і заявіў аб неабходнасці перадачы выканаўчай улады на тэрыторыі Беларусі Беларускаму нацыянальнаму камітэту, а таксама аб прадастаўленні аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі.

З 8 па 10 ліпеня 1917 г. у Мінску быў праведзены другі з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім замест БНК была абрана Цэнтральная рада беларускіх аргаізацый. Рада па сваіх поглядах была больш дэмакратычнай, чым БНК. Яна паставіла перад Часовым урадам пытанні аб утварэнні ў Беларусі органаў мясцовай улады, а таксама аб арганізацыі беларускіх нацыянальных вайсковых фарміраванняў. Аднак гэтыя прапановы Часовы ўрад адхіліў.

На аснове рашэнняў вайсковых з'ездаў у Мінску была створана Цэнтральная вайсковая беларуская рада (ЦВБР). Для каардынацыі дзеянняў у кастрычніку 1917 г. Цэнтральная рада беларускіх арганізацый была пераўтворана ў Вялікую беларускую раду, куды ўвайшлі і дзеячы ЦВБР. Галоўная задача, якую паставіла перад сабой Вялікая беларуская рада, заключалася ў скліканні Усебеларускага з'езда для канчатковага вырашэння пытання аб беларускай дзяржаўнасці.

Адразу пасля кастрычніцкіх (1917 г.) падзей у Петраградзе бальшавікі Заходняга фронту ўзялі ў свае рукі ўладу ў Мінску і стварылі свой Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і Заходняга фронту (Аблвыканкамзах), які рашуча выступіў супраць беларускага нацыянальнага дзяржаўнага самавызначэння. Яго лідэры на гэтым этапе прытрымліваліся ідэі стварэння ўнітарнай савецкай дзяржавы. У сувязі з гэтым, прызнаючы ўладу Саветаў у Расіі, Вялікая беларуская рада не прызнавала ўладу Аблвыканкамзах — на тэрыторыі Беларусі.

30 лістапада 1917 г. прадстаўнікі розных партый і рухаў, якія

ўваходзілі ў Вялікую беларускую раду, выступілі з адозвай «Да ўсяго беларускага народа», у якой аб'явілі сваю палітычную праграму. У ёй прадугледжвалася абвяшчэнне Беларусі дэмакратычнай рэспублікай; федэрацыі Беларусі з Расіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі з адпаведным размежаваннем правоў «краёвых і федэральных улад»; перадачы ўсёй улады ў Беларусі Краёвай радзе, якая павінна была выбірацца на аснове роўнага, тайнага і прапарцыянальнага галасавання. У адозве гаварылася пра неадкладнае надзяленне сялян зямлёй, ахову ўсіх каштоўнасцей краю. фарміраванне беларускага войска. Для арганізацыі улады ў цэнтры і на месцах меркавалася 5 снежня 1917 г. склікаць у Мінску з'езд прадстаўнікоў усяго беларускага народа.

Ідэю Усебеларускага з'езда падтрымаў Беларускі абласны камітэт (БАК) пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў у Петраградзе. Дазвол на правядзенне з'езда даў і ўрад У.І.Леніна, а наркам па нацыянальных справах І.В.Сталін выдзеліў на яго правядзенне 50 тыс. рублёў і паабяцаў, што рашэнні форуму будуць прызнаны савецкай уладай.

1 Усебеларускі з'езд праходзіў 5—17 снежня 1917 г. у Мінску. З 1872 дэлегатаў 1167 мелі права рашаючага голасу, 705 — дарадчага.

Па сацыяльным складзе дэлегаты прадстаўлялі галоўным чынам сялян, рабочых, сярэднія і ніжэйшыя слаі інтэлігенцыі; па нацыянальным — галоўным чынам беларусаў.

Па сваім прадстаўніцтве і складзе з'езд быў паўнамоцным органам у вырашэнні пытання аб стварэнні краёвай улады. Тая частка дэлегатаў, якая прадстаўляла беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух, выступала за самавызначэнне Беларусі па прыкладзе еўрапейскіх буржуазна-дэмакратычных дзяржаў. На гэтых пазіцыях стаялі многія прыхільнікі Рады. Другая частка, што далучылася да бальшавікоў, адстойвала беларускую нацыянальную дзяржаўнасць у форме аўтаноміі ў рамках РСФСР. За такі шлях самавызначэння выступалі прадстаўнікі Беларускага абласнога камітэта пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў у Петраградзе (пераважна эсэры). У выніку з'езд выказаўся за стварэнне беларускай рэспублікі ў складзе Расійскай Федэрацыі, прычым становішча і правы гэтай рэспублікі вызначаліся асобым юрыдычным статусам.

Канчатковае вырашэнне пытання аб канстытуіраванні беларускай дзяржаўнасці з'езд ускладаў на беларускі ўстаноўчы з'езд. «Усебеларускі з'езд, — гаварылася ў яго рэзалюцыі, — замацоўваючы сваё права на самавызначэнне, заваяванае Расійскай рэвалюцыяй, і пацвярджаючы

дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі дзеля захавання цэласнасці Беларусі ў складзе Расійскай Федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі, пастанавіў вылучыць са свайго Савета орган краёвай улады ў асобе Усебеларускага Савета Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых дэхіутатаў, якому ўручыць кіраванне Беларуссю аж да склікання Беларускага Устаноўчага Сходу».

З прававога пункту гледжання рэзалюцыя з'езда аб стварэнні органа краёвай улады (у ходзе работы з'езда была выбрана яго Рада) з'яўляецца сведчаннем таго, што дадзены форум беларускага народа ставіў паза законам Аблвыканкамзах. Гэта паслужыла падставай для правядзення Саўнаркамам Заходняй вобласці рэзкай палітычнай акцыі супраць з'езда, якая атрымала розныя ацэнкі: СНК Заходняй вобласці называў яе «роспуск», Савет Усебеларускага з'езда Саветаў — «разгон», прэсса — «закрыццё».

У ноч з 17 на 18 снежня ў зале пасяджэнняў з'езда з'явіліся ўзброеныя салдаты. Яны арыштавалі многіх дэлегатаў. Гэтым актам Аблвыканкамзах перапыніў працэс стварэння на Беларусі нацыянальнага органа савецкай улады. Такія дзеянні адпавядалі агульнаму курсу бальшавікоў Заходняй вобласці ў студзені 1918 г. адобрыў III Усерасійскі з'езд Саветаў,а разгон Усебеларускага з'езда у нейкай ступені паслужыў правобразам разгону Усерасійскага ўстаноўчага сходу.

Аднак члены прэзідыума Усебеларускага з'езда не падпарадкаваліся рашэнню СНК Заходняй вобласці. 18 снежня 1917 г. яны правялі падпольнае пасяджэнне ў дэпо Лібава-Роменскай чыгункі, на якім выбралі выканкам рады з'езда на чале з лідэрам народніцкага крыла БСГ Ф.Грыбам. Выканкам рады з'езда паставіў задачу падрыхтоўкі ўзброенай барацьбы за ідэалы беларускай дзяржаўнасці, а таксама паслаў сваю дэлегацыю ў Брэст, дзе ішлі перагаворы паміж кайзераўскай Германіяй і Савецкай Расіяй. Але ні тым, ні другім бокам яна афіцыйна не была прынята.

Перагаворы ў Брэсце былі сарваны. 18 лютага 1918 г. германскае камандаванне аддало загад аб наступленні. Не маючы сіл арганізаваць абарону Мінска, Аблвыканкамзах і СНК Заходняй вобласці 19 лютага 1918 г. эвакуіраваліся ў Смаленск. Выканкам Усебеларускага з'езда звярнуўся да народаў Беларусі з першай устаўной граматай, у якой яшчэ да склікання Устаноўчага сойма (з'езда) аб'явіў сябе часовай

уладай на Беларусі. Да адкрыцця сойма выканаўчыя функцыі ўскладаліся на створаны выканкамам Народны сакратарыят (урад), старшынёй якога стаў лідэр правага крыла БСГ Я.Я.Варонка. У склад урада ўвайшло 15 народных сакратароў, што прадстаўлялі БСГ, эсэраў і сацыял-сіяністаў.

У першай устаўной грамаце падкрэслівалася, што «беларускі народ павінен здзейсніць сваё права на поўнае самавызначэнне, а нацыянальныя меншасці — на нацыянальна-персанальную аўтайомію. Правы нацыі павінны знайсці сваё здзяйсненне шляхам склікання на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму».

9 сакавіка 1918 г. выканкам Усебеларускага з'езда прыняў другую ўстаўную грамату, у якой аб'явіў Беларусь «у рубяжох расьсяленьня і лічбавай перавагі беларускага народу» народнай рэспублікай — БНР. Выканкам быў перайменаваны ў Раду БНР, прэзідыум якой узначаліў прадстаўнік БСГ І.М.Серада. Рада аб'яўлялася заканадаўчым органам да склікання Устаноўчага з'езда, дэлегаты якога выбіраліся на аснове роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права. Выбіраць і быць выбранымі маглі ўсе грамадзяне незалежна ад роду заняткаў, нацыянальнай прыналежнасці і веравызнання.

Выканаўчым органам аб'яўляўся Народны сакратарыят, які назначала Рада і які быў адказны перад ёй. Другой устаўной граматай дэкларавалiся дэмакратычныя правы і свабоды (слова, друку, сходаў і г.д.), адмянялася прыватная ўласнасць на зямлю з перадачай яе без выкупу тым, хто яе апрацоўваў. У межах БНР усім народам давалася права на нацыянальна-персанальную аўтаномію, кожны народ атрымліваў права карыстацца сваёй мовай.

Як бачым, першая і другая устаўныя граматы павінны былі стаць першымі заканадаўчымі актамі, якія фіксавалі асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ўладкавання Беларусі, вызначалі яе тэрыторыю, правы і свабоды грамадзян, а таксама формы ўласнасці, хоць дакладнай сацыяльна-палітычнай арыентацыі не выражалі.

3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй і кайзераўскай Германіяй быў заключаны Брэсцкі мірны дагавор. У артыкулах Брэст-Літоўскага дагавора Беларусь выступала аб'ектам, а не суб'ектам міжнародна-прававых адносін, яна не прызнавалася самастойным нацыянальным рэгіёнам Расійскай Імперыі і не мела свайго наймення.

Будучы бяссільнай змяніць умовы Брэсцкага дагавора, фракцыя БСГ, кіруючыся другой устаўной граматай, выступіла з ідэяй абвяшчэння незалежнасці БНР у этнічных межах пражывання беларусаў.

У сувязі з гэтым 25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады, дзе прысутнічала і дэлегацыя Віленскай беларускай рады, пасля доўгіх спрэчак паміж абаронцамі суверэнітэту і прыхільнікамі аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі большасцю галасоў была прынята трэцяя ўстаўная грамата, якой абвяшчалася незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі і якая па задуме яе складальнікаў як бы завяршала працэс самавызначэння і канчаткова канстытуіравала стварэнне беларускай нацыянальнан дзяржаўнасці. БНР абвяшчалася ў межах этнічнага пражывання і колькаснай перавагі беларускага народа. У грайаце Рада дабівалася перагляду ўмоў Брэсцкага міру, патрабавала, каб БНР самастойна падпісала мірнае пагадненне з урадамі германа-аўстрыйскага боку і Савецкай Расіі.

Першымі незалежнасць БНР прызналі ўрад Украінскай Народнай Рэспублікі і Літоўская Тарыба.

Але Германія не прызнала БНР. На пасланыя Народным сакратарыятам тры граматы рэйхсканцлер паведаміў, што Берлін разглядае не акупіраваную Германіяй частку Беларусі як частку Савецкай Расіі і што, зыходзячы з умоў Брэсцкага дагавора, без згоды ўрада Леніна ён прызнаць новаўтвораную дзяржаву не можа. Што ж датычыць акупіраванай часткі, то яна, маўляў, — аб'ект інтарэсаў Польшчы, прызнанай Германіяй.

Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі Расія дэнансавала Брэсцкі мір і рушыла Чырвоную Армію на Захад. Не маючы ўзброеных сіл і прызнання з боку буйнейшых дзяржаў свету, Рада БНР не змагла арганізаваць супраціўлення. 10 снежня 1918 г. Чырвоная Армія ўвайшла ў Мінск. Большасць членаў Рады і ўрада пакінулі сталіцу і спыніліся ў Гродне, дзе заставаліся да пачатку красавгка 1918 г., гэта значыць да адыходу з Беларусі германскіх войскаў.

Паспрабуем падвесці вынікі сказанага. Па-першае, трэцяя ўстаўная грамата, прынятая 25 сакавіка 1918 г. на сесіі Рады БНР, пры ўсім яе значэнні толькі дэкларавала незалежнасць Беларусі, застаючыся на самой справе толькі палітычнай акцыяй. Праўда, у той час і гэта было даволі сур'ёзным дасягненнем.

Па-другое, нельга адмаўляць, што Рада БНР і яе Народны сакратарыят, прэтэндуючы на ролю заканадаўчага і выканаўчага органаў, стварылі пэўную палітычную структуру з зародкам дзяржаўнай арганізацыі.

Разам з тым у юрыдычным сэнсе БНР дзяржавай не стала. Наяўнасць самастойнай дзяржаўнасці прадугледжвае не толькі

абвяшчэнне тых ці іншых афіцыйных дэкларацый, але і функцыяніраванне рэальнай сістэмы органаў улады на пэўнай тэрыторыі, выпрацоўку і прыняцце законаў, іх рэалізацыю, гэта значыць праватворчую дзейнасць, выкананне кантрольных функцый, гарантыю забеспячэння правоў і свабод сваіх грамадзян. Усё гэта адсутнічала, таму БНР з'яўлялася толькі зародкавай формай, магчымай перспектывай дзяржаўнага ўтварэння. Хоць рэспубліка і абвяшчалася ў этнічных межах пражывання беларусаў, сваю юрысдыкцыю на гэтай тэрыторыі яна не ажыццяўляла. Пагранічных падзелаў і службы не было, як не было і арміі. Адсутнічала фінансавая сістэма, не сфарміраваліся органы ўлады на месцах.

Урэшце, у БНР не было і канстытуцыі ў поўным сэнсе гэтага слова. Функцыі ўрада абмяжоўваліся ажыццяўленнем паўнамоцтваў нацыянальнага ўрада пры германскай акупацыйнай адміністрацыі і рашэннем шэрага задач у культурнаасветніцкай сферы, а таксама ў галіне развіцця мясцовай прамысловасці і гандлю.

Неабходна сказаць яшчэ пра адзін бок пытання. Абвяшчэнне ў лютым — сакавіку 1918 г. Беларускан Народнай Рэспублікі трэба разглядаць і як акт самаабароны, як зварот да сусветнай грамадскасці з заявай аб імкненні беларускай нацыі да самавызначэння, бо пагроза тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі ішла з боку не толькі Германіі, але і Польшчы, якая імкнулася да адраджэння польскай дзяржавы ў межах 1772 г., гэта значыць да поўнай інкарпарацыі Беларусі. У пашырэнні сваіх межаў былі зацікаўлены і літоўскія палітыкі. Паўднёвыя паветы (Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі, Гомельскі) былі ўключаны ў склад Украінскай Народнай Рэспублікі. Усходнія землі, не акупіраваныя Германіяй, засталіся пад юрысдыкцыяй Савецкай Расіі. Абвяшчэнне БНР змяніла адносіны суседзяў да беларускіх тэрыторый як да земляў «нічыйных».

З прычыны неспрыяльных для Беларускай Народнай Рэспублікі знешнепалітычных і ўнутраных абставін, а таксама адарванасці яе дзеячаў і партый ад народа, захопленага ідэяй Саветаў, набыццё ёю ўсіх прыкмет дзяржавы так і засталося нядзейсненай марай. Але тым не менш прыняцце акта аб незалежнасці БНР, дзейнасць яе Рады актывізавалі рост нацыянальнай самасвядомасці, прымусілі бальшавіцкі ўрад У.І.Леніна перагледзець сваю палітыку ў адносінах Беларусі і пайсці на стварэнне хоць і абмежаванай у правах, але ўсё ж беларускай савецкай дзяржаўнасці.

23. Утварэнне БССР. Стварэнне Літоўска-Беларускай Рэспублікі

У сярэдзіне лютага 1919 г. Чырвоная Армія замацавалася на лініі Вільня — Ліда — Слонім — Агінскі канал — Сарны. Такім чынам, амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі аднавілася савецкая ўлада. Пры гэтым праблема беларускай дзяржаўнасці яшчэ больш абвастралася ў сувязі з развязваннем грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыяй у Савецкай Расіі.

У кіруючых колах Савецкай Расіі, Аблвыканкамзаха і беларускіх камуністычных секцыях погляды на перспектывы дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі былі рознымі. У кіраўніцтве Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) і Аблвыканкамзаха лічылі, што Беларусь павінна ўваходзіць у склад РСФСР у якасці яе адміністрацыйна-тэрытарыяльнай гаспадарчай адзінкі. Кіраўнікі Цэнтральнага бюро (ЦБ) беларускіх секцый пры РКП(б) і Белнацкама пры Наркамаце па справах нацыянальнасцей РСФСР выступалі за тое, каб Беларусь увайшла ў склад РСФСР на правах аўтаноміі. Лідэры БНР, якія адстойвалі поўны суверэнітэт Беларусі, цяпер апынуліся ў эміграцыі і фактычна сышлі з палітычнай сцэны.

24 снежня 1918 г. Пленум ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб абвяшчэнні БССР. Пленум даручыў Паўночна-Заходняму абкаму разгарнуць падрыхтоўчую работу па нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве на Беларусі.

Аналізуючы палітыку ЦК РКП(б) у адносінах да працэсу самавызначэння Беларусі ў канцы 1918 — пачатку 1919 г. можна пагадзіцца з акадэмікам І.М.Ігнаценкам, які прыйшоў да наступнага вываду: «Ваенна-палітычнае становішча патрабавала ўтварэння БССР, каб зачыніць тым самым акно для пранікнення імперыялістычных сіл непасрэдна на тэрыторыю Расіі. ЦК РКП(б) меркаваў, што ўтварэнне БССР менавіта ў гэты час будзе садзейнічаць умацаванню міжнароднага становішча Савецкай краіны, абароне рэвалюцыі і савецкай улады».

30 снежня 1918 г. у Смаленску для абмеркавання пытання аб утварэнні БССР і КПБ Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) склікаў VI Паўночна-Заходнюю абласную канферэнцыю РКП(б), якая і прыняла рэзалюцыю «Аб абвяшчэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». У склад БССР уключаліся Мінская, Гродзенская, Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні. Паўночна-Заходняя арганізацыя РКП(б) была перайменавана ў КП(б)Б і

заставалася, як і ўсе іншыя нацыянальна-тэрытарыяльныя партыйныя арганізацыі, складаной часткай РКП(б). Гэта канферэнцыя аб'явіла сябе 1 з'ездам КП(б)Б.

ЦК КП(б)Б сумесна з кіраўніцтвам беларускіх камуністычных секцый вызначылі персанальны склад Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі на чале з Дз.Ф.Жылуновічам.

1 студзеня 1919 г. у Смаленску быў абнародаваны Маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага савецкага ўрада, які абвясціў утварэнне БССР і асноўныя палажэнні дзяржаўнага статуса рэспублікі. Уся ўлада перадавалася Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў; зямля, воды, нетры, фабрыкі абвяшчаліся ўласнасцю народа. Усе законы, дагаворы, пастановы, загады і распараджэнні «як рады і яе слуг, так таксама і нямецкіх, польскіх і ўкраінскіх акупацыйных улад лічацца несапраўднымі».

5 студзеня 1919 г. сталіцай БССР стаў Мінск, куды пераехаў і Часовы ўрад.

З прававога пункту гледжання працэдура стварэння дзяржавы і ўтварэння яе ўладных органаў на аснове рашэння парторганаў можа лічыцца нелегітымнай. Аднак на тым этапе РКП(б) праз Саветы ўжо ажыццяўляла ўсе ўладныя функцыі і такія рашэнні не толькі мелі юрыдычную сілу, але і станавіліся нормай.

Задачу ж надання легітымнасці гэтым актам вырашыў Усебеларускі з'езд Саветаў, на якім меркавалася прыняць Канстытуцыю рэспублікі, зацвердзіць герб і сцяг, выбраць ЦВК.

Аднак у перыяд падрыхтоўкі з'езда, 16 студзеня 1919 г., ЦК РКП(б) прыняў рашэнне аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў і аб'яднанні часткі БССР, што засталася, з Літоўскай ССР. У рашэнні было запісана: «ЦК лічыць гэта рашэнне найбольш адпавядаючым нашым агульна-палітычным задачам і цалкам адпавядаючым міжнароднай кан'юнктуры».

У снежні 1918 г. Ю. Пілсудскі заявіў, што польская дзяржава будзе аднаўляцца ў межах Рэчы Паспалітай 1772 г., а гэта значыць, што ў яе склад павінны ўвайсці беларускія і літоўскія землі.

Рашэнне, прынятае ЦК РКП(б) і асабіста У.І. Леніным 16 студзеня 1919 г., было выклікана імкненнем захаваць РСФСР як дзяржаву і як правобраз будучай сусветнай Рэспублікі Саветаў. Адсюль і ленінскія пасылкі аб інтэрнацыянальным абавязку працоўных Беларусі змякчыць удар імперыялізму па РСФСР і яго ідэя стварэння Літоўска-Беларускай ССР, прызванай, як меркавалася, стаць дзяржавай-буферам паміж буржуазнай Польшчай і Савецкай Расіяй, прадухіліць адкрытую вайну паміж імі.

Жадаючы адстаяць цэласнасць тэрыторыі Беларусі, ЦК КП(б)Б для перагавораў аб межах накіраваў у Маскву членаў ЦБ Р.В.Пікеля і І.І.Райнгольда. 31 студзеня 1919 г. яны далажылі: «Свярдлоў сказаў нам, што ЦК прыняў рашэнне адзінагалосна і іншае рашэнне немагчыма"(маецца на ўвазе рашэнне аб тэрыторыі, якая адышла ад Расіі).

Захаваўся пратакольны запіс сустрэчы Р.В. Пікеля і І.І. Райнгольда з У.І. Леніным. Выслухаўшы іх, старшыня СНК РСФСР адказаў, што рэспубліка буферная і патрэбна пастолькі, паколькі мяжуе з іншымі краінамі. Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні не мяжуюць з іншымі краінамі, таму іх можна выключыць са складу Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Такім чынам, у інтарэсах сусветнай пралетарскай рэвалюцыі (як аказалася, уяўнай) было спынена нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі.

2—3 лютага 1919 г. у Мінску праходзіў Усебеларускі з'езд Саветаў у складзе 230 дэлегатаў, на якім Я.М. Свярдлоў зачытаў пастанову Прэзідыума УЦВК «Аб прызнанні незалежнасці БССР». Тут жа па прапанове Я.М.Свярдлова было прынята рашэнне аб аб'яднанні БССР з Літоўскай ССР.

Акрамя таго, з'езд прыняў Канстытуцыю БССР, якая поўнасцю адпавядала Канстытуцыі РСФСР 1918 г. і зыходзячы з прынцыпу «класавай дэмакратыі» дэкларавала правы працоўнага і эксплуатуемага народа, вызначала структуру органаў улады і кіравання.

Згодна з арт. 6 Канстытуцыі, вышэйшым органам улады ў БССР аб'яўляўся Усебеларускі з'езд Саветаў, а ў перыяд паміж імі — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК), які выбіраўся з'ездам. ЦВК Беларусі з'яўляўся вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантралюючым органам БССР (арт. 23). Функцыі ўрада ўскладаліся на Вялікі прэзідыум, які фарміраваўся ЦВК (арт. 27, 29). У адрозненне ад Канстытуцыі РСФСР Канстытуцыя БССР не прадугледжвала стварэння СНК. Такая структура была ўзята ад Заходняй вобласці. Гэта гаворыць пра тое, што Беларусь паранейшаму жадалі разглядаць як адміністрацыйную адзінку РСФСР.

Ядро Вялікага прэзідыума склалі былыя «абласнікі» пад кіраўніцтвам А.Ф.Мяснікова.

Некаторыя даследчыкі лічаць, што калі б не было БНР, то не існавала б і БССР. У прыватнасці, прафесар Л. Лойка піша: «...Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) і дзейнасць яе

кіруючых органаў падштурхнулі бальшавіцкі ўрад у Маскве да фармальнага прызнання права беларускага народа на самавызначэнне і нацыянальную дзяржаўнасць»

27 лютага 1919 г. адбылося аб'яднанне Літвы і Беларусі ў адзіную Літоўска-Беларускую ССР. Старшынёй ЦВК новай дзяржаўнай структуры са сталіцай ў Вільні стаў К.Г.Цыхоўскі, а СНК узначаліў В.С.Міцкявічус-Капсукас. Літоўска-Беларуская ССР аб'яднала Мінскую, Гродзенскую, Віленскую, Ковенскую і частку Сувалкаўскай губерні з насельніцтвам больш за 4 млн чалавек. У жніўні 1919 г. яе тэрыторыя поўнасцю была акупіравана польскімі войскамі.

Фармальна ЛітБел праіснавала да ліпеня 1920 г., калі адбылося другое абвяшчэнне БССР.

24. Другое абвяшчэнне БССР

14 мая 1920 г. Чырвоная Армія перайшла ў контрнаступленне. Аднак поспех прынесла толькі наступленне ў ліпені 1920 г., а 11 ліпеня быў вызвалены Мінск.

Пры такіх абставінах 12 ліпеня 1920 г. у Маскве быў заключаны мірны дагавор паміж буржуазнай Літвой і РСФСР. Разлічваючы на перамогу савецкай улады ў Літве і канфрантацыю Літвы з Польшчай, урад РСФСР пайшоў на ўключэнне ў яе склад земляў з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Браслаў. Віленскі край разам з Вільняй таксама быў прызнаны складанай часткай Літвы.

Падпісанне мірнага дагавора паміж буржуазнай Літвой і РСФСР юрыдычна спыняла існаванне Літоўска-Беларускай ССР. Аднак, як указвае Я.А. Юхо, «гэты дагавор для Беларусі не меў і не мог мець ніякай юрыдычнай сілы, бо ён быў падпісаны іншымі дзяржавамі ў процівагу нормам міжнароднага права».

31 ліпеня 1920 г. у Мінску была абвешчана Дэкларацыя аб незалежнасці БССР. У Дэкларацыі сцвярджалася, што рэспубліка будуецца на прынцыпах «дыктатуры пралетарыята і выкарыстання ўсяго вопыту Савецкай Расіі». Гаварылася таксама пра аднаўленне асноўных прынцыпаў арганізацыі народна-гаспадарчага жыцця, абвешчаных 1 студзеня 1919 г. Маніфестам рабоча-сялянскага савецкага ўрада і юрыдычна замацаваных у рашэннях 1 Усебеларускага з'езда Саветаў 2—3 лютага 1919 г. Да склікання чарговага Усебеларускага з'езда Саветаў улада пераходзіла да Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта БССР.

У Дэкларацыі аб незалежнасці БССР меліся яшчэ два важныя моманты: указвалася, што рэспубліка з'яўляецца суверэннай савецкай дзяржавай, і ў самым агульным плане вызначаліся яе межы. Даслоўна было сказана наступнае: «ССРБ вызначае сваю заходнюю мяжу па этнаграфічнай мяжы паміж Беларуссю і буржуазнымі дзяржавамі, якія з ёй мяжуюць. Мяжа ССРБ з Савецкай Расіяй і Украінай вызначаецца свабодным выяўленнем волі беларускага народа на павятовых і губернскіх з'ездах Саветаў у поўнай згодзе з урадамі РСФСР і ССРУ». Думаецца, што гэты запіс не быў выпадковым. Ён даваў магчымасць РСФСР пакінуць пад сваей юрысдыкцыяй раней далучаныя землі.

У перыяд свайго другога абвяшчэння рэспубліка аднавілася толькі ў межах Мінскай губерні. Гэта прывяло да канфрантацыі бальшавікоў з беларускімі эсэрамі, якія выступалі за цэласную і незалежную беларускую дзяржаву. Пачалася адкрытая барацьба паміж БПС-Р і КП(б)Б. Кіраўніцтва БПС-Р адмовілася падпісаць «Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці ССРБ» у прапанаваным выглядзе, хоць першапачаткова выказвалася ў яе падтрымку.

Такім чынам, аналізуючы працэс другога абвяшчэння БССР, можна канстатаваць, што пры яе аднаўленні з дапамогай урада РСФСР не магло быць гаворкі аб рэальным суверэнітэце ў рамках этнічнай тэрыторыі.

Да такога ж вываду прыйшоў і Я. А. Юхо: "Адноўленая ... Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь на тэрыторыі шасці паветаў (уездаў) Мінскай губерні хоць і аб'яўлялася незалежнай, аднак фактычна і юрыдычна з'яўлялася аўтаномнай вобласцю ў складзе РСФСР.

...Аўтаномны характар адносін ССРБ з РСФСР асабліва яскрава выяўляўся ў эканамічных, вайсковых і дзяржаўна-палітычных адносінах. Рэспубліка не мела сваіх грошай і фінансавалася з бюджэту РСФСР; арміяй, чыгуначным транспартам, поштай і сувяззю кіравалі з РСФСР, яе заканадаўства дзейнічала і на тэрыторыі Беларусі».

Пра аўтаномны характар адносін БССР і РСФСР сведчыць і пастанова III з'езда Кампартыі Беларусі (лістапад 1920 г.), у якой аб прававым становішчы рэспублікі сказана наступнае: «Беларусь, з'яўляючыся Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай, адначасова з'яўляецца складанай часткай РСФСР, і ўсе яе органы ў галіне агульных мерапрыемстваў павінны быць падпарадкаваны адпаведным камісарыятам РСФСР, аднак яны павінны мець пэўную свабоду ў галіне вырашэння пытанняў мясцовага жыцця, у якіх яны павінны кіравацца ЦВКБ і Саўнаркомам Беларусі».

Далейшае канстытуцыйнае афармленне Беларускай ССР было здзейснена на II Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, які праходзіў у Мінску з 13 па 17 снежня 1920 г. З'езд унёс істотныя змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю БССР і завяршыў сваю работу выбраннем ЦВК БССР. Дакументы з'езда з'явіліся фундаментам далейшага прававога будаўніцтва ў Беларускай ССР.

Між тым польскія войскі, якія перайшлі ў наступленне 16 жніўся 1920 г., занялі значную частку Беларусі. РСФСР вымушана была пайсці на перагаворы аб міры. 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе былі падпісаны папярэднія ўмовы міру паміж РСФСР і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай — з другога, а 18 сакавіка 1921 г. — мірны дагавор, які замацаваў змяншэнне тэрыторыі Беларусі. У прыватнасці, да Польшчы адышла ўся Заходняя Беларусь з насельніцтвам больш чым 4 млн чалавек. Віцебская і Гомельская губерні, а таксама заходнія паветы Смаленшчыны па-ранейшаму заставаліся пад юрысдыкцыяй РСФСР. Тэрыторыю ж Беларусі склалі толькі шэсць паветаў Мінскай губерні з насельніцтвам 1,6 млн чалавек.

Заслугоўвае ўвагі прававы аспект ацэнкі перагавораў у Рызе. Нягледзячы на існаванне адноўленай БССР, беларускую дэлегацыю для ўдзелу ў перагаворах, на якіх вырашаліся пытанні тэрыторыі рэспублікі, запрасіць не палічылі патрэбным. Гэта падкрэслівае непаўнату, фармальнасць яе дзяржаўнага суверэнітэту на дадзеным этапе.

25. Узаемаадносіны БССР і РСФСР. Утварэнне Саюза ССР

1 чэрвеня 1919 г. УЦВК РСФСР з мэтай аб'яднання намаганняў усіх савецкіх рэспублік ва ўмовах грамадзянскай вайны прыняў дэкрэт аб стварэнні ваеннага саюза рэспублік. Прызнавалася неабходным правесці цеснае аб'яднанне ваеннай арганізацыі і ваеннага камандавання, саветаў народнай гаспадаркі, чыгуначнага кіравання і гаспадаркі, фінансаў, камісарыятаў працы Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Беларусі і Крыма з тым, каб кіраўніцтва гэтымі галінамі было сканцэнтравана ў руках адзіных калегій.

Пасля другога абвяшчэння БССР актывізуецца дзейнасць вышэйшых органаў улады і кіравання: Усебеларускага з'езда Саветаў, Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і яго прэзідыума, а таксама

створанага 18 снежня 1920 г. на першай сесіі ЦВК БССР Савета Народных Камісараў, які ўзначальваў старшыня ЦВК А.Р. Чарвякоў (з 1923 г. Я.А. Адамовіч). СНК прымаў меры па аднаўленні прамысловасці і сельскай гаспадаркі, рэалізацыі праграмы пераходу да новай эканамічнай палітыкі, удзяляў увагу народнай асвеце, падрыхтоўцы кадраў, стабілізацыі становішча, умацаванню савецкай улады і г.д.

У полі зроку кіраўніцтва рэспублікі ў гэты час знаходзіліся і пытанні, звязаныя з суверэнітэтам і тэрытарыяльнай цэласнасцю БССР. Не задавальняючыся становішчам «малодшага брата» ў адносінах да РСФСР, аб чым было прама заяўлена на 1 Усебеларускім з'ездзе Саветаў у дэкларацыі «Аб устанаўленні цеснай федэратыўнай сувязі паміж БССР і РСФСР», рэспубліка пачала заяўляць аб сабе як аб самастойнай дзяржаве.

Якасна новыя ўзаемаадносіны БССР з РСФСР заканадаўча замацаваў Саюзны рабоча-сялянскі дагавор ад 16 студзеня 1921 г., ратыфікаваны УЦВК РСФСР і ЦВК БССР у ліпені 1921 г. У ім прызнаваліся «незалежнасць і суверэннасць кожнага з дагаворных бакоў», падкрэслівалася, што «з самога факта ранейшай прыналежнасці тэрыторыі ССРБ да былой Расійскай Імперыі для ССРБ не вынікае ніякіх абавязацельстваў у адносінах да каго б там ні было», і гаварылася, што з мэтай ваеннага і гаспадарчага саюза ўрады абедзвюх рэспублік аб'яўляюць аб аб'яднанні наркаматаў ваенных і марскіх спраў; знешняга гандлю; фінансаў; працы; шляхоў зносін; пошты і тэлеграфа. Аб'яднаныя наркаматы ўваходзілі ў склад урада РСФСР, кіраўніцтва імі ажыццяўлялася праз Усерасійскі з'езд Саветаў і УЦВК, а ў СНК БССР яны мелі сваіх упаўнаважаных. Дагавор сведчыў пра пашырэнне паўнамоцтваў Беларусі, у ім былі ўдакладнены ўзаемаадносіны рэспублік, і з гэтага часу толькі па пэўных колах пытанняў, звязаных з дзейнасцю аб'яднаных наркаматаў, пераважалі паўнамоцтвы РСФСР. Пра працэс пашырэння паўнамоцтваў рэспублікі сведчаць і дапаўненні да гэтага дагавора, уведзеныя дэкрэтам ЦВК БССР ад 24 студзеня 1922 г., у якім зазначалася, што пастановы і распараджэнні аб'яднаных наркаматаў абавязковыя для рэспублікі ў тым выпадку, калі пацверджаны ўладнымі органамі Беларусі.

У жніўні 1922 г. ЦК РКП(б) стварыў спецыяльную камісію па падрыхтоўцы праекта дагавора аб узаемаадносінах савецкіх рэспублік. У яе ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх рэспублік, у тым ліку і Беларусі. Падрыхтаваны Сталіным так званы праект «аўтанамізацыі», сутнасцю якога з'яўлялася ўваходжанне рэспублік у склад РСФСР на правах

аўтаноміі, быў па ініцыятыве У.І. Леніна раскрытыкаваны на пасяджэнні ЦК РКП(б). У адпаведнасці з яго прапановамі была прынята рэзалюцыя з новым праектам дзяржаўнага аб'яднання савецкіх рэспублік, у аснову якога былі пакладзены прынцыпы раўнапраўя і добраахвотнасці.

14 снежня 1922 г. Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў пастанову аб неабходнасці аб'яднання рэспублік на аснове ўзаемнай роўнасці, цесных эканамічных і палітычных сувязяў.

30 снежня 1 з'езд Саветаў СССР у асноўным зацвердзіў праект Дагавора і Дэкларацыі аб утварэнні СССР, якія з прычыны іх надзвычайнай важнасці перадаваліся на дадатковы разгляд рэспублік. У студзені 1924 г. V Усебеларускі з'езд Саветаў адобрыў праект Канстытуцыі СССР, якая была зацверджана 31 студзеня 1924 г. на II Усесаюзным з'ездзе Саветаў.

У адпаведнасці з агульнасаюзнай Канстытуцыяй Беларуская ССР, як і іншыя савецкія рэспублікі, перадала частку сваіх паўнамоцтваў СССР. Пералік пытанняў, вырашэнне якіх уваходзіла ў кампетэнцыю Саюза ССР, быў даволі шырокім: прадстаўніцтва ў міжнародных адносінах, заключэнне дагавораў з іншымі дзяржавамі, пытанні вайны і міру, права змянення знешніх граніц і пытанні іх змянення паміж рэспублікамі, кіраўніцтва і ўстанаўленне сістэмы ўнутранага гандлю, распрацоўка асноў агульнага плана ўсёй народнай гаспадаркі, вырашэнне спрэчных пытанняў, якія ўзніклі паміж рэспублікамі, і інш.

Такім чынам, згодна з Асноўным Законам, суверэнітэт саюзных рэспублік быў абмежаваны толькі ў выпадках, указаных Канстытуцыяй СССР. Пры вырашэнні астатніх пытанняў рэспублікі маглі дзейнічаць самастойна (арт. 3).

26. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне БССР. Пашырэнне тэрыторыі рэспублікі

Кіраўніцтвам рэспублікі ўзнімалася пытанне аб урэзанасці тэрыторыі Беларусі, якая складалася фактычна з шасці паветаў (плошча 52,3 тыс. км², насельніцтва 1544 тыс. чалавек): Бабруйскага, Барысаўскага, Ігуменскага (з 1923 г. Чэрвеньскага), Мазырскага, Мінскага і Слуцкага. З 16 студзеня 1919 г. Віцебская, Магілёўская і заходнія паветы Смаленскай губерні, як ужо адзначалася, былі далучаны да РСФСР, Тэрыторыя ж Заходняй Беларусі на аснове Рыжскага мірнага дагавора адышла да Польшчы.

Летам 1921 г. ва ўрадзе РСФСР абмяркоўвалася пытанне аб стварэнні адзінага эканамічнага раёна ў складзе Віцебскай, Гомельскай, Смаленскай, Бранскай губерняў і БССР з цэнтрам у Смаленску. Урад БССР прапанаваў свой праект стварэння адзінага эканамічнага раёна шляхам пашырэння тэрыторыі рэспублікі за кошт уключэння ў яе склад земляў з пераважна беларускім насельніцтвам.

У снежні 1923 г. Прэзідыум ЦВК СССР зацвердзіў склад спецыяльнай камісіі, якая разглядала матэрыялы па кожным павеце аб мэтазгоднасці іх уваходжання ў састаў Беларусі. Пры вырашэнні пытання кіраваліся менавіта прынцыпам перавагі беларускага насельніцтва. 4 лютага 1924 г. Прэзідыум УЦВК РСФСР зацвердзіў рашэнне камісіі аб змене граніц, а 7 сакавіка 1924 г. Прэзідыум ЦВК СССР прыняў пастанову аб аб'яднанні ў складзе БССР усіх тэрыторый з большасцю беларускага насельніцтва.

У выніку першага ўзбуйнення БССР у яе склад былі вернуты: Віцебскі, Полацкі, Сенненскі, Суражскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі і Аршанскі паветы Віцебскай губерні, у складзе РСФСР засталіся Себежскі, Невельскі, Веліжскі паветы; Клімавіцкі, Рагачоўскі, Быхаўскі, Магілёўскі, Чэрыкаўскі, Чавускі паветы Гомельскай губерні (у красавіку 1919 г. Магілёўская губерня была ператворана ў Гомельскую), у складзе РСФСР засталіся Гомельскі і Рэчыцкі паветы; 18 валасцей Горацкага і Мсціслаўскага паветаў Смаленскай губерні. VI Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся 13—16 сакавіка 1924 г. і ўвайшоў у гісторыю як з'езд першага ўзбуйнення БССР, замацаваў пашырэнне рэспублікі.

Тэрыторыя Беларускай ССР павялічылася больш чым у 2 разы (110,5 тыс. км²), а колькасць насельніцтва ўзрасла да 4,2 млн чалавек. Віцебская губерня была ліквідавана. Другая сесія ЦВК БССР 6-га склікання (17 ліпеня 1924 г.) адмяніла ранейшае і ўвяла новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне на акругі, раёны, сельсаветы. Было створана 10 акруг (Аршанская, Бабруйская, Барысаўская, Віцебская, Калінская, Магілёўская, Мазырская, Мінская, Полацкая, Слуцкая), якія аб'ядноўвалі 100 раёнаў і 202 сельсаветы.

Са снежня 1926 г. Прэзідыум УЦВК выдаў пастанову аб перадачы БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, якія былі перайменаваны ў акругі. Гомельская губерня была ліквідавана. Тэрыторыя БССР складала цяпер 125,8 тыс. км², а насельніцтва — 5 млн. чалавек.

9 чэрвеня 1927 г. былі ліквідаваны Барысаўская, Калінінская, Рэчыцкая і Слуцкія акругі, а 26 ліпеня 1930 г. — апошнія восем акруг. На тэрыторыі БССР засталося толькі раённае дзяленне.

15 студзеня 1938 г. у рэспубліцы было ўведзена абласное дзяленне: Віцебская вобласць уключала ў сябе 20 раёнаў, Гомельская — 14, Магілёўская — 21, Мінская — 20, Палеская — 15 раёнаў.

27. Развіццё права ў Беларускай ССР у 20 — 30-я гг.

Развіццё права ў Беларускай ССР у аднаўленчы перыяд (1921 — 1925 гг.) ішло ў некалькіх кірунках: па-першае, на тэрыторыі БССР уводзіліся ў дзеянне заканадаўчыя акты РСФСР; па-другое, органы ўлады і кіравання БССР (Усебеларускі з'езд Саветаў, ЦВК, СНК) прымалі ўласныя нарматыўна-прававыя акты; па-трэцяе, у некаторых заканадаўчых актах РСФСР меліся агаворкі, што яны дзейнічаюць і на тэрыторыі іншых савецкіх рэспублік.

Улады Беларусі ўводзілі ў дзеянне на тэрыторыі рэспублікі заканадаўчыя акты Расійскай Федэрацыі. Гэта закон «Об основных частных имущественных правах, признаваемых РСФСР, охраняемых ее законами и защищаемых судами» (з 2 жніўня 1922 г.), Грамадзянскі (з 1 сакавіка 1923 г.), Грамадзянска-працэсуальны (з 1 верасня 1923 г.), Крымінальны і Крымінальна-працэсуальны (з ліпеня 1922 г.) кодэксы РСФСР.

У гэты перыяд прымаюцца і ўласныя заканадаўчыя акты, актывізуецца дзейнасць вышэйшых органаў улады і кіравання БССР. Так, у красавіку 1921 г. ЦВК БССР прыняў пастанову аб пераходзе да харчпадатку і аб дазволе свабоднага абмену сельскагаспадарчай прадукцыі ў трох паветах; у жніўні 1921 г. СНК БССР выдаў пастанову «Аб правядзенні гандлю», у адпаведнасці з якой усім грамадзянам рэспублікі, якім споўнілася 16 гадоў, дазвалялася весці гандаль прадуктамі сельскай гаспадаркі, вырабамі саматужнай і фабрычнай вытворчасці за выключэннем прадметаў дзяржаўнай манаполіі, колькасць якіх была зведзена да мінімуму.

29 сакавіка 1923 г. ЦВК БССР прыняў Зямельны кодэкс (уведзены ў дзеянне 15 красавіка 1923 г.), які зыходзіў з асноўных заканадаўчых актаў РСФСР і БССР аб зямлі. Разам з абвяшчэннем зямлі выключна дзяржаўнай уласнасцю і прадастаўленнем сялянам права карыстання ёю пры ўмове вядзення гаспадаркі сваёй працай, гаварылася аб бестэрміновым карыстанні зямлёй і праве сялян выбіраць любую форму землекарыстання. У выключных выпадках, пры ўмове захавання гаспадаркай свайго працоўнага характару, дапускалася дапаможная

наёмная праца. Кодэксам таксама рэгуляваліся пытанні землеўладкавання і парадку вырашэння зямельных спрэчак.

Зямельны кодэкс БССР некалькі адрозніваўся ад адпаведнага кодэкса РСФСР. Пералічваючы формы землекарыстання, ён не выкарыстоўваў паняцце абшчыннага землекарыстання і таму не дапускаў ураўняльных перадзелаў зямлі. Зямля замацоўвалася за сельскагаспадарчымі аб'яднаннямі, а пасля выдачы адпаведных дакументаў — за асобнымі землекарыстальнікамі. Землекарыстанне нарміравалася. Наркамзему БССР даручалася вызначэнне нормы зямельных участкаў для сялян.

У сувязі з пашырэннем тэрыторыі БССР Прэзідыумам ЦВК быў прыняты новы Зямельны кодэкс БССР, уведзены ў дзеянне на ўсёй тэрыторыі рэспублікі з 1 красавіка 1925 г.

Прыняты СНК Лясны кодэкс БССР быў уведзены ў дзеянне з 1 жніўня 1924 г. У ім гаварылася пра адзіны лясны фонд БССР, аб'яўлялася, што ўсе лясы і зямельныя плошчы, прызначаныя для пашырэння лясных угоддзяў, з'яўляюцца дзяржаўнай уласнасцю. Гэты заканадаўчы акт замацаваў цэнтралізаванае кіраванне лясамі, што мела рэспубліканскае значэнне. Органамі Наркамзема былі выдзелены лясы мясцовага значэння, якія перадаваліся зямельным таварыствам, сельскагаспадарчым камунам, арцелям і іншым аб'яднанням працоўных землекарыстальнікаў у бестэрміновае карыстанне.

Што тычыцца працоўнага заканадаўства, дык заканадаўчымі актамі РСФСР, як ужо адзначалася, часам агаворвалася, што яны дзейнічаюць і на тэрыторыі іншых савецкіх рэспублік. Напрыклад, 30 кастрычніка 1922 г. УЦВК РСФСР прыняў новы Кодэкс законаў аб працы, у артыкуле 5 якога гаварылася, што ён пашырае сваё дзеянне на саюзныя рэспублікі без спецыяльнага падцвярджэння.

У адпаведнасці з палажэннямі КЗаПа асноўнай прававой формай найму рабочых і служачых на працу з'яўляўся індывідуальны працоўны дагавор і толькі ў выключных выпадках магло мець месца прыцягненне да працоўнай павіннасці. Атрымалі пацвярджэнне нормы аб васьмігадзінным рабочым дні са скарачэннем яго працягласці на падземных работах і ў іншых галінах прамысловасці, шкодных для здароўя, на начных работах і для асоб, якім не споўнілася 18 гадоў. Пры гэтым агаворвалася, што працоўныя гарантыі, устаноўленыя КЗаПам, могуць быць пашыраны ў калектыўных дагаворах, заключаных паміж прафсаюзамі і адміністрацыямі дзяржаўных або ўладальнікамі прыватных прадпрыемстваў. КЗаП замацаваў сістэму абавязковага сацыяльнага страхавання рабочых і служачых за кошт

узносаў дзяржпрадпрыемстваў і прыватных наймальнікаў у спецыяльны фонд.

У выніку ўтварэння Саюза ССР на тэрыторыі БССР уступілі ў дзеянне яго заканадаўчыя акты. У адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР 1924 г. Прэзідыум ЦВК БССР скасаваў дэкрэт ад 24 студзеня 1922 г. аб узаемаадносінах БССР і РСФСР і ўстанавіў, што пастановы УЦВК РСФСР на тэрыторыі Беларусі не маюць сілы і з гэтага часу дзейнічаюць толькі заканадаўчыя акты СССР і БССР. Тым не менш заканадаўства РСФСР аказвала істотны ўплыў на развіццё права на Беларусі.

Трэба адзначыць, што ў канцы 20 — пачатку 30-х гг. БССР набыла і ўласны заканадаўчы вопыт.

У сувязі з тым, што змяніліся ўмовы жыцця, былі прыняты новыя і перагледжаны некаторыя ранейшыя законы, напрыклад прыняты Водна-меліярацыйны кодэкс (1927), Папраўча-працоўны кодэкс (1926), Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і, апецы (1927), Кодэкс аб працы (1929) і інш.

Грамадзянскае і грамадзянска-працэсуальнае права аднаўленчага перыяду было накіравана перш за ўсё на ўмацаванне дзяржаўнай уласнасці. Напрыклад, грамадзянскі кодэкс замацаваў агульнае правіла неадчужальнасці дзяржаўных прадпрыемстваў ва ўласнасць прыватных асоб, аднак у сувязі з НЭПам пастановай ЦВК і СНК БССР ад 31 студзеня 1925 г. было дазволена адчужэнне прадпрыемстваў, якія бяздзейнічалі.

Найбольшую іскавую абарону атрымала дзяржаўная ўласнасць. Яе можна было запатрабаваць з любога незаконнага ўладання, прычым іскавая даўнасць пры гэтым не прымянялася. Аб'яўляліся несапраўднымі здзелкі, якія маглі прывесці да яўных страт для дзяржавы.

Разам з тым закон клапаціўся аб развіцці кааператыўнай уласнасці і дапускаў у пэўных межах прыватную гаспадарчую дзейнасць. Прыватным асобам дазвалялася адкрываць прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы з абавязковым захаваннем нормаў, якія рэгулявалі прамысловую і гандлёвую дзейнасць. Усім грамадзянам давалася права ўласнасці на немуніцыпальныя пабудовы (з правам іх адчужэння), на прылады і сродкі вытворчасці, прадпрыемствы (дазволеныя мець у прыватным уладанні); на перадачу маёмасці ў вызначаным памеры ў спадчыну, заключэнне не забароненых законам дагавораў.

Паступова пашыраліся маёмасныя правы грамадзян, у сувязі з чым у ГК БССР уносіліся адпаведныя змены. Так, у 1926 г. было адменена абмежаванне памеру маёмасці, якая магла пераходзіць у парадку атрымання спадчыны і дарэння; у 1929 г. пашыралася кола наследнікаў па законе ў выніку ўключэння ў яго ўсыноўленых і іх сыходных.

Грамадзянам было дадзена права завяшчаць сваю маёмасць дзяржаўным установам і прадпрыемствам, грамадскім і кааператыўным арганізацыям і г.д.

ГПК РСФСР быў уведзены ў дзеянне на тэрыторыі БССР з 1 верасня 1923 г. Закон перш за ўсё абараняў інтарэсы дзяржавы, хоць у полі зроку яго знаходзіліся і маёмасныя інтарэсы грамадзян.

Значныя змены і дапаўненні былі ўнесены ў ГПК пастановай ЦВК і СНК БССР ад 2 лютага 1929 г. Суды павінны былі вырашаць справы ў адпаведнасці з законамі Саюза ССР і БССР і пастановамі мясцовых органаў улады, выддзёнымі на падставе закону. Устанаўлівалася магчымасць прымянення судом «аналогіі права» пры вырашэнні грамадзянска-прававых спрэчак. Суд не меў права адмовіць у вырашэнні справы з-за адсутнасці ці непаўнаты закону. Законам вызначаліся падставы, па якіх дапускаліся адступленні ад прынцыпу галоснасці. Суду давалася права разгляду справы пры няяўцы адной са старон, калі меліся даныя аб уручэнні ёй паведамлення, і г.д.

24 мая 1922 г. быў прыняты Крымінальны кодэкс РСФСР. 24 чэрвеня 1922 г. III сесія ЦВК БССР прыняла пастанову «распаўсюдзіць дзеянне Крымінальнага кодэкса РСФСР на ўсю тэрыторыю Беларусі з 1 ліпеня 1922 г.», а з 1924 г. гэты кодэкс стаў афідыйна называцца «Крымінальны кодэкс Беларускай ССР» і яго дзеянне было пашырана на ўсе злачынствы, якія не былі разледжаны да гэтага часу ў судовым парадку, гэта зна'чыць ён меў зваротную сілу. Мэтай крымінальнага закону аб'яўлялася абарона працоўных ад злачынстваў і грамадска небяспечных элементаў.

Па сваёй сутнасці КК 1922 г. меў адкрыта класавы характар. Трэба адзначыць, што артыкул 10 гэтага Кодэкса прадугледжваў магчымасць прымянення крымінальнага закону па аналогіі, што стварала небяспеку злоўжыванняў на практыцы.

Кодэкс складаўся з Агульнай і Асаблівай частак. З 227 артыкулаў закона 56 прыпадала на Агульную частку. У ёй гаварылася пра межы дзеяння КК, агульныя асновы прымянення пакаранняў, устанаўліваліся меры і віды ўздзеяння на асоб, якія ўчынілі злачынствы, а таксама вызначаўся парадак адбывання пакаранняў.

Асаблівая частка складалася з васьмі глаў: «Дзяржаўныя (контррэвалюцыйныя і супраць парадку кіравання) злачынствы»; «Службовыя злачынствы»; «Парушэнне правілаў аб аддзяленні царквы ад дзяржавы»; «Злачынствы гаспадарчыя»; «Злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і гонару асобы»; «Маёмасныя злачынствы»; «Воінскія злачынствы»; «Парушэнне правілаў, якія ахоўвалі народнае

здароўе, грамадскую бяспеку і публічны парадак».

За ўчыненне контррэвалюцыйных дзеянняў, бандытызм і некаторыя іншыя асабліва небяспечныя злачынствы прадугледжвалася вышэйшая мера пакарання — расстрэл, аднак у Кодэксе гаварылася пра яе як пра часовую меру. За раскраданне сацыялістычнай уласнасці, некаторыя гаспадарчыя і службовыя крымінальна каральныя дзеянні прадугледжвалася пазбаўленне волі. Былі ўведзены такія новыя віды пакаранняў, як звальненне з пасады і выгнанне за межы рэспублікі на пэўны тэрмін ці бестэрмінова.

Узрост крымінальнай адказнасці наступаў з 14 гадоў.

У верасні 1922 г. у КК было ўнесена дапаўненне аб непрымяненні смяротнай кары да асоб, якія не дасягнулі ў момант учынення злачынства 18-гадовага ўзросту. У студзені 1923 г. чарговым дапаўненнем у Крымінальны кодэкс напалову зніжалася пакаранне асобам ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў, на адну трэць — ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў, забаранялася прымяненне смяротнай кары да цяжарных жанчын.

Такім чынам, крыніцамі крымінальнага права БССР у першыя паслярэвалюцыйныя гады былі: а) заканадаўчыя акты РСФСР (пастановы з'ездаў Саветаў, дэкрэты УЦВК ці СНК, цыркуляры і пастановы НКЮ РСФСР); б) заканадаўчыя акты БССР (Канстытуцыя, пастановы з'ездаў Саветаў, ЦВК і СНК, цыркуляры і пастановы НКЮ БССР); в) рэвалюцыйная правасвядомасць.

Далейшае развіццё крымінальнага заканадаўства БССР дадзенага перыяду звязана з прыняццем 31 кастрычніка 1924 г. агульнасаюзных «Основных начал уголовного законодательства Союза ССР и союзных республик». Гэты дакумент даў штуршок пачатку распрацоўкі новага КК БССР, які быў уведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г. Асноўнай задачай дадзенага закону абвяшчалася судова-прававая абарона сацыялістычнай дзяржавы ад грамадска небяспечных учынкаў шляхам прымянення да правапарушальнікаў мер сацыяльнага ўздзеяння. Злачынствам аб'яўлялася ўсякае «грамадскае небяспечнае дзеянне ці бяздзейнасць, накіраванае супраць асноў савецкага ладу ці правапарадку».

Злачынствы падзяляліся на дзве катэгорыі: а) накіраваныя супраць асноў савецкага ладу; б) усе астатнія. За ўчыненне крымінальна каральных дзеянняў першай катэгорыі ўстанаўлівалася мінімальная мяжа, ніжэй якой суд не мог назначыць меру пакарання. За злачынствы другой катэгорыі Кодэкс прадугледжваў толькі максімальную мяжу пакарання.

Мерамі сацыяльнай абароны з'яўляліся: 1) аб'яўленне ворагам працоўных з пазбаўленнем грамадзянства БССР ці іншай саюзнай рэспублікі і тым самым грамадзянства СССР з выгнаннем назаўсёды з дзяржавы; 2) пазбаўленне волі са строгай ізаляцыяй; 3) пазбаўленне волі без строгай ізаляцыі; 4) прымусовыя работы без пазбаўлення волі; 5) поўнае ці частковае пазбаўленне правоў; 6) выдаленне за межы СССР на пэўны тэрмін; 7) ссылка і высылка; 8) звальненне з пасады з забаронай ці без забароны займаць тую ці іншую пасаду; 9) забарона займацца той ці іншай дзейнасцю ці промыслам; 10) грамадскае ганьбаванне; 11) канфіскацыя ўсёй ці часткі маёмасці; 12) штраф; 13) перасцярога. За найбольш цяжкія злачынствы, якія пагражалі асновам савецкага ладу, дапускалася прымяненне расстрэлу як вышэйшай меры сацыяльнай абароны.

У далейшым у КК БССР 1928 г. уводзіліся дапаўненні і змяненні, якія сведчылі пра ўзмацненне рэпрэсіўнага характару крымінальнага закона. Так, у студзені 1930 г. былі ўведзены артыкулы, якія прадугледжвалі крымінальную адказнасць за злоснае невыкананне пастаноў і правіл, якія забяспечвалі паспяховую калектывізацыю сельскай гаспадаркі (пазбаўленне волі да трох гадоў з высяленнем ці без высялення), за агітацыю і прапаганду, якая змяшчала заклікі да ўчынення злачынстваў, якія перашкаджалі правядзенню калектывізацыі, і інш.

13 жніўня 1932 г. ЦВК і СНК ВССР прынялі пастанову аб няўхільным выкананні агульнасаюзнага закону ад 7 жніўня 1932 г. «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай (сацыялістычнай) уласнасці» і патрабавалі рашуча і бязлітасна змагацца з раскрадальнікамі сацыялістычнай маёмасці і антыграмадскімі кулацкакапіталістычнымі элементамі. За невыкананне гэтага закону, які ў народзе называлі законам «аб пяці каласках», прадугледжваўся расстрэл або пазбаўленне волі да 10 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Пастановай ЦВК СССР ад 8 чэрвеня 1934 г. у КК БССР быў уведзены новы састаў злачынства — здрада Радзіме (шпіянаж, выдаванне ваеннай ці дзяржаўнай тайны, пераход на бок ворага, уцёкі ці пералёт за мяжу), за што прадугледжваўся расстрэл з канфіскацыяй маёмасці, 7 красавіка 1935 г. ЦВК і СНК СССР устанавілі крымінальную адказнасць з 12-гадовага ўзросту за крадзёж, насілле, нанясенне цялесных пашкоджанняў, калецтва, забойства і спробу ўчынення забойства, а 2 кастрычніка 1937 г. ЦВК СССР прыняў пастанову аб павелічэнні тэрміну пазбаўлення волі за небяспечныя

дзяржаўныя злачынствы з 10 да 25 гадоў. У 1939 г. былі адменены артыкулы аб умоўна-датэрміновым вызваленні з месцаў зняволення.

У чэрвені — ліпені 1940 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР устанавіў крымінальную адказнасць за грубае парушэнне дысцыпліны працы (турэмнае зняволенне, папраўчыя работы), самавольнае пакіданне рабочага месца, выпуск недабраякаснай прадукцыі і г.д.

Такім чынам, крымінальнае заканадаўства арыентавала судовую практыку на агульнае ўзмацненне рэпрэсій. Канстытуцыя СССР 1936 г. прадугледжвала, што Крымінальны кодэкс павінен быць адзіным для ўсяго Саюза ССР. У сувязі з гэтым пасля 1936 г. выданне новых крымінальна-прававых нормаў заканадаўчымі органамі саюзных рэспублік практычна спынілася.

У аналагічным кірунку развівалася і крымінальна-працэсуальнае заканадаўства. У ліпені 1922 г. ЦВК БССР пашырыў дзеянне КПК РСФСР на тэрыторыю Беларусі (уведзены з 15 ліпеня 1922 г.).

Важнейшыя дэмакратычныя прынцыпы крымінальнага працэсу (галоснасць, публічнасць, права абвінавачанага на абарону, нацыянальная мова судаводства, удзел народных засядацеляў і калегіяльнасць у разглядзе спраў), замацаваныя Кодэксам, у працэсе станаўлення і ўмацавання таталітарнай дзяржавы парушаліся ўсё часцей і ўсё больш істотна.

30 сакавіка 1923 г. ЦВК БССР зацвердзіў і з 15 красавіка ўвёў у дзеянне новы КПК БССР, які падрабязна рэгламентаваў падсуднасць і парадак вырашэння крымінальных спраў у вышэйшым судзе рэспублікі, трыбуналах, удакладніў стадыі працэсу, пашырыў паўнамоцтвы органаў дазнання і інш. Увядзенне ў дзеянне ў 1924 г. Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік, а таксама перагляд судовай сістэмы Беларусі выклікалі ўнясенне ў КПК 1923 г. такіх істотных змен, што яго сталі разглядаць як КПК БССР 1927 г. Ён павышаў ролю пракуратуры ў крымінальным судаводстве, змяняў пералік мер стрымання і інш.

У 1928—1929 гг. у тэорыі савецкага крымінальнага працэсу атрымалі пашырэнне ідэі «спрашчэння і паскарэння крымінальнага судаводства і вызвалення яго ад усякіх фармальнасцей». Яны прывялі да адмены распарадчых пасяджэнняў суда. Адданне пад суд, страціўшы значэнне самастойнай стадыі працэсу, злілося з заканчэннем папярэдняга следства, што выклікала павелічэнне колькасці выпадкаў беспадстаўнага аддання пад суд. Суд атрымаў права скарачаць судовае следства, а справу слухаць без удзелу пракурора і абароны. Касацыйнае абскарджанне прыгавору і падача хадатайніцтва аб памілаванні не

дапускаліся. Рашэнне суда аб прымяненні вышэйшай меры пакарання прыводзілася ў выкананне неадкладна. Развіццё заканадаўства ў такім кірунку ўсё больш ушчамляла правы падсудных, вяло да неапраўданага масавага асуджэння грамадзян рэспублікі.

У 30-я гг. тэндэнцыя прыняцця законаў, якія ўшчамлялі правы і законныя інтарэсы грамадзян, праяўлялася ўсё больш выразна. Акрамя таго, з'явіліся і актыўна дзейнічалі пазасудовыя карныя органы, адкрыта парушаўся закон і пачаліся масавыя рэпрэсіі.

28. Канстытуцыі Беларускай ССР 1927 і 1937 гг.

VI Усебеларускі з'езд Саветаў (13 — 16 сакавіка 1924 г.) даручыў ЦВК БССР падрыхтаваць праект новай Канстытуцыі, якая б адпавядала Канстытуцыі СССР і ўлічвала адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне рэспублікі. У лютым 1925 г. ён быў разгледжаны чацвёртай сесіяй ЦВК, аднак выклікаў рознагалоссі і быў адпраўлены на дапрацоўку. Новая Канстытуцыя БССР, якая складалася з 13 глаў і 76 артыкулаў, была прынята VIII Усебеларускім з'ездам Саветаў толькі 11 красавіка 1927 г. У ёй БССР абвяшчалася дзяржавай дыктатуры пралетарыяту, уся ўлада ў якой належала Саветам рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, і аб'яўлялася, што ў яе аснове ляжаць палажэнні Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа, прынятай III Усерасійскім з'ездам Саветаў, Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада БССР ад 1 студзеня 1919 г., асноў Канстытуцыі БССР 1919 г. і Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці БССР ад 1 жніўня 1920 г.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй правам выбіраць і быць выбраным у Саветы, якія з'яўляліся палітычнай асновай дзяржавы, карысталіся ўсе грамадзяне рэспублікі незалежна ад расы, полу, нацыянальнасці і адукацыі, якім да дня выбараў споўнілася 18 гадоў, за выключэннем так званых кулакоў, гандляроў, асоб, якія жылі на непрацоўныя даходы, служыцеляў рэлігійных культаў і манахаў, былых служачых і агентаў паліцыі, псіхічна хворых і асуджаных за карыслівыя і іншыя злачынствы.

Такім чынам, выбары ў органы ўлады праводзіліся на аснове ўсеагульнага для працоўных, не зусім роўнага для рабочых і сялян выбарчага права (устанаўлівалася перавага рабочага класа, бо для гарадскога і сельскага насельніцтва рэгламентаваліся розныя нормы прадстаўніцтваў на з'ездах Саветаў) пры адкрытым галасаванні.

Выбары на з'езды былі шматступеньчатымі. Канстытуцыя замацавала за выбаршчыкамі права адклікання дэпутатаў і абавязак апошніх рабіць справаздачу аб сваёй рабоце.

Канстытуцыя замацавала факт уваходжання БССР у склад Саюза ССР з правам свабоднага выхаду, вызначыла суверэнныя правы рэспублікі самастойна прымаць сваю канстытуцыю, уносіць у яе адпаведныя змены, ствараць вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання, вызначаць адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне і інш.

У новай Канстытуцыі гаварылася, што ўсе грамадзяне БССР маюць права свабодна карыстацца роднай мовай. Была замацавана роўнасць беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай моў, аднак прызнавалася перавага беларускай у зносінах з дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі.

Спецыяльны раздзел Канстытуцыі прысвячаўся гербу, сцягу і сталіцы БССР. Носьбітам вярхоўнай улады ў Беларускай ССР, паводле Канстытуцыі 1927 г., абвяшчаўся Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, а ў перыяд паміж з'ездамі — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Саветаў Беларускай ССР.

. Да выключнай кампетэнцыі Усебеларускага з'езда Саветаў адносіліся пытанні дапаўнення і змянення асноўных палажэнняў Канстытуцыі, а таксама канчатковае зацвярджэнне частковых змен Канстытуцыі, якія прымаліся ЦВК рэспублікі ў перыяд паміж з'ездамі, змяненне межаў рэспублікі, выбары ЦВК Беларусі і прадстаўнікоў ад БССР у Савет Нацыянальнасцей ЦВК СССР.

ЦВК БССР лічыўся вярхоўным органам улады ў перыяд паміж Усебеларускімі з'ездамі Саветаў. Ён быў заканадаўчым, распарадчым і кантралюючым органам улады, склікаў з'езды, утвараў Савет Народных Камісараў рэспублікі і Прэзідыум ЦВК БССР.

Асноўную арганізацыйную работу ў перыяд паміж сесіямі ЦВК выконвалі Прэзідыум ЦВК і яго пастаянныя ўстановы: сакратарыят, арганізацыйны аддзел і некаторыя камісіі.

Прэзідыум ЦВК у перыяд паміж сесіямі ЦВК быў вышэйшым заканадаўчым, распарадчым і кантралюючым органам улады. Ён меў права склікаць сесіі ЦВК БССР, прымаць дэкрэты і пастановы па розных пытаннях гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў рэспубліцы, забяспечваў правядзеные з'ездаў Саветаў.

Штодзённую выканаўча-распарадчую работу ў рэспубліцы выконваў Савет Народных Камісараў (арт. 53). У яго склад уваходзілі старшыня СНК і яго намеснікі, народныя камісары, якія ўзначальвалі асобыя галіны дзяржаўнага кіравання, а таксама ўпаўнаважаныя

народных камісараў СССР: па замежных, ваенных і марскіх справах, па шляхах зносін, пошты і тэлеграфа. Паводле Канстытуцыі 1927 г. Вышэйшы Савет Народнай Гаспадаркі, а таксама наркаматы фінансаў, працы, гандлю і рабоча-сялянскай інспекцыі БССР апрача падпарадкавання вышэйшым органам рэспублікі павінны былі выконваць дырэктывы адпаведных народных камісараў Саюза ССР.

Распараджэнні народных камісараў маглі быць адменены ЦВК, яго Прэзідыумам і СНК БССР, а распараджэнні аб'яднаных народных камісарыятаў (фінансаў, гандлю і інш.) скасаваны аднайменнымі народнымі камісарыятамі Саюза ССР.

Структура мясцовых органаў дзяржаўнай улады адпавядала адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу рэспублікі, што быў замацаваны Канстытуцыяй 1927 г.

Вышэйшым органам улады на тэрыторыі акругі або раёна быў адпаведна акруговы ці раённы з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, а іх выканаўчымі органамі — акруговыя або раённыя выканаўчыя камітэты, якія ў перыяд паміж з'ездамі Саветаў мелі ўладу на адпаведнай тэрыторыі. Для кіраўніцтва бягучымі справамі акруговыя і раённыя выканаўчыя камітэты ўтваралі свае прэзідыумы, якія дзейнічалі ў перыяд паміж пасяджэннямі выканаўчых камітэтаў і карысталіся іх паўнамоцтвамі.

Саветы рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў утвараліся ў гарадах, мястэчках і сёлах. Для вырашэння бягучых спраў яны таксама выбіралі са свайго складу выканаўчыя органы.

У артыкуле 2 Канстытуцыі Беларусі 1927 г. замацавана палажэнне аб тым, што БССР з'яўляецца сацыялістычнай дзяржавай дыктатуры пралетарыяту і ажыццяўляе свае задачы на аснове саюза рабочых і сялян. Але ў рэальнасці склалася так, што ад імя пралетарыяту дыктатуру ажыццяўляла Камуністычная партыя бальшавікоў. Менавіта па гэтай прычыне ўсе дзяржаўныя органы былі падпарадкаваны партыйным установам і павінны былі выконваць дырэктывы і пастановы партыйных з'ездаў, канферэнцый і іх выканаўчых органаў. Усе важнейшыя пасады ў дзяржаўным апараце займалі толькі камуністы, якія зацвярджаліся ў партыйных камітэтах. Напрыклад, кіруючыя работнікі Беларускай ССР зацвярджаліся на пасады ў ЦК УКП(б); рэспубліканскія наркамы, іх намеснікі і некаторыя іншыя — на бюро ЦК Кампартыі Беларусі; асобы, якія прызначаліся на пасады ў акругі, раёны, — акружнымі або раённымі камітэтамі партыі. Такая сістэма назначэння кіруючых кадраў атрымала назву «наменклатура». Адначасова адбылося зліццё партыйнага і дзяржаўнага апарату. Дзяржаўныя кіраўнікі ўваходзілі ў

склад партыйных органаў, а партыйныя — дзяржаўных савецкіх устаноў. Такі парадак доўжыўся да таго часу, пакуль Кампартыя ў канстытуцыйным парадку заставалася «кіруючай і накіроўваючай сілай у грамадстве» (да 1991 г.).

У 1936 г. у сувязі з палітыка-эканамічнымі зменамі ў дзяржаве было прызнана неабходным унесці змяненні ў Канстытуцыю СССР 1924 г., аднак канстытуцыйная камісія прыйшла да вываду аб неабходнасці распрацоўкі якасна новай канстытуцыі.

Новая Канстытуцыя БССР поўнасцю адпавядала Канстытуцыі СССР 1936 г. Саюзныя законы ў абавязковым парадку пашыраліся на тэрыторыю рэспублікі, а кожны грамадзянін БССР з'яўляўся і грамадзянінам СССР. У Канстытуцыі гаварылася пра добраахвотнае аб'яднанне БССР на роўных правах з іншымі саюзнымі рэспублікамі ў Саюз ССР, аднак суверэнітэт Беларусі быў абмежаваны, а механізм выхаду са складу Саюза не распрацаваны. Найбольш важныя пытанні дзяржаўнага жыцця былі аднесены да кампетэнцыі СССР (абарона краіны, знешні гандаль, кіраўніцтва эканомікай на аснове ўстанаўлення народнагаспадарчых планаў СССР, ахова дзяржаўнай бяспекі і інш.).

Канстытуцыя Беларускай ССР 1937 г. складалася з 11 раздзелаў: 1) «Грамадскі лад»; 2) «Дзяржаўны лад»; 3) «Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады БССР»; 4) «Органы дзяржаўнага кіравання БССР»; 5) «Мясцовыя органы дзяржаўнай улады»; 6) «Бюджэт БССР»; 7) «Суд і пракуратура»; 8) «Асноўныя правы і абавязкі грамадзян»; 9) «Выбарчая сістэма»; 10) «Герб, сцяг, сталіца»; 11) «Парадак змянення Канстытуцыі». Усяго ў Канстытуцыі было 122 артыкулы.

У Канстытуцыі была зроблена спроба адыходу ад прынцыпу «ўся ўлада Саветам» і намечаны пераход да падзелу ўлады на заканадаўчую, выканаўчую і судовую» Вышэйшым органам улады ў рэспубліцы ўпершыню абвяшчаўся Вярхоўны Савет, які выбіраў Прэзідыум і ствараў урад — СНК БССР. Канстытуцыя БССР упершыню змяшчала раздзелы пра бюджэт, суд і пракуратуру, хоць ствараліся яны ў адпаведнасці з агульнасаюзным заканадаўствам.

Многія палажэнні Канстытуцыі насілі чыста дэкларатыўны характар, не адпавядаючы рэчаіснасці таталітарнага рэжыму. Так, абвяшчаліся палітычныя правы і свабоды грамадзян рэспублікі — свабода слова, друку, сходаў і мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый. На практыцы ж падаўляўся любы грамадскі рух, які супярэчыў курсу партыі і ўрада.

Істотна была зменена выбарчая сістэма. Выбары дэпутатаў ва ўсе Саветы дэпутатаў працоўных (Вярхоўны Савет акруговыя, раённыя,

гарадскія, местачковыя, сельскія і пасялковыя) здзяйсняюцца на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні.

Разам з абвяшчэннем прынцыпаў выбарнасці і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, роўнасці правоў і абавязкаў грамадзян і асабліва кіраўніцтва Камуністычнай партыі ўсімі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі працоўных Канстытуцыяй падкрэслівалася, што ўся ўлада ў БССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Саветаў дэпутатаў працоўных. У Канстытуцыі гаварылася пра новую класавую структуру грамадства і кіруючую ролю рабочага класа ў жыцці савецкага народа, адзначалася, што «палітычную аснову БССР складаюць Саветы дэпутатаў працоўных, якія выраслі і ўзмацнелі ў выніку звяржэння ўлады памешчыкаў і капіталістаў, заваёвы дыктатуры пралетарыяту, вызвалення беларускага народа ад нацыянальнага прыгнёту царызму і рускай імперыялістычнай буржуазіі і разгрому беларускай нацыяналістычнай контррэвалюцыі». У Канстытуцыі адзначалася, што класавая структура грамадства і панаванне сацыялістычнай сістэмы гаспадаркі ў БССР з'яўляюцца асноўнымі паказчыкамі таго, што рэспубліка стала сацыялістычнай дзяржавай рабочых і сялян.

Гаспадарчае жыццё Беларусі накіроўвалася і вызначалася дзяржаўным народнагаспадарчым планам, які каардынаваўся ўладнымі органамі СССР. Сацыялістычная ўласнасць у БССР мела дзяржаўную або кааператыўна-калгасную форму. Кожны грамадзянін БССР абавязаны быў берагчы і ўмацоўваць дзяржаўную сацыялістычную ўласнасць. Асобы, якія пасягалі на яе, лічыліся ворагамі народа.

У цэлым канстытуцыйныя нормы, якія адлюстроўвалі супярэчлівы характар дадзенага этапу развіцця дзяржавы, былі дэкларатыўныя, рэзка разыходзіліся з рэчаіснасцю сталінскага рэжыму і служылі асновай існавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання.

Арганізацыя вышэйшых і мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў гэтыя гады значна змянілася. Спыніла існаванне сістэма з'ездаў Саветаў, заканадаўчая ўлада стала належаць выключна Вярхоўнаму Савету БССР. У выпадку неабходнасці ў перыяд паміж сесіямі Вярхоўнага Савета яго Прэзідыум мог унесці змяненні ў дзеючае заканадаўства з далейшым зацвярджэннем на чарговай сесіі Вярхоўнага Савета. Упершыню было зроблена размежаванне паміж органамі дзяржаўнай улады і цэнтральнымі органамі дзяржаўнага кіравання. Ствараемы Вярхоўным Саветам рэспублікі І падсправаздачны яму СНК (з 1946 г. — Савет Міністраў) з'яўляўся вышэйшым выканаўчым і

распарадчым органам БССР. Мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, створаныя замест з'ездаў Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, з'яўляліся органамі дзяржаўнай улады. Выканкамы мясцовых Саветаў былі аднесены да органаў дзяржаўнага кіравання.

Пазней у Канстытуцыю БССР 1937 г. быў унесены шэраг змяненняў і дапаўненняў, звязаных з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем, перайменаваннем СНК у Савет Міністраў, а наркаматаў — у міністэрствы (1946 г.), расшырэннем пасля XXII з'езда КПСС (1961 г.) правоў рэспублікі і інш.

29. Судовыя органы Беларусі ў 20 — 30-я гг.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны судовую сістэму Беларусі складалі народныя суды, асобныя ўдарныя сесіі і дзяжурныя камеры народнага суда, дзяжурная камера пры Надзвычайнай камісіі, Савет народных суддзяў, рэвалюцыйны і вайсковыя трыбуналы, Калегія вышэйшага судовага кантролю НКЮ (Народны камісарыят юстыцыі) БССР.

Да падсуднасці народных судоў адносіліся ўсе крымінальныя і грамадзянскія справы акрамя тых, якія тычыліся спраў асаблівай дзяржаўнай важнасці. Апошнія разглядаў Рэвалюцыйны трыбунал рэспублікі.

Асобныя ўдарныя сесіі народнага суда разглядалі тыя катэгорыі крымінальных спраў, якія ім перадаваліся Рэўтрыбуналам, а дзяжурныя камеры народных судоў прымалі да вытворчасці справы аб дробных правапарушэннях, якія не патрабавалі папярэдняга даследавання і маглі быць разгледжаны судом неадкладна. Дзяжурная камера пры Надзвычайнай камісіі разглядала справы, якія былі ў вытворчасці гэтай камісіі і па якім патрэбна было хуткае судовае разбірацельства.

Савет народных суддзяў, які выбіраўся на рэспубліканскім з'ездзе народных суддзяў, з'яўляўся касацыйнай інстанцыяй для народных судоў, іх дзяжурных камер і асобных ударных сесій.

На Беларусі функцыяніравалі і надзвычайныя судовыя органы — Рэвалюцыйны і Касацыйны трыбуналы.

Рэвалюцыйны трыбунал у складзе старшыні і пяці членаў зацвярджаўся СНК БССР. Да яго падсуднасці адносілася разгляданне ў першай інстанцыі спраў аб контррэвалюцыйных злачынствах, буйных спекуляцыях, дыскрэдытацыі савецкай улады, бандытызме, злосным

дэзерцірстве і іншых грамадска небяспечных злачынствах.

Нагляд за дзейнасцю Рэвалюцыйнага трыбунала, разгляд касацыйных скаргаў і пратэстаў па падсудных яму справах ажыццяўляў Касацыйны трыбунал пры ЦВК БССР. Яго старшынёй з'яўляўся народны камісар юстыцыі.

Кантроль за вырашэннем спраў у судах і рэвалюцыйных трыбуналах ажыццяўляла Калегія вышэйшага судовага кантролю НКЮ Беларусі.

Такая сістэма судовых органаў існавала на Беларусі да другой паловы 1922 г. У верасні 1922 г. ЦВК і СНК БССР у адпаведнасці з рашэннем ЦК КПБ(б) аб паляпшэнні дзейнасці судовых органаў і з улікам праведзенай у маі 1922 г. судовай рэформы ў РСФСР прынялі пастанову аб правядзенні судовай рэформы на Беларусі. У выніку былі скасаваны Рэвалюцыйны трыбунал БССР, Савет народных суддзяў і створаны Вышэйшы суд рэспублікі, а замест Касацыйнага трыбунала ўтворaны Вышэйшы касацыйны суд.

Вышэйшы суд меў тры аддзяленні: асаблівай падсуднасці, крымінальнае і грамадзянскае. Вышэйшы суд разглядаў у першай інстанцыі крымінальныя і грамадзянскія справы, якія закон адносіў да яго падсуднасці, а таксама з'яўляўся касацыйнай і надзорнай інстанцыяй для народных судоў рэспублікі.

Вышэйшы касацыйны суд здзяйсняў судовы калтроль за справамі, разгледжанымі ўсімі судовымі органамі Беларусі. Яго рашэнні былі канчатковымі і маглі быць адменены толькі Прэзідыумам ЦВК БССР.

Згодна з Палажэннем аб судовым ладзе, якое было зацверджана другой сесіяй ЦВК БССР IV склікання ў сакавіку 1923 г., з 15 красавіка гэтага ж года на Беларусі ўводзілася трохступенная сістэма судовых органаў: народны суд, Вышэйшы і Вярхоўны суд Беларускай ССР, а для вырашэння арганізацыйных пытанняў дзейнасці народных судоў і тлумачэння ў неабходных выпадках дзеючага заканадаўства Палажэннем аб судовым ладзе прадугледжвалася ўтварэнне пленума Вышэйшага суда.

З 1 жніўня 1924 г. уводзіцца новае Палажэнне аб судовым ладзе БССР, у якім быў улічаны новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі.

З 1 кастрычніка 1925 г. замест Вышэйшага суда, які не меў магчымасці абслужыць насельніцтва ўсіх акругоў і забяспечыць кантроль за дзейнасцю народных судоў, былі ўтвораны акружныя суды ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Бабруйску і Мазыры. У межах тэрыторыі акругі яны выконвалі функцыі, якія раней уваходзілі ў кампетэнцыю

Вышэйшага суда.

У сувязі са змяненнем адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР у 1930 г. адбылася рэарганізацыя і судовых органаў: былі скасаваны акруговыя суды, устаноўлена двухступенная судовая сістэма, пашыраны функцыі народных судоў, якія сталі разглядаць усе грамадзянскія справы акрамя падсудных Вярхоўнаму суду, таварысцкім, сельскім і местачковым судам.

Змены ў судовай сістэме рэспублікі замацавала новае Палажэнне аб судовым ладзе БССР, якое пачало дзейнічаць з 1 мая 1931 г. У ім былі вызначаны асноўныя задачы судоў: падаўленне супраціўлення класавага ворага, умацаванне грамадска-працоўнай дысцыпліны, пільная ахова сацыялістычнай уласнасці. Справы аб крадзяжах сацыялістычнай маёмасці суды павінны былі разглядаць у першую чаргу і ў максімальна кароткія тэрміны.

У 1934 г. адбываюцца некаторыя змены ў структуры Вярхоўнага суда рэспублікі. У яго складзе з'яўляецца спецыяльная судовая калегія для разгляду спраў аб дзяржаўных злачынствах, расследаваных органамі НКУС (Народны камісарыят унутраных спраў) за выключэннем спраў аб здрадзе Радзіме, шпіянажы, тэроры, падпалах і іншых дыверсіях, якія знаходзіліся ў падсуднасці вайсковых трыбуналаў.

Згодна з артыкулам 80 Канстытуцыі БССР 1937 г. судовая сістэма рэспублікі складалася з Вярхоўнага, акруговых і народных судоў. Акрамя таго, у Канстытуцыі падкрэсліваецца, што правасуддзе ў рэспубліцы ажыццяўляецца «также специальными судами СССР, создаваемыми по постановлению Верховного Совета СССР» (арт. 80).

У лютым 1938 г. з увядзеннем на тэрыторыі Беларускай ССР абласнога дзялення ў рэспубліцы ўтвараюцца абласныя суды. Па сутнасці, судовая сістэма БССР ствараецца на падставе агульнасаюзнага Закона аб судовым ладзе СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік, які быў прыняты ў жніўні 1938 г. Асноўным звяном на Беларусі па-ранейшаму заставаўся народны суд, які дзейнічаў на тэрыторыі раёна ці горада і разглядаў большую частку як крымінальных, так і грамадзянскіх спраў. У абласных судах дзейнічалі калегіі па крымінальных і грамадзянскіх справах. У касацыйным парадку яны разглядалі скаргі, пратэсты на прыгаворы, рашэнні і вызначэнні народных судоў. Абласны суд заставаўся судом першай інстанцыі для спраў, якія аднесены да яго падсуднасці.

Аналагічную структуру меў Вярхоўны суд БССР, які ажыццяўляў нагляд за судовай дзейнасцю ўсіх судовых органаў рэспублікі.

Такім чынам, у рэспубліцы адзінай інстанцыяй, якая мела правамоцтвы правяраць законнасць і абгрунтаванасць прыгавораў і рашэнняў, якія ўступілі ў сілу, стаў Вярхоўны суд Беларускай ССР.

30. Землі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР

Паводле Рыжскага мірнага дагавора Заходняя Беларусь прызнавалася часткай Польшчы, а на яе землях устанаўлівалася буржуазна-памешчыцкая ўлада. Менавіта на гэтай тэрыторыі быў уведзены прыняты ў Польшчы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на ваяводствы, паветы, гміны, утвораны Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы. Плошча Заходняй Беларусі ў 1931 г. складала больш за 112 тыс. км², а насельніцтва — 4,6 млн чалавек.

Гэта была адсталая ўскраіна польскай дзяржавы. У пачатку 30-х гг. 85 % насельніцтва Заходняй Беларусі жыло ў вёсцы, 79 % — занятаў сельскай гаспадаркі. Складаючы 23 % тэрыторыі і 11 % насельніцтва Польшчы, Віленскае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы мелі ў 1937 г. толькі 2,8 % прадпрыемстваў і 1,9 % рабочых краіны. Эканамічная палітыка правячых колаў была скіравана на тое, каб пакінуць «усходнія крэсы» ў становішчы аграрна-сыравіннага прыдатку больш развітых прамысловых раёнаў карэннай Польшчы, што асуджала край на адсталасць і галечу.

Згодна з пунктам 1 артыкула VII Рыжскага мірнага дагавора Польшча павінна была прадаставіць беларусам, якія апынуліся пад яе юрысдыкцыяй, усе правы па забеспячэнні свабоднага развіцця культуры, адукацыі, мовы, выканання рэлігійных абрадаў, але польскія правячыя колы ніколі не выконвалі гэтыя палажэнні. Наадварот, цяжкае сацыяльнае і эканамічнае становішча спалучалася з не менш цяжкім нацыянальным прыгнечаннем беларускага народа. Польскія ўлады і пануючыя класы ставілі сваёй мэтай выкараніць нацыянальную свядомасць беларусаў, апалячыць іх і дзякуючы гэтаму ліквідаваць глебу для барацьбы за нацыянальнае вызваленне. Каб неяк абгрунтаваць сваё права на захопленыя землі, польскія ўлады не спыняліся перад фальсіфікацыяй статыстычных звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі. Напрыклад, у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах беларусаў было не 22,5 %, як сцвярджала афіцыйная польская статыстыка, а 67 %; палякаў — не 42,

а 12 — 13; украінцаў — 5 — 6; яўрэяў — каля 9; рускіх — 2; літоўцаў — 3 %.

З першых дзён захопу краю польскія ўлады пачалі закрываць беларускія школы, якіх у1918 — 1919 гг. сіламі грамадскасці было адкрыта каля 350. У 1938/ 39 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не стала ні адной беларускай школы, а польскіх школ было недастаткова, каб забяспечыць навучанне ўсіх дзяцей. У выніку непісьменных сярод насельніцтва Заходняй Беларусі ва ўзросце звыш 10 гадоў у 1931 г. налічвалася 43 %. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай, беларусаў не бралі на дзяржаўную службу. Культурнае жыццё беларускага народа пастаянна абмяжоўвалася і падаўлялася.

Польшча лічылася буржуазна-дэмакратычнай рэспублікай. Аднак абвешчаныя сакавіцкай канстытуцыяй 1921 г. свабоды слова, друку, сходаў, арганізацый пастаянна парушаліся, асабліва на "крэсах". Тут па навалі самавол і здзекі над насельніцтвам з боку паліцыі, чыноўнікаў. Асабліва ўзмацняліся рэпрэсіі ў перыяды ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху. У пачатку 30-х гг. у турмах Польшчы знаходзілася больш 10 тыс. палітзняволеных. Новая хваля масавых арыштаў ахапіла край пасля таго, як у 1934 г. на Палессі, у Бярозе-Картузскай, быў створаны канцэнтрацыйны лагер для палітычных зняволеных.

Палітычнае бяспраўе, сацыяльны і нацыянальны прыгнёт насельніцтва Заходняй Беларусі выклікалі барацьбу за свае правы, за вызваленне з-пад польскай акупацыі. Барацьбітоў не магло запалохаць нават тое, што на тэрыторыі Заходняй Беларусі да 1932 г. прымянялася Крымінальнае ўлажэнне Расійскай Імперыі 1903 г., а ў 1932 г. быў уведзены ў дзеянне Крымінальны кодэкс Польшчы, згодна з якім асобы, прызнаныя вінаватымі ў вызваленчай барацьбе, сурова караліся аж да смяротнага прысуду.

Вызваленчая барацьба ў большасці выпадкаў была выклікана імкненнем да ўз'яднання з БССР. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР афіцыяльна падтрымлівала развіццё ідэі такога ўз'яднання і садзейнічала ўмацаванню веры ў яго ажыццяўленне.

23 жніўня 1939 г., ва ўмовах абвостранага міжнароднага становішча, урад СССР падпісаў з гітлераўскай Германіяй дагавор аб ненападзенні. Пакт быў дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі, па якіх тэрыторыя Польшчы і шэрага іншых краін падзялялася на сферы ўплыву СССР і Германіі. Устанаўлівалася, што мяжа гэтых сфер павінна праходзіць па лініі рэк Нарэў, Буг, Вісла, Сан. Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна прызнаваліся сферай інтарэсаў СССР.

Засцярогшы сябе на ўсходзе, гітлераўская Германія 1 верасня 1939 г. пачала даўно спланаваную вайну супраць Польшчы. 17 верасня Чырвоная Армія перайшла мяжу, што аддзяляла Заходнюю Беларусь ад БССР. На ўсёй заходняй тэрыторыі пачалі ствараццa часовыя органы народнай улады — камітэты сёл, сялянскія валасныя камітэты, з'езды і нарады сялянскіх камітэтаў валасцей і паветаў, упраўленні гарадоў і паветаў, упраўленні абласцей. Ва ўсе ўладныя структуры ўвайшлі прадстаўнікі Чырвонай Арміі.

22 кастрычніка на аснове савецкай выбарчай сістэмы на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі праведзены выбары ў Народны (Нацыянальны) сход. Удзельнічаць у іх мелі права ўсе жыхары, якія дасягнулі 18 гадоў. Было створана 929 выбарчых акруг і выбрана 927 дэпутатаў.

Народны (Нацыянальны) сход пачаў сваю работу 28 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. На парадку дня стаялі наступныя пытанні: 1) аб дзяржаўнай уладзе; 2) аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР; 3) аб канфіскацыі памешчыцкіх земляў; 4) аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці.

У адпаведнасці з разгледжанымі пытаннямі былі адобраны чатыры дэкларацыі, абвясціўшыя ўстанаўленне савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Дэкларацыі Народнага (Нацыянальнага) сходу сталі прававой асновай для прыняцця 2 лістапада 1939 г. Вярхоўным Саветам СССР пастановы «Аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР з аб'яднаннем яе з Беларускай ССР». 14 лістапада Вярхоўны Савет БССР пастанавіў прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР і "ўз"яднаць тым самым беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве".

4 снежня 1939 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў указ аб стварэнні на тэрыторыі Заходняй Беларусі пяці абласцей — Баранавіцкая, Беластоцкай, Брэсцкай, Віленскай і Пінскай. У студзені 1940 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 32 паветы былі рэарганізаваны ў 101 раён. З мэтай стварэння савецкіх органаў улады і кіравання ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 7 снежня 1939 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі зацверджаны абласныя выканаўчыя камітэты, хоць у адпаведнасці з Канстытуцыяй 1937 г. папярэдне было неабходна правесці выбары ў мясцовыя Саветы. Аблвыканкамы у сваю чаргу фарміравалі рай- і сельвыканкамы, Выбары ў мясцовыя Саветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбыліся 15 снежня 1940 г.

Такім чынам, у кастрычніку 1939 г. адбыўся працэс тэрытарыяльнай кансалідацыі беларускай нацыі ў яе этнаграфічных

межах. Аднак неўзабаве Віленскі край у сувязі з пактам Молатава — Рыбентропа быў перададзены Літве.

Трэба адзначыць, што станаўленне савецкай сістэмы кіравання суправаджалася парушэннямі законнасці — высылкай у глыб краіны былых дзяржаўных служачых (нават леснікоў), гандляроў, рамеснікаў. Дэпартацыя матывавалася неабходнасцю ачысціць край ад буржуазных элементаў і «ворагаў народа». Мясцовым кадрам, у тым ліку і былым членам КПЗБ і КСМЗХ, выказваўся «палітычны недавер», а на кіруючыя пасады назначаліся, як правіла, работнікі, якія прыязджалі з усходніх абласцей рэспублікі (больш за 14 тыс. чалавек). Няведанне многімі з іх мясцовай спецыфікі прыводзіла да грубых памылак у рабоце і выклікала незадаволенасць насельніцтва.

16 лістапада 1939 г. паміж савецкім урадам і ўрадам Германіі было заключана пагадненне аб перасяленні асоб беларускай нацыянальнасці з польскіх тэрыторый, акупіраваных трэцім рэйхам, на беларускія землі, якія адышлі да СССР. Многіх перасяленцаў напаткаў трагічны лёс: яны сталі ахвярамі органаў НКУС.

Аднак, нягледзячы на ўсе выдаткі, трэба адзначыць, што ўз'яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі ў адзіную Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку было актам гістарычнай справядлівасці. Яно паклала канец падзелу Беларусі, аднавіла яе тэрытарыяльную цэласнасць, уз'яднала беларускі народ у адзіную сям'ю.

31. Прававыя меры павышэння абараназдольнасці краіны на пярэдадні і ў час Вялікай Айчыннай вайны

У канцы 30 — пачатку 40-х гг. СССР прымаў меры па ўмацаванні сваёй бяспекі. З гэтай мэтай быў праведзены шэраг мерапрыемстваў па пад'ёме эканамічнай магутнасці краіны, узмацненні яе абараназдольнасці. Важнае месца ва ўмацаванні абароннай прамысловасці, павышэнні арганізаванасці і дысцыпліны ў Чырвонай Арміі мела савецкае заканадаўства, у тым ліку і крымінальнае.

1 верасня 1939 г. сесіяй Вярхоўнага Савета СССР быў прыняты закон "Аб усеагульным воінскім абавязку". На падставе гэтага закону ў армію прызываліся асобы, якім спаўнялася 19 гадоў, а для закончыўшых сярэднюю школу прызыўны ўзрост устанаўліваўся ў 18 гадоў. Для больш дасканалага авалодання ваеннай справай, новай тэхнікай і ўзбраеннем былі павялічаны тэрміны абавязковай службы:

для малодшых камандзіраў сухапутных войскаў і ВПС — ад двух да трох гадоў, для ўсяго радавога саставу ВПС, а таксама малодшага камсаставу пагранічных войскаў — да чатірох гадоў, на караблях і ў часцях флоту — да пяці гадоў. У законе ўказвалася, што асобы, арыштаваныя, сасланыя і высланыя, а таксама пазбаўленыя паводле суда выбарчых правоў, у час адбывання пакарання на ваенную службу не прызываліся. Закон «Аб усеагульным воінскім абавязку» вырашаў і пытанні падсуднасці ў выпадках ўчынення злачынстваў ваеннаслужачымі і ваеннаабавязанымі, прызванымі на вучэбныя зборы. Яны неслі адказнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб воінскіх злачынствах.

З мэтай павышэння боегатоўнасці часцей і падраздзяленняў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 ліпеня 1940 г. была павышана адказнасць за самавольную адлучку і дэзерцірства.

Важную ролю ў забеспячэнні абароназдольнасці краіны адыгрываў воінскі ўлік. Таму Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30 ліпеня 1940 г. "Аб адказнасці за парушэнне правілаў воінскага ўліку" была ўведзена крымінальная адказнасць у выпадках паўторнага парушэння правілаў воінскага ўліку.

Пытанні рэгламентацыі падсуднасці ваенных трыбуналаў былі вырашаны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 13 снежня 1940 г. «Аб змяненні падсуднасці ваенных трыбуналаў». На падставе гэтага ўказа ўсе справы аб злачынствах, учыняемых ваеннаслужачымі і ваеннаабавязанымі ў час праходжання імі вучэбных збораў, перадаваліся ў падсуднасць ваенных трыбуналаў.

Адным з першых заканадаўчых актаў, прынятых савецкай дзяржавай у дзень нападу Германіі на СССР, быў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб ваенным становішчы». З увядзеннем ваеннага становішча ўсе функцыі органаў дзяржаўнай улады ў галіне абароны, аховы грамадскага парадку і дзяржаўнай бяспекі перадаваліся ваенным саветам франтоў, армій, ваенных акруг. У мясцовасцях, дзе не дыслацыраваліся буйныя воінскія злучэнні, якія мелі ваенныя саветы, выкананне названых функцый здзяйсняла вышэйшае камандаванне вайсковых часцей.

Пленум Вярхоўнага Суда СССР у пастанове ад 11 кастрычніка 1941 г. «Аб крымінальнай адказнасці грамадзян, якія ўхіляюцца ад усеагульнага абавязковага абучэння ваеннай справе» растлумачыў умовы і парадак прыцягнення да крымінальнай адказнасці грамадзян, якія не выконвалі ўказанага абавязку.

Увядзенне ваеннага становішча выклікала значныя змены ў прымяненні крымінальнага заканадаўства, у кваліфікацыі злачынстваў. За злачынствы, учыненыя ў мясцовасцях, аб'яўленых на ваенным становішчы, вінаватыя прыцягваліся да адказнасці па законах ваеннага часу. Пленум Вярхоўнага Суда СССР па шэрагу канкрэтных злачынстваў расцлумачыў, што злачынствы, учыненыя ў прыфрантавых раёнах у перыяд ваенных дзеянняў, трэба разглядаць як учыненыя пры абцяжваючых акалічнасцях (у час грамадскага бедства). Так, у пастанове Пленума Вярхоўнага Суда СССР ад 8 студзеня 1942 г. «Аб кваліфікацыі некаторых відаў крадзяжу асабістай маёмасці грамадзян, учыненых у час паветранага налету ворага ці пры пакіданні населеных пунктаў у сувязі са з'яўленнем ці набліжэннем ворага, а таксама маёмасці эвакуіраваных, як у дарозе, так і пакінутага ў ранейшым месцы жыхарства» указвалася, што такія крадзяжы кваліфікуюцца як учыненыя пры абцяжваючых акалічнасцях і па сваім характары і павышанай грамадскай небяспецы падпадаюць пад прыметы крадзяжу, учыненага ў час пажару, паводкі ці іншага грамадскага бедства.

Пачатак вайны выклікаў значнае пашырэнне кола асоб, якія маглі быць суб'ектамі воінскіх злачынстваў. У выпадку ўчынення злачынства асобамі, што знаходзіліся ў знішчальных батальёнах, групах і атрадах садзейнічання Чырвонай Арміі, часцях і падраздзяленнях народнага апалчэння, пытанне аб кваліфікацыі іх дзеянняў вырашалася дыферэнцыравана. Пленум Вярхоўнага «Суда СССР у пастанове ад 28 ліпеня 1941 г. «Аб разглядзе спраў аб злачынствах асоб, што знаходзіліся ў часцях народнага апалчэння» зрабіў расцлумачэнне:

«Грамадзяне, якія знаходзяцца ў часцях народнага апалчэння, за злачынствы супраць устаноўленага ў народным апалчэнні парадку нясення службы нясуць адказнасць па Палажэнні аб воінскіх злачынствах». Усе справы гэтай катэгорыі разглядаліся ваеннымі трыбуналамі. Калі ж асобы, што знаходзіліся ў часцях і падраздзяленнях народнага апалчэння, учынялі злачынствы, не звязаныя з парадкам нясення службы ў гэтых фарміраваннях, то справы гэтай катэгорыі разглядаліся агульнымі судамі. Аналагічна вырашалася пытанне аб кваліфікацыі злачынстваў, учыненых асобамі, якія знаходзіліся ў знішчальных батальёнах, фарміраваннях мясцовай проціпаветранай абароны.

У сувязі з неабходнасцю спыніць небяспечныя для абароны краіны злачынныя ўчынкі што сеялі паніку 6 ліпеня 1941 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР была ўстаноўлена крымінальная адказнасць за распаўсюджванне лжывых слухаў, якія выклікалі трывогу сярод

насельніцтва ў ваенны час.

З мэтай рэалізацыі патрабаванняў, змешчаных у заявах Савецкага ўрада ад 14 кастрычніка 1942 г. аб пакаранні фашысцкіх ваенных злачынцаў, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лістапада 1942 г. «Аб утварэнні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР» быў створаны спецыяльны орган для расследавання злачынстваў, учыненых фашыстамі і іх памагатымі. Савецкае заканадаўства садзейнічала мабілізацыі ўсяго насельніцтва на барацьбу з ворагам.

32. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання ў гады Вялікай Айчыннай вайны

25 чэрвеня 1941 г., калі нямецкія войскі набліжаліся да Мінска, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР пераехаў у Магілёў, затым у Гомель, пасля акупацыі ўсёй тэрыторыі Беларусі эвакуіраваўся ў г. Арол, а затым — у Маскву. Але і ва ўмовах эвакуацыі ён працягваў выконваць функцыі дзяржаўнай улады рэспублікі, выдаваў указы аб аб'яднанні наркаматаў, назначэнні і перамяшчэнні народных камісараў і членаў урада БССР, прадаўжэнні паўнамоцтваў органаў улады і г.д.

У чэрвені 1942 г. тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета Беларускай ССР першага склікання скончыўся, але з улікам ваеннага становішча ён штогод адтэрміноўваў выбары і прадаўжаў свае паўнамоцтвы да 1945 г.

Пасля вызвалення Гомеля Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР пераехаў з Масквы ў гэты абласны цэнтр, а 14 лютага 1944 г. быў выдадзены ўказ аб скліканні шостай сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, першай за час вайны.

На сесіі быў абмеркаваны і зацверджаны дзяржаўны бюджэт рэспублікі на 1944 г., а таксама справаздача аб выкананні бюджэту за 1940 — 1941 гг., прынята рашэнне аб утварэнні двух наркаматаў БССР — замежных спраў і абароны. Былі таксама зацверджаны ўказы Прэзідыума Вярхоўнага Савета, прынятыя паміж пятай і шостай сесіямі.

Дзейнасць Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР пасля сесіі актывізавалася. Акрамя вырашэння пытанняў аб зменах у сістэме

вышэйшых органаў дзяржаўнага кіравання рэспублікі, назначэння і вызвалення наркамаў Прэзідыум разглядаў і іншыя пытанні, у прыватнасці 21 красавіка 1944 г. ён разгледзеў пытанне аб памілаванні грамадзян, асуджаных судовымі органамі БССР.

Аднаўленне мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання мела некаторыя асаблівасці. Справа ў тым, што ўмовы ваеннага часу, прызыў большасці дэпутатаў у армію не дазвалялі склікаць сесіі абласных Саветаў. Па гэтай прычыне склад выканаўчых камітэтаў абласных Саветаў зацвярджаўся Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прымаў у гэты час шэраг нарматыўных актаў па арганізацыі дзейнасці органаў улады і кіравання ва ўмовах пераходу да міру.

Дзейнасць Саўнаркама рэспублікі ў пачатку вайны вызначалася арганізацыйна-гаспадарчымі задачамі, звязанымі з перабудовай работы прамысловасці і транспарту на ваенны лад, эвакуацыяй насельніцтва і матэрыяльных сродкаў у глыбокі савецкі тыл.

Дзейнасць беларускага ўрада не спынялася і ва ўмовах эвакуацыі. З мэтай наладжвання і ўмацавання сувязі з грамадзянамі БССР, якія знаходзіліся ў тыле, і паляпшэння работы сярод іх урад у красавіку 1942 г. арганізаваў аддзел па рабоце сярод эвакуіраванага з Беларусі насельніцтва.

Пасля ўваходжання часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі СНК БССР разгарнуў работу па арганізацыі дзейнасці органаў кіравання і аднаўленні разбуранай гаспадаркі ў вызваленых раёнах рэспублікі.

На працягу 1943—1945 гг. урад Беларусі разгледзеў шырокае кола пытанняў аб узнаўленні дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання, гаспадарчых і культурных устаноў, ліквідацыі вынікаў акупацыі і г.д. Напрыклад, калі ў 1943 г. ён прыняў 276 пастаноў і распараджэнняў, у 1944 г. — 990, то ў 1945 г. — каля 2 тыс. Акрамя таго, урад накіроўваў і пастаянна кантраляваў дзейнасць наркаматаў і выканкамаў мясцовых Саветаў, у сувязі з чым да 1944 г. на вызваленай ад акупантаў тэрыторыі пачалі дзейнасць амаль усе цэнтральныя органы дзяржаўнага кіравання і гаспадарчыя органы, выканаўчыя камітэты мясцовых Саветаў.

У лістападзе 1943 г. упершыню за ваенныя гады пачалася работа па складанні народнагаспадарчага плана і дзяржаўнага бюджэту рэспублікі на 1944 г. У жніўні 1945 г. ЦК КП(б)Б і СНК Беларусі разгледзелі першы пасляваенны пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР.

33. Права ў гады вайны

Пры аналізе асноўных галін права Беларусі прыходзіцца абапірацца на агульнасаюзныя заканадаўчыя акты, перш за ўсё на акты грамадзянска-прававога і крымінальна-прававога характару, таму што згодна з Канстытуцыяй СССР выданне Крымінальнага і Грамадзянскага кодэксаў было аднесена да кампетэнцыі СССР, а ў астатніх галінах права таксама дзейнічалі ў асноўным нормы агульнасаюзнага права. Перш за ўсе трэба адзначыць, што грамадзянска-прававое рэгуляванне маёмасных адносін у перыяд вайны было падпарадкавана мабілізацыі ўсіх рэсурсаў краіны для забеспячэння перамогі, абароне сацыялістычных маёмасных адносін, аднаўленню разбуранай гаспадаркі. Для ўзмацнення грамадзянска-прававой аховы сацыялістычнай уласнасці была павышана матэрыяльная адказнасць за раскраданне, недастачу і страту тавараў, гаручага, гібель коней і буйной рагатай жывёлы.

У гады вайны прымаліся меры па сацыяльнай абароне насельніцтва, Так, згодна з Пастановай СНК СССР ад 5 жніўня 1941 г. на час вайны за ўсімі ваеннаслужачымі захоўвалася іх жылая плошча, і жыльцы, якія часова займалі кватэру ваеннаслужачага, абавязаны былі вызваліць яе. Грамадзяне, якія вярнуліся з эвакуацыі, мелі права ў судовым парадку патрабаваць вызвалення раней прыналежнай ім жылой плошчы.

14 сакавіка 1945 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР былі ўнесены значныя змены і ў парадак атрымання спадчыны. Перш за ўсё было пашырана кола спадчыннікаў, у лік якіх уключаліся бацькі, браты і сёстры памерлага, а таксама вызначалася чарговасць яе атрымання. Спадчыннікамі першай чаргі з'яўляліся дзеці, муж або жонка і непрацаздольныя, што былі на утрыманні спадчынадаўцы не менш як год да яго смерці. У выпадку адсутнасці спадчыннікаў першай чаргі ці непрыняцця імі спадчыны да яе атрымання прызываліся працаздольныя бацькі, а пры іх адсутнасці — браты і сёстры памерлага.

Гэтым жа ўказам былі пашыраны правы спадчынадаўцы па завяшчанні сваёй маёмасці. Яна магла быць завешчана аднаму або некалькім асобам з ліку спадчыннікаў паводле закону, а таксама дзяржаўным органам і грамадскім арганізацыям. Акрамя таго, спадчынадавец атрымаў права пры адсутнасці законных спадчыннікаў завяшчаць сваю маёмасць любому грамадзяніну.

У гады вайны быў прыняты шэраг заканадаўчых актаў, якія рэгулявалі пытанні грамадзянскага працэсу. Пастанова пленума Вярхоўнага суда СССР ад 27 чэрвеня 1941 г. прыпыняла вядзенне ўсіх

незакончаных спраў аб высяленні з жылых памяшканняў асоб, прызваных у дзеючую армію, і членаў іх сямей. Прыпыняліся на перыяд ваенных дзеянняў і ўсе неразгледжаныя грамадзянскія справы іншых катэгорый, калі адказчыкі знаходзіліся ў арміі. З кастрычніка 1941 г. падлягалі спыненню ўсе неразгледжаныя справы аб спагнанні адміністрацыйных штрафаў з асоб, прызваных у армію, а ўсякага роду даверанасці і завяшчанні маглі быць засведчаны акрамя натарыяльных органаў камандаваннем вайсковых часцей, начальнікамі шпіталяў. У судовых органах падлягалі прыпыненню ўсе справы аб спагнанні нядоімак па абавязковых пастаўках сельгаспрадукцыі дзяржаве, падатках і акладнаму страхаванні ў выпадках прызыву членаў гаспадаркі ў армію.

Уводзілася асобая стадыя судовага разбору — прымірыцельная вытворчасць у народным судзе. Справа аб скасаванні шлюбу разглядалася па заяве мужа і жонкі або аднаго з іх, як правіла, па месцы жыхарства адказчыка. Патрабавалася абавязковая публікацыя ў мясцовым друку пра тое, што адбудзецца разгляд справы аб разводзе. Муж і жонка мелі права спыніць справу на любой стадыі працэсу. Прысутнасць у судзе мужа і жонкі з'яўлялася абавязковай. У выпадку скасавання шлюбу суд вызначаў, пры кім з бацькоў застаюцца дзеці, і ўстанаўліваў памер утрымання на іх аліментаў, рабіў падзел маёмасці і г.д.

Асноўная задача крымінальнага заканадаўства перыяду вайны заключалася ў ахове ўстаноўленага правапарадку, умацаванні воінскай і працоўнай дысцыпліны. Разам з тым неабходна падкрэсліць, што на часова акупіраванай тэрыторыі БССР захоўвалася дзеянне савецкага заканадаўства. Таму асобы, якія ўчынілі на тэрыторыі рэспублікі злачынствы, падлягалі крымінальнай адказнасці па савецкіх законах.

У барацьбе з раскраданнем дзяржаўнай і грамадскай маёмасці шырока прымяняўся Закон ад 7 жніўня 1932 г., які прадугледжваў павышаную адказнасць за крадзяжы аж да расстрэлу. 23 ліпеня 1942 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР была ўстаноўлена адказнасць у выглядзе турэмнага зняволення ад трох да пяці гадоў за раскраданне гаручага ў МТС і саўгасах; 13 красавіка 1942 г. — крымінальная адказнасць за адмаўленне і ўхіленне ад працоўнай павіннасці, а праз два дні — за ўхіленне ад мабілізацыі на сельскагаспадарчыя работы, самавольнае пакіданне гэтых работ, а таксама за невыпрацоўку абавязковага мінімуму працадзён.

Пасля заканчэння вайны дзеянне надзвычайных крымінальных законаў ваеннага часу было скасавана Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 21 верасня 1945 г. Але дзеянне ўказа не

распаўсюджвалася на заходнія раёны Беларусі, дзе гэтыя законы захоўваліся да 4 ліпеня 1946 г.

Крымінальна-працэсуальнае заканадаўства таксама было накіравана на заваяванне перамогі. Ваенным трыбуналам у складзе трох пастаянных членаў суда, без пракурора і абаронцы, давалася права разглядаць справы праз 24 гадзіны пасля ўручэння абвінавачванаму копіі абвінаваўчага заключэння. Прыгаворы трыбуналаў касацыйнаму абскарджанню не падлягалі і маглі быць адменены або зменены толькі ў парадку нагляду.

З устанаўленнем крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад мабілізацыі на сельскагаспадарчыя работы, самавольнае пакіданне гэтых работ і за невыпрацоўку мінімуму працадзён без уважлівых прычын пастановай СНК СССР ад 25 красавіка 1942 г. быў вызначаны парадак узбуджэння спраў гэтай катэгорыі. Падставай для ўзбуджэння крымінальнай справы за ўхіленне ад мабілізацыі на сельскагаспадарчыя работы з'яўляліся матэрыялы, якія накіроўваліся ў народны суд старшынёй або намеснікам старшыні гарадскога (раённага), пасялковага ці сельскага Савета дэпутатаў працоўных. Пасля паступлення матэрыялаў у суд народны суддзя ўзбуджаў крымінальную справу і назначаў яе да слухання з разлікам разгляду яе ў дзесяцідзённы тэмін.

У перыяд вайны некаторыя ўзнікаўшыя ў судовай практыцы пытанні працэсуальнага характару тлумачыліся ў кіруючых пастановах пленума Вярхоўнага суда СССР.

У сувязі з тым, што ў ваенны час паўторны разгляд справы судом, які вынес прыгавор, пасля адмены рашэння вышэйстаячай інстанцыяй не заўсёды быў магчымы, 13 лістапада 1941 г. пленум даў указанне аб накіраванні такіх спраў на новы разгляд у любы суд роўнай падсуднасці.

Усе незакончаныя вытворчасцю справы аб контррэвалюцыйных злачынствах, асабліва небяспечных злачынствах супраць парадку кіравання і найбольш цяжкіх злачынствах агульнакрымінальнага характару, падлягалі накіраванню праз пракуратуру ў ваенны трыбунал па месцы службы абвінавачванага. Справы аб іншых катэгорыях злачынстваў падлягалі спыненню, паколькі іх разгляд пасля вяртання абвінавачваных з ваеннай службы быў яўна немэтазгодны.

Пасля заканчэння вайны нормы працэсуальнага права аб выключэннях з агульных правілаў судаводства, устаноўленыя Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 чэрвеня 1941 г. «Аб ваенным становішчы», спынілі сваё дзеянне. Вядзенне крымінальных спраў пачало адпавядаць нормам крымінальна-працэсуальнага кодэкса.

34. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання БССР у другой палове40-х — 80-я гг.

У верасні 1946 г. Вярхоўны Савет зацвердзіў Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб пераўтварэнні Савета Народных Камісараў БССР у Савет Міністраў БССР", аб утварэнні новых саюзна-рэспубліканскіх міністэрстваў і інш.

У лютым 1947 г. на аснове новага палажэння аб выбарах прайшлі выбары ў Вярхоўны Савет БССР, які сфарміраваў пастаянныя камісіі, зацвердзіў указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета, выбраў новы Прэзідыум, стварыў урад рэспублікі і Вярхоўны суд, рэдакцыйную камісію па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў ў Канстытуцыю.

На другой сесіі Вярхоўнага Савета БССР у ліпені 1947 г. быў прыняты Закон «Аб змяненні і дапаўненні тэксту Канстытуцыі БССР», у адпаведнасці з якім за вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады было замацавана права на прыняцце заканадаўства аб шлюбе і сям'і, зацвярджэнне справаздачы аб выкананні дзяржаўнага бюджэту БССР, унясенне ўдакладненняў у гарантыі правоў грамадзян на адпачынак і адукацыю. Закон дапоўніў артыкул Канстытуцыі аб раўнапраўі жанчын з мужчынамі палажэннем аб дзяржаўнай дапамозе мнагадзетным і адзінокім маці.

Актыўную работу праводзіў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР з 1946 па 1955 г. Ён кіраваў арганізацынна-масавай работай мясцовых Саветаў, зацвярджаў палажэнні аб выбарах, прымаў указы аб парадку іх правядзення, вырашаў пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення ў рэспубліцы, ратыфікаваў міжнародныя дагаворы, вырашаў міжнародна-прававыя пытанні, ажыццяўляў нарматворчую дзейнасць. Так, 25 снежня 1951 г. ён прымае Указ «Аб дзяржаўным сцягу БССР», а 24 верасня 1955 г. — Указ "Аб дзяржаўным гімне БССР".

Пасля XX з'езда КПСС актывізуецца дзейнасць вышэйшых органаў дзяржаўнай улады БССР. Прэзідыум Вярхоўнага Савета стаў склікаць сесіі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Канстытуцыі — не радзей за 2 разы ў год. У заканадаўчай дзейнасці Вярхоўнага Савета БССР стала выяўляцца агульнасаюзная тэндэнцыя пашырэння правоў саюзных рэспублік у вырашэнні пытанняў гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва.

У наступныя гады развіваецца кантрольна-наглядная і распарадчая дзейнасць Вярхоўнага Савета БССР, з'яўляюцца новыя камісіі: заканадаўчых прапаноў, па замежных справах, мандатная. У 1957 г. пачынае дзейнічаць камісія па народнай адукацыі і культурна-

асветніцкай рабоце, па ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні, жыллёвым будаўніцтве, сельскай гаспадарцы. У 1960 г. было зацверджана «Палажэнне аб пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета», у адпаведнасці з якім вызначаны два галоўныя напрамкі іх дзейнасці: падрыхтоўка законапраектаў і кантроль за выкананнем законаў і іх эфектыўнасцю. Да 1969 г. колькасць камісій узрасла да 15.

У 1957 г. у сувязі з прыняццем агульнасаюзных законаў былі ўнесены змяненні ў артыкул 19 Канстытуцыі БССР. Да кампетэнцыі рэспублікі было аднесена ўстанаўленне абласнога дзялення БССР, кіраўніцтва дарожным будаўніцтвам, транспартам і прадпрыемствамі сувязі рэспубліканскага значэння, а таксама прыняцце заканадаўства аб судовым ладзе і судаводстве, грамадзянскага і крымінальнага заканадаўства.

Знікла дробязная апека рэспублік з боку СССР у пытаннях дзяржаўнага планавання, фінансавання, у справе рэгулявання рэспубліканскіх бюджэтных сродкаў, была зменена практыка планавання ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці.

Усё гэта выклікала рост актыўнасці Вярхоўнага Савета БССР у галіне заканадаўчай дзейнасці. Так, з 1959 па 1967 г. ім было прынята 124 заканадаўчыя акты. У гэты перыяд ім быі прыняты законы аб ахове прыроды, аб парадку адклікання дэпутатаў Вярхоўнага Савета, абласнога, раённага, гарадскога, пасялковага і сельскага Саветаў, аб судовым ладзе, аб адвакатуры, аб парадку адклікання суддзяў і народных засядацеляў, аб змяненні сістэмы органаў кіравання, аб увядзенні ў дзеянне кодэксаў і інш.

Прыкладна ў такім жа напрамку вышэйшы орган дзяржаўнай улады працаваў да пачатку 90-х гг., гэта значыць да абвяшчэння суверэннай Рэспублікі Беларусь.

У разглядаемы перыяд у адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР на кожнай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі новага склікання фарміраваўся склад урада — Савет Міністраў БССР. Задачы па аднаўленні і далейшым развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі абумоўлівалі вялікую арганізацыйную і нарматыўна-прававую дзейнасць урада. Гэта знайшло адлюстраванне ў пастановах Савета Міністраў БССР, колькасць якіх у 1946 г. дасягнула 2300, а ў наступныя 12 гадоў — 1500 — 1600.

У 1957 г. у СССР была ажыццёўлена перабудова кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам. Замест сістэмы міністэрстваў, арганізаваных па галіновым прынцыпе, для кіраўніцтва народнай гаспадаркай была створана сістэма саўнаргасаў.

У сувязі з праведзенай рэарганізацыяй і стварэннем Саўнаргаса ў БССР было скасавана дзевяць міністэрстваў, што прывяло да скарачэння складу Савета Міністраў рэспублікі.

Саўнаргас выступаў як орган дзяржаўнага кіравання народнай гаспадаркай, надзелены пэўнымі выканаўча-распарадчымі паўнамоцтвамі. У прыватнасці, ён ажыццяўляў кіраўніцтва даручанымі яму галінамі гаспадарчага жыцця і перададзенымі ў падпарадкаванне прадпрыемствамі, будаўнічымі і іншымі арганізацыямі. Пастановы і распараджэнні СНГ БССР маглі быць зменены, скасаваны ці дапоўнены Саветам Міністраў БССР. Саўнаргас БССР з'яўляўся калегіяльным органам, а яго структурныя падраздзяленні (упраўленні і аддзелы) вырашалі ўсе пытанні на аснове адзіначалля.

Арганізацыя кіравання народнай гаспадаркай па тэрытарыяльным прынцыпе праз саўнаргасы некалькі пашырыла магчымасці спецыялізацыі і кааперавання ў межах эканамічнага раёна, аднак з часам было прызнана, што такая сістэма вядзе да драблення кіравання галінамі вытворчасці па многіх эканамічных раёнах і ў сувязі з гэтым яго аслаблення. Законам СССР «Аб змяненні сістэмы органаў кіравання прамысловасцю і пераўтварэнні некаторых іншых органаў дзяржаўнага кіравання» ад 2 кастрычніка 1965 г. і адпаведнымі законамі саюзных рэспублік саўнаргасы былі скасаваны. Замест іх пачалі стварацца агульнасаюзныя, саюзна-рэспубліканскія і рэспубліканскія галіновыя міністэрствы і ведамствы.

Выканаўча-распараджальная дзейнасць Савета Міністраў ажыццяўлялася праз агульна-нарматыўныя прававыя акты (пастановы), а канкрэтныя пытанні, якія тычыліся асобных прадпрыемстваў і арганізацый, рэгуляваліся распараджэннямі.

Такія метады і формы дзейнасці вышэйшага органа дзяржаўнага кіравання БССР функцыяніравалі да пачатку 90-х гг.

У заключэнне трэба адзначыць, што рэальная паўната ўлады на Беларусі ў разглядаемы перыяд знаходзілася ў руках бюро ЦК КПБ і яго першага сакратара. Менавіта апарат ЦК КПБ рыхтаваў праекты важнейшых рашэнняў у рэспубліцы, аналізаваў і кантраляваў дзейнасць вышэйшых дзяржаўных органаў, падбіраў і прызначаў кадры для работы ў іх.

35. Беларуская ССР на міжнароднай арэне

1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб наданні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі народны камісарыят». Закон замацаваў права саюзных рэспублік наладжваць непасрэдныя сувязі з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі. У адпаведнасці з гэтым Законам 24 сакавіка 1944 г. быў утвораны Народны Камісарыят Замежных спраў БССР. 26 сакавіка 1946 г. ён быў ператвораны у Міністэрства замежных спраў. Створаны наркамат разгарнуў вялікую работу, пацвярджэннем чаму з'явіўся ўдзел БССР у стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і ў распрацоўцы яе Устава.

Рашэнне аб уключэнні БССР і УССР у лік першапачатковых членаў ААН было прынята адзінагалосна. 6 мая 1945 г. паўнамоцная дэлегацыя БССР на чале з наркамам замежных спраў К.В. Кісялёвым прыбыла ў Сан-Францыска і 8 мая ўключылася ў работу канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

26 чэрвеня 1945 г. упаўнаважаныя дзяржаў-заснавальніц, у тым ліку і БССР, падпісалі Устаў ААН, які 30 жніўня 1945 г. быў ратыфікаваны Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР.

Удзел у рабоце ААН паклаў пачатак новаму этапу знешнепалітычнай дзейнасці Беларусі, якая працякала ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага права і ажыццяўлялася ў розных міжнародна-прававых формах. Рэспубліка вяла значную дыпламатычную перапіску, удзельнічала ў рабоце розных міжнародных канферэнцый, была членам многіх міжурадавых арганізацый, мела дагаворную практыку, аказвала дапамогу краінам, якія сталі на шлях самастойнага развіцця. Органы знешніх зносін выступалі з дэкларацыямі, заявамі і адозвамі па агульных і асобных пытаннях міжнародных адносін. З цягам часу ўстанавіліся пастаянныя кантакты ўрада БССР з урадамі дзяржаў і міжнароднымі арганізацыямі.

Беларусь мела сваіх пастаянных прадстаўнікоў пры штаб-кватэрах некаторых міжнародных арганізацый. Пастаяннае прадстаўніцтва нашай дзяржавы пры ААН і цяпер садзейнічае абароне знешнепалітычных інтарэсаў рэспублікі ў розных органах Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, дапамагае ўступаць у дзелавыя кантакты з прадстаўнікамі іншых дзяржаў пры ААН. БССР мела пастаянных прадстаўнікоў пры еўрапейскім аддзяленні ААН і іншых арганізацыях

у Жэневе, пры ЮНЕСКА ў Парыжы. Пэўныя функцыі рэспубліканскага органа знешніх зносін выконвала і Пастаяннае прадстаўніцтва Саўміна БССР пры Саўміне СССР.

Дыпламатычныя зносіны БССР з замежнымі дзяржавамі ажыццяўляліся з дапамогай пасольстваў і місій СССР, хоць канстытуцыі БССР і СССР не змяшчалі якіх-небудзь палажэнняў, што перашкаджалі наладжванню і развіццю непасрэдных дыпламатычных сувязяў БССР з замежнымі дзяржавамі.

У пасляваенны перыяд далейшае развіццё атрымалі міжнароднаправавыя формы знешнепалітычнай дзейнасці БССР, такія як непасрэдныя перагаворы з замежнымі дзяржавамі. Так, восенню 1944 г. праводзіліся беларуска-польскія перагаворы па пытанні змянення лініі дзяржаўнай граніцы.

Асобае месца ў дыпламатычнай практыцы БССР займала заключэнне многабаковых дагавораў з замежнымі дзяржавамі. У 40—80-я гг. рэспубліка ўдзельнічала больш чым у 300 розных міжнародных канферэнцыях. Сярод іх трэба адзначыць Парыжскую мірную канферэнцыю 1946 г., скліканую з мэтай выпрацоўкі мірных дагавораў з Балгарыяй, Венгрыяй, Італіяй, Румыніяй і Фінляндыяй — былымі саюзнікамі Германіі.

Удзел БССР у кадыфікацыі і развіцці міжнароднага права ажыццяўляўся у ходзе дыпламатычных кансультацый і перагавораў з прадстаўнікамі розных дзяржаў, якія праводзіліся як на двухбаковай, так і на многабаковай аснове. БССР заўсёды прымала ўдзел у розных міжнародных (міжурадавых) канферэнцыях, што спецыяльна склікаліся для кадыфікацыі асобных галін і інстытутаў міжнароднага права. Разам з дэлегацыямі СССР і УССР дэлегацыя Беларускай ССР удзельнічала ў рабоце Дыпламатычнай канферэнцыі па абароне ахвяр вайны, якая праходзіла ў Жэневе ў 1949г.

У 1954 г. прадстаўнікі БССР удзельнічалі ў рабоце Гаагскай канферэнцыі па абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту, у 1958 і 1960 гг. — у Жэнеўскай і Брусельскай канферэнцыі па кадыфікацыі важнейшых нормаў дыпламатычнага права, у 1963 г. — у Венскай канферэнцыі па консульскіх зносінах і імунітэтах, а таксама ў канферэнцыях па паветраным праве ў Гаазе (1970), па праве міжнародных дагавораў у Вене (1968 — 1969) і г.д.

Вялікай была дагаворная практыка БССР.

Беларуская дэлегацыя ўдзельнічала ва ўсіх чарговых і нечарговых сесіях Генеральнай Асамблеі ААН. Яе члены вылучаліся на розныя кіруючыя пасты ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, уключаючы пасады

намесніка старшыні Генеральнай Асамблеі, старшынь, намеснікаў і дакладчыкаў галоўных камітэтаў Генеральнай Асамблеі, а таксама выбіраліся ў склад розных камісій ААН.

Немалаважным з'яўлялася членства Беларускай ССР у спецыялізаваных установах ААН, створаных на аснове міжурадавых пагадненняў, — Сусветнай мэтэаралагічнай арганізацыі (СМА), Міжнароднай арганізацыі працы (МАП), Міжнародным саюзе электрасувязі (МСЭ), Сусветным паштовым саюзе (СПС), Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях асветы, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ІКАО), Міжнародным Агенцтве па атамнай энергіі (МАГАТЭ) і інш.

Прытрымліваючыся ва ўсіх пытаннях «узгодненай лініі сацыялізму», Беларуская ССР разам з СССР і УССР дабіліся прыняцця шэрага актаў у абарону інтарэсаў працоўных у капіталістычных і тых краінах, што сталі на шлях развіцця, а таксама цэлага шэрага дакументаў па раззбраенні.

Такім чынам, пасля ўступлення ў члены ААН БССР атрымала рэальную магчымасць лічыць сябе суверэнным і раўнапраўным удзельнікам міжнароднага права.

Улічваючы ўсё вышэйсказанае, можна з упэўненасцю сказаць, што Беларуская ССР атрымала рэальную магчымасць ажыццяўляць знешнепалітычную дзейнасць толькі пасля прыняцця Закона ад 1 лютага 1944 г., хоць права выступаць на міжнароднай арэне яна мела яшчэ ў адпаведнасці з Маніфестам ад 1 студзеня 1919 г. і Канстытуцыяй 1919 г., гэта значыць з дня свайго ўтварэння.

Аднак трэба адзначыць, што рэспубліка была не самастойнай у міжнародных зносінах і ў адпаведнасці з мэтамі і прынцыпамі Устава ўдзельнічала ў развіцці эканамічнага, культурнага і навуковага супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі толькі фармальна. Нягледзячы на юрыдычны статус суб'екта міжнароднага права, Беларуская ССР заўсёды дзейнічала ў рамках адзінай палітыка-ідэалагічнай лініі СССР, намечанай ЦК КПСС.

36. Развіццё права Беларускай ССР у другой палове 40-х — 80-я гг.

У другой палове 40-х — 80-я гг. права рэспублікі развівалася ў адпаведнасці з агульнай палітыкай Саюза ССР і тымі галоўнымі гаспадарча-палітычнымі і ідэалагічнымі задачамі, на якія нацэльвала кіруючая Камуністычная партыя. У сувязі з гэтым характэрнымі нарматыўна-прававымі актамі, якія адлюстроўвалі сутнасць дадзенага этапа развіцця дзяржавы, з'яўляліся сумесныя пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ці пастановы ЦК КПСС, ВЦСПС і Савета Міністраў СССР.

Аналіз канкрэтнага гісторыка-прававога матэрыялу дазваляе выдзелідь тры асноўныя напрамкі ў развіцці права Беларускай ССР. Па-першае, у другой палове 40-х — 80-я гг. шырока практыкавалася прыняцце агульнасаюзных нарматыўных актаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі ўсіх саюзных рэспублік. Па-другое, у сувязі з пэўным размежаваннем кампетэнцыі Саюза ССР і саюзных рэспублік у сферы заканадаўства прымаліся «Асновы заканадаўства», якія і ўстанаўлівалі асноўныя прынцыпы, паняцці і палажэнні тых ці іншых галін права. У адпаведнасці з «Асновамі заканадаўства» саюзныя рэспублікі прымалі новыя і перагледжвалі дзеючыя кодэксы і законы. Па-трэцяе, у Беларускай ССР прымаліся ўласныя заканадаўчыя акты.

Грамадзянскае права было накіравана на ўмацаванне дзяржаўнай уласнасці, узмацненне планавага пачатку ў народнай гаспадарцы, удасканальванне прававых формаў эканамічных сувязяў паміж гаспадарчымі арганізацыямі. Пры захаванні асноўных прынцыпаў прававога рэгулявання гаспадарчых адносін, выпрацаваных у даваенныя гады, патрабавалася ўпарадкаваць пытанні, звязаныя перш за ўсё з устанаўленнем дагаворных адносін. Яны былі ўрэгуляваны пастановай Савета Міністраў ад 21 красавіка 1949 г. «Аб заключэнні гаспадарчых дагавораў»[1]. У дакументах асуджалася практыка бездагаворных паставак, якія зніжалі адказнасць пастаўшчыкоў і спажыўцоў за выкананне абавязацельстваў па пастаўцы прадукцыі. Прадпрыемствы абавязваліся афармляць гаспадарчыя сувязі па пастаўках прадукцыі пераважна на аснове генеральных і лакальных дагавораў. Пачынаючы з 1950 г. гэтыя дагаворы заключаліся ў нарматыўна ўстаноўленыя тэрміны.

Працягвалася ўдасканальванне прававога рэгулявання адносін з удзелам грамадзян, было пашырана кола аб'ектаў права асабістай уласнасці. Напрыклад, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

ад 26 жніўня 1948 г. «Аб праве грамадзян на куплю будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў» грамадзянам рэспублікі была дадзена магчымасць набываць на правах асабістай уласнасці (купіць ці пабудаваць) дом у адзін ці два паверхі з колькасцю пакояў ад аднаго да пяці.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 4 сакавіка 1949 г. нормы ГК БССР аб праве забудовы былі заменены нормамі аб праве грамадзян на куплю і будаўніцтва жылога дома.

У сувязі з неадпаведнасцю ГК 1923 г. новым умовам развіцця дзяржавы і шматлікасцю іншых грамадзянска-прававых нарматыўных актаў узнікла неабходнасць ва ўдасканальванні грамадзянскага заканадаўства. У 1961 г. былі прыняты Асновы грамадзянскага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік — першая агульнасаюзная кадыфікацыя нормаў савецкага грамадзянскага права. Услед за гэтым саюзныя рэспублікі пачалі распрацоўку праектаў новых ГК.

У БССР новы Грамадзянскі кодэкс быў зацверджаны Вярхоўным Саветам 11 чэрвеня 1964 г. і ўведзены ў дзеянне з 1 студзеня 1965 г. Пераняўшы амаль поўнасцю сістэму і нормы Асноў, ГК БССР у межах сваёй кампетэнцыі, дадзенай рэспубліцы ў галіне грамадзянска-прававога рэгулявання, канкрэтызаваў рэгламентацыю грамадзянска-прававых адносін. У прыватнасці, у агульныя палажэнні былі ўключаны правілы аб спыненні дзейнасці юрыдычных асоб, аб умоўных здзелках, даверанасці і інш., а таксама змяшчаліся нормы, не прадугледжаныя Асновамі, дагавор мены, дарэння, захавання, бязвыплатнага карыстання маёмасцю, даручэнні, адчужэнне жылога дома з умовай пажыццёвага ўтрымання ўладальніка і г.д. ГК БССР складаўся з 8 раздзелаў і 43 глаў, у якіх былі выкладзены агульныя палажэнні, права ўласнасці, права на адкрыццё, вынаходніцтва, рацыяналізатарскую прапанову, прамысловы ўзор, спадчыннае права, праваздольнасць замежных грамадзян, асоб без грамадзянства, прымяненне грамадзянскіх законаў замежных дзяржаў, міжнародных дагавораў і пагадненняў.

У Грамадзянскім кодэксе БССР былі дакладна вызначаны змест і аб'екты кожнай з формаў сацыялістычнай уласнасці, прававыя формы яе захавання. Рэгуляванне адносін асабістай уласнасці было накіравана на недапушчэнне яе перарастання ў прыватную. У галіне маёмасных адносін забяспечвалася ажыццяўленне правоў і выкананне абавязкаў арганізацыямі і грамадзянамі ў строгай адпаведнасці з прынцыпамі сацыялістычнага грамадства. Прававое рэгуляванне сувязяў паміж

юрыдычнымі асобамі ішло ў напрамку ўмацавання планавай і дагаворнай дысцыпліны, павышэння значэння гасразліку.

У сувязі з пэўнымі зменамі ў эканамічным развіцці дзяржавы шэраг інстытутаў грамадзянскага права таксама быў зменены і дапоўнены. Палажэнне аб сацыялістычным дзяржаўным вытворчым прадпрыемстве, прынятае Саветам Міністраў СССР 4 кастрычніка 1965 г., пашырыла правы юрыдычных асоб на аператыўнае кіраўніцтва маёмасцю, абаротнымі сродкамі і Інш.

Пачынаючы з 1967 г. органамі ўлады і кіравання быў прыняты шэраг нарматыўных актаў, якія прадугледжвалі павелічэнне памераў няўстоек за невыкананне ці неналежнае выкананне планавых і планава-дагаворных абавязацельстваў. Арбітраж атрымаў права пры грубым парушэнні ўмоў дагавора павышаць памер маёмаснай адказнасці суб'ектаў праваадносін і перадаваць спагнаныя сумы ў даход саюзнага бюджэту.

У 1967—1969 гг. былі прыняты пастановы па паляпшэнні планавання і арганізацыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння народнай гаспадаркі, распрацаваны палажэнні аб пастаўках прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння і тавараў народнага ўжытку; у 1970 г. зацверджаны новыя правілы аб дагаворах падрадў на капітальнае будаўніцтва і інш.

Пасля прыняцця ГК атрымала далейшае развіццё грамадзянскае заканадаўства адносна правоў і законных інтарэсаў грамадзян рэспублікі. У 1965 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову «Аб устараненні неабгрунтаваных абмежаванняў асабістай падсобнай гаспадаркі калгаснікаў, рабочых і служачых». У сувязі з рэканструкцыяй гарадоў і населеных пунктаў у ГК былі ўнесены дапаўненні, якія тычыліся пашырэння правоў грамадзян пры зносе іх домаўладанняў у мэтах дзяржаўных і грамадскіх патрэбнасцей. У гэты перыяд строга рэгламентуецца парадак размеркавання жылога фонду ў дамах мясцовых Саветаў і ведамстваў, абмену жылых памяшканняў, удакладняюцца падставы высялення ў судовым парадку рабочых і служачых, што спынілі працоўныя адносіны. Адбылося абнаўленне заканадаўства, якое рэгулявала адносіны куплі-продажу тавараў у крэдыт. 1 ліпеня 1966 г. у рэспубліцы быў зацверджаны новы прыкладны ўстаў жыллёва-будаўнічага кааператыва.

Змяненні грамадзянска-працэсуальнага заканадаўства гэтага перыяду тычыліся пытанняў падведамнасці, падсуднасці, перагляду рашэнняў і вызначэнняў судоў у парадку нагляду і інш. Так, у адпаведнасці з Палажэннем аб парадку разгляду працоўных спрэчак

ад 1 студзеня 1957 г. большую частку працоўных канфліктаў сталі разглядаць камісіі па працоўных спрэчках і фабрычна-заводскія камітэты прафсаюзаў. Працоўныя спрэчкі падлягалі разгляду ў народным судзе, як правіла, пасля разгляду іх у камісіях ФЗМК. Вялікае значэнне мела пастанова пленума Вярхоўнага суда СССР ад 7 мая 1954 г. «Аб судовай практыцы па справах аб устанаўленні фактаў, ад якіх залежыць узнікненне, змяненне і спыненне асабістых або маёмасных правоў грамадзян, у якім прыводзіўся прыкладны пералік фактаў, што падлягалі ўстанаўленню ў судзе: аб наяўнасці сваяцкіх адносін; рэгістрацыі ўсынаўлення, разводу, смерці, нараджэння; знаходання ў фактычных шлюбных адносінах, на ўтрыманні і інш.

11 чэрвеня 1964 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў закон «Аб зацвярджэнні Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса БССР». Новы ГПК складаўся з 6 раздзелаў і 32 глаў.

У адрозненне ад папярэдняга ў новым Грамадзянска-працэсуальным кодэксе больш дакладна размяжоўваліся правы і абавязкі асоб, якія ўдзельнічалі ў працэсе, а таксама рэгламентаваўся новы працэсуальны парадак вырашэння шэрага іншых пытанняў. Новы ГПК БССР у адрозненне ад адпаведных кодэксаў іншых рэспублік уключаў у сябе артыкул 239, які прадугледжваў магчымасць узбуджэння па ініцыятыве суда спраў аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або памерлым.

Пазней у Грамадзянска-працэсуальны кодэкс уносіліся дапаўненні і змяненні. Так, у 1966 г. быў зменены парадак разгляду спраў аб скасаванні шлюбу. Канчатковае рашэнне па гэтым пытанні сталі выносіць раённыя (гарадскія) народныя суды, была адменена абавязковая публікацыя ў друку аб скасаванні шлюбу.

У снежні 1968 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Асновы зямельнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, на падставе якіх 24 снежня 1970 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Зямельны кодэкс рэспублікі. У гэтым законе асаблівае значэнне надавалася землям сельскагаспадарчага прызначэння, прадугледжваўся шэраг гарантый супраць неабгрунтаванага адабрання асабліва каштоўных сельскагаспадарчых угоддзяў з севазвароту, устанаўліваліся правы землекарыстальнікаў і іх адказнасць за парушэнне зямельнага заканадаўства. У 1975 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову аб выдачы ўсім землекарыстальнікам дзяржаўных актаў на права карыстання зямлёй і зацвердзіў іх адзіную форму.

У развіцці крымінальнага права на Беларусі вялікая роля належала агульнасаюзным законам. Усе змяненні і дапаўненні крымінальнага

заканадаўства Беларускай ССР грунтаваліся на агульнасаюзных актах.

У разглядаемы перыяд крымінальнае заканадаўства развівалася па двух асноўных напрамках: значнае ўзмацненне барацьбы з найбольш цяжкімі і распаўсюджанымі злачынствамі, павышэнне крымінальнай адказнасці за іх учыненне і ў той жа час некаторае звужэнне сферы крымінальных рэпрэсій за ўчыненне дзеянняў, якія на дадзеным этапе не патрабавалі прымянення пакарання.

26 мая 1947 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР была адменена смяротная кара, а ў якасці вышэйшай меры пакарання прадугледжвалася зняволенне ў папраўчапрацоўны лагер тэрмінам на 25 гадоў. Аднак 12 студзеня 1950 г. смяротная кара была адноўлена ў адносінах да здраднікаў Радзімы, шпіёнаў і дыверсантаў, а ў 1954 г. прымяненне смяротнай кары было пашырана і на асоб, учыніўшых наўмысныя забойствы пры абцяжваючых акалічнасцях.

У 50-я гг. пачаўся працэс звужэння сферы крымінальнай адказнасці. Так, у 1955 г. была адменена крымінальная адказнасць за самавольны праезд у таварных цягніках, за продаж, абмен і водпуск на бок кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый абсталявання і матэрыялаў; у 1956 г. адмяняецца крымінальная адказнасць рабочых і служачых за самавольнае пакіданне прадпрыемстваў і ўстаноў, за прагул без уважлівай прычыны і інш.

25 снежня 1958 г. Вярхоўным Саветам СССР прыняты Асновы крымінальнага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, замяніўшыя Асноўныя пачаткі крымінальнага заканадаўства 1924 г. На базе саюзнага дакумента пачалася распрацоўка праекта новага КК БССР.

Новы Крымінальны кодэкс рэспублікі быў прыняты Вярхоўным Саветам БССР 29 снежня 1960 г. (уведзены ў дзеянне 1 красавіка 1961 г.). У Агульную частку ўваходзіла глава, у якой змяшчаліся новыя палажэнні аб прымусовых мерах медыцынскага і выхаваўчага характару. КК БССР прадугледжваў магчымасць вызвалення ад крымінальнай адказнасці ў выпадку, калі да часу разгляду справы ў судзе ўчыненае дзеянне страціла характар грамадска небяспечнага або сам вінаваты перастаў быць грамадска небяспечным. Вінаваты вызваляўся ад крымінальнай адказнасці таксама ў выпадку, калі дзякуючы сваім бездакорным паводзінам і сумленным адносінам да працы не мог быць прызнаны грамадска небяспечным да часу разгляду справы ў судзе.

Новы Крымінальны кодэкс захаваў такія інстытуты вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання, як сканчэнне тэрміну даўнасці

прыцягнення да крымінальнай адказнасці ці прыгавору, умоўнадатэрміновае вызваленне, амністыя ці памілаванне, а таксама ўпершыню ўводзіў такія, як перадача справы ў таварысцкі суд або перадача вінаватага на парукі.

КК БССР рэгламентаваў прымяненне наступных відаў пакарання: пазбаўленне волі; ссылка; высылка; папраўчыя работы без пазбаўлення волі; пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю; штраф; звальненне з пасады; грамадскае ганьбаванне; накіраванне ў дысцыплінарны батальён ваеннаслужачых тэрміновай службы; канфіскацыя маёмасці; пазбаўленне воінскага ці спецыяльнага звання. У выглядзе часовай выключнай меры пакарання рэгламентавалася прымяненне смяротнай кары. З 25 да 15 гадоў скарачаўся тэрмін пазбаўлення волі і з 10 да 5 гадоў — максімальны тэрмін ссылкі. Памер утрымання з заработку пры назначэнні папраўчых работ памяншаўся з 25 да 20 %.

Крымінальным кодэксам быў канкрэтызаваны інстытут ўмоўнага асуджэння з выпрабавальным тэрмінам у 5 гадоў (замест 10 паводле КК БССР 1928 г.). Упершыню давалася паняцце асабліва небяспечнага рэцыдывіста і агаворвалася, што да іх не магло быць прыменена ўмоўнадатэрміновае вызваленне, амністыя і інш.

Асаблівая частка змяшчала главы аб відах злачынстваў: 1) дзяржаўныя злачынства; 2) злачынствы супраць сацыялістычнай уласнасці; 3) злачынствы супраць жыцця, здароўя, свабоды і годнасці асобы;

4) злачынствы супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян; 5) злачынствы супраць асабістай уласнасці грамадзян; 6) гаспадарчыя злачынствы; 7) службовыя злачынствы; 8) злачынствы супраць правасуддзя; 9) злачынствы супраць парадку кіравання; 10) злачынствы супраць грамадскай бяспекі, грамадскага парадку і здароўя насельніцтва; 11) воінскія злачынствы.

У параўнанні з КК БССР 1928 г. у новым Кодэксе была істотна перабудавана структура Асаблівай часткі. Так, маёмасныя злачынствы дзяліліся на злачынныя дзеянні супраць сацыялістычнай і асабістай уласнасці, з'явіліся новыя главы аб крымінальна каральных дзеяннях супраць палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых правоў грамадзян, супраць правасуддзя і інш. Шэраг злачынстваў выключаліся (дыскрэдытаванне ўлады, правакацыя хабару, прымушэнне да аборту, парушэнне правілаў гандлю) і, наадварот, прызнаваліся (самагонаварэнне) злачынствамі ў выпадку іх учынення пасля прымянення мер грамадскага ці адміністрацыйнага ўздзеяння, звужаўся

шэраг саставаў (напрыклад, выпуск недабраякаснай прадукцыі прызнаваўся злачынствам толькі ў выпадку неаднаразовасці ці буйных памераў).

Пазней у КК БССР 1960 г. былі ўнесены істотныя змяненні і дапаўненні. Так, у 1965 г. у КК быў уведзены артыкул, які прадугледжваў адказнасць за ўгон аўтатранспартных сродкаў без мэты іх выкрадання. Большая частка дапаўненняў была звязана з устанаўленнем крымінальнай адказнасці за дзеянні, што раней не ўтваралі саставу злачынства: учыненае ўпершыню самагонаварэнне; загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва; атрыманне хабару пры абцяжваючых акалічнасцях; нядбайнае выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі; супраціўленне работніку міліцыі ці народнаму дружыннiку, не спалучанае з насіллем ці пагрозай яго прымянення; скормліванне жывёле і птушцы хлебапрадуктаў; самавольнае без патрэбы спыненне цягніка; уцягненне непаўналетніх у п'янства і г.д.

У 1973—1975 гг. была ўстаноўлена крымінальная адказнасць за давядзенне непаўналетняга да стану ап'янення; за угон паветранага судна; за дзеянні, якія садзейнічалі наркаманіі, а таксама ўдакладнена і павышана адказнасць за выраб і збыт моцных спіртных напіткаў і інш. Былі ўнесены значныя змяненні і дапаўненні, звязаныя з узмацненнем пакарання за шэраг цяжкіх злачынстваў (напрыклад, пашырана прымяненне смяротнага пакарання), а таксама папраўкі, якія змякчалі пакаранне за ўчыненне асобных крымінальна-каральных дзеянняў.

Развіццё крымінальна-працэсуальнага заканадаўства дадзенага перыяду ішло ў напрамку ўстаранення ўсіх тых негатыўных з'яў у дзейнасці органаў расследавання, пракуратуры і суда, якія былі дапушчаны раней. З ліквідацыяй у 1953 г. Асобай нарады пры МУС СССР як неканстытуцыйнага органа быў адноўлены прынцып ажыццяўлення правасуддзя толькі судом, рэалізаваны паступовы пераход ад празмернай цэнтралізацыі судовага нагляду да пашырэння правоў пракурорскага нагляду, адменены працэсуальныя нормы, што абмяжоўвалі права абвінавачванага на абарону, і інш.

З адменай у 1956 г. спрошчанага парадку вытворчасці па справах аб тэрарыстычных актах і тэрарыстычных арганізацыях, шкодніцтве і дыверсіях устанаўліваўся адзіны парадак судаводства па крымінальных справах.

Пасля прыняцця 25 снежня 1958 г. Вярхоўным Саветам СССР «Асноў крымінальнага судаводства Саюза ССР і саюзных рэспублік» быў распрацаваны новы Крымінальна-працэсуальны кодэкс БССР. Ён быў зацверджаны Вярхоўным Саветам БССР 29 снежня 1960 г. і ўступіў у дзеянне з 1 красавіка 1961 г.

Кодэксам рэгламентаваўся адзіны працэсуальны парадак вытворчасці крымінальных спраў, выключалася спрошчанасць пры іх расследаванні, разглядзе і вырашэнні, удзялялася ўвага прыцягненню грамадскасці да работы па барацьбе са злачыннасцю. У новым КПК рэспублікі гаварылася не толькі аб забеспячэнні непазбежнасці пакарання, але і аб неабходнасці выяўлення прычын і ўмоў, што садзейнічалі ўчыненню злачынстваў, а таксама аб іх прафілактыцы.

Пазней КПК БССР быў дапоўнены новымі палажэннямі. Павялічылася колькасць артыкулаў, з'явіліся новыя главы і два раздзелы. Напрыклад, у 1966 г. у КПК быў уключаны раздзел «Вытворчасць спраў аб хуліганстве».

Для КПК БССР 1960 г. характэрна замацаванне адзінай сістэмы важнейшых прынцыпаў савецкага крымінальнага працэсу (прэзумпцыя невінаватасці, захаванне законнасці і ўстанаўленне ісціны па кожнай крымінальнай справе). Упершыню заканадаўча быў замацаваны прынцып ажыццяўлення правасуддзя па крымінальных справах толькі судамі. Ніхто не мог быць прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства і пакараны інакш, як па прыгаворы суда.

КПК замацаваў і такія важныя прынцыпы, як ажыццяўленне правасуддзя на аснове роўнасці грамадзян перад законам і судом; абавязковы ўдзел у судовым разборы народных засядацеляў і калегіяльны разгляд спраў; незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону; вядзенне судаводства на нацыянальнай мове ці на мове большасці мясцовага насельніцтва; галоснасць судовага разбору; забеспячэнне абвінавачванаму права на абарону і інш.

У 1966 г. у КПК былі ўведзены новыя артыкулы, якія рэгламентавалі парадак прыцягнення спецыялістаў да ўдзелу ў справе, умовы і парадак прымянення гуказапісу, кіназдымкі і іншых тэхнічных сродкаў пры правядзенні следчых дзеянняў; у 1970 г. КПК быў дапоўнены артыкуламі аб парадку ўтрымання пад вартай як меры стрымання, аб абавязковым удзеле абаронцы на папярэднім следстве з моманту аб'яўлення абвінавачванаму аб заканчэнні папярэдняга следства і па справах асоб, якія не валодалі мовай судаводства, а таксама абвінавачваных у злачынствах, за якія магла быць назначана смяротная кара.

У наступныя гады ўносіліся новыя папраўкі ў КПК. З моманту прыняцця КПК па 1992 г. колькасць артыкулаў у ім павялічылася з 399 да 411.

У разглядаемы перыяд быў прыняты шэраг важных нарматыўна-прававых актаў, якія ў сувязі з чарговым этапам развіцця дзяржавы

таксама змяніліся. Так, у 1969 г. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР зацвердзілі новы «Прыкладны ўстаў калгасаў», у 1969 г. Вярхоўным Саветам БССР быў прыняты Кодэкс аб шлюбе і сям'і, у 1971 г. — Папраўча-працоўны кодэкс БССР, у 1972 г. — Кодэкс законаў аб працы БССР, у 1984 г. — Кодэкс ад адміністрацыйных правапарушэннях БССР і інш. Усе гэтыя заканадаўчыя акты прымаліся ў адпаведнасці з агульнасаюзнымі асновамі заканадаўства.

Такім чынам, заканадаўства ў пасляваенны перыяд развівалася ў напрамку ўмацавання пазіцый дзяржавы ва ўсіх сферах праваадносін. Разам з тым неабходна падкрэсліць, што заканатворчасць у дзяржаве па-ранейшаму грунтавалася на дырэктыўных указаннях Камуністычнай партыі, выпрацаваных на з'ездах і пленумах. У сувязі з гэтым многія палажэнні і прававыя нормы ўводзіліся ў заканадаўчыя акты з прапагандысцкай мэтай і не мелі рэальных гарантый.

Заканадаўчыя акты, прынятыя Вярхоўным Саветам БССР самастойна, паўтаралі палажэнні саюзных законаў ці адпавядалі ім. У рэдкіх выпадках у іх можна выявіць нешта сваё, асаблівае. Але калі гэта «сваё», «асаблівае» і ўносілася, то толькі па нязначных пытаннях, якія не закраналі інтарэсаў СССР.

37. Канстытуцыя БССР 1978 г.

7 кастрычніка 1977 г. Вярхоўным Саветам СССР была прынята апошняя агульнасаюзная Канстытуцыя. У сувязі з гэтым пачалася распрацоўка праектаў адпаведных рэспубліканскіх дакументаў. 14 красавіка 1978 г. на нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання была прынята Канстытуцыя Беларускай ССР, якая была пабудавана ў поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР.

Канстытуцыя БССР 1978 г. складалася з 10 раздзелаў і 19 глаў. У першы раздзел «Асновы грамадскага ладу і палітыкі БССР» былі ўключаны палажэнні аб палітычнай і эканамічнай сістэме, у прыватнасці аб кіруючай і накіроўваючай ролі КПСС, аб сацыялістычнай уласнасці на сродкі вытворчасці ў дзяржаўнай (агульнанароднай) і калгасна-кааператыўнай форме, аб асабістай уласнасці грамадзян, аснову якой павінны былі складаць працоўныя даходы, а таксама аб сацыяльным развіцці і культуры, знешнепалітычнай дзейнасці БССР і абароне сацыялістычнай Айчыны.

Другі раздзел «Дзяржава і асоба» быў прысвечаны грамадзянству

Беларускай ССР, пытанням забеспячэння раўнапраўя грамадзян, іх асноўным правам, свабодам і абавязкам. Абвяшчаліся роўныя правы грамадзян на жыллё, ахову здароўя, карыстанне дасягненнямі культуры, удзел у кіраванні дзяржаўнымі справамі, аб'яднанне ў грамадскія арганізацыі і інш.

У трэцім раздзеле «Нацыянальна-дзяржаўная і адміністрацыйна-тэрытарыяльная будова БССР» гаварылася аб уваходжанні рэспублікі ў склад Саюза ССР і аб паўнамоцтвах Беларускай ССР.

У чацвёртым раздзеле «Саветы народных дэпутатаў і парадак іх выбрання» замацоўваліся сістэма і прынцыпы дзейнасці Саветаў народных дэпутатаў, выбарчая сістэма, асновы прававога статусу народнага дэпутата.

Раздзел пяты «Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання БССР» змяшчаў нормы, якія вызначалі месца і ролю Вярхоўнага Савета як вышэйшага органа дзяржаўнай улады рэспублікі, парадак фарміравання і дзейнасці Прэзідыума Вярхоўнага Савета, а таксама склад і кампетэнцыю ўрада — Савета Міністраў Беларускай ССР.

У шостым раздзеле «Мясцовыя органы дзяржаўнай улады і кіравання ў Беларускай ССР» гаварылася аб парадку фарміравання і дзейнасці мясцовых Саветаў і іх выканкамаў.

Сёмы раздзел Канстытуцыі быў прысвечаны дзяржаўнаму плану эканамічнага і сацыяльнага развіцця і дзяржаўнаму бюджэту БССР.

У восьмым раздзеле «Правасуддзе, арбітраж і пракурорскі нагляд» гаворка ішла аб парадку фарміравання судовых органаў рэспублікі, аб ажыццяўленні правасуддзя толькі судом, аб вядзенні судаводства на беларускай ці рускай мове або на мове большасці насельніцтва дадзенай мясцовасці, аб пракурорскім наглядзе і аб падпарадкаванні органаў пракуратуры Генеральнаму пракурору СССР.

Дзевяты раздзел прысвячаўся гербу, сцягу, гімну і сталіцы Беларускай ССР.

У Канстытуцыі гаварылася, што БССР з'яўляецца суверэннай сацыялістычнай дзяржавай, якая самастойна ажыццяўляе дзяржаўную ўладу на сваёй тэрыторыі (арт. 68), аднак толькі па-за межамі, вызначанымі ў артыкуле 73 Канстытуцыі СССР, у якім у якасці галоўных былі пастаўлены пытанні нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання СССР і гаспадарча-арганізацыйныя, абароны краіны, забеспячэння дзяржаўнай бяспекі, прадстаўніцтва ў міжнародных арганізацыях, агульныя, звязаныя з правядзеннем у жыццё палітыка-эканамічнай стратэгіі КПСС (прадугледжвалася стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму), а таксама пытанні распрацоўкі, зацвярджэння і

выканання адзінага дзяржаўнага бюджэту, кіраўніцтва грашова-крэдытнай сістэмай, узброенымі сіламі, вайны і міру і г.д. Завяршалася пералічэнне аб'ектаў агульнасаюзнага падпарадкавання ўказаннем на тое, што СССР ажыццяўляе кантроль за выкананнем агульнасаюзнай Канстытуцыі.

Канстытуцыю СССР 1977 г. адрознівала ад папярэдніх агульнасаюзных канстытуцый тое, што ў ёй адсутнічаў вычарпальны пералік прадметаў ведання СССР, што давала магчымасць саюзным органам пры неабходнасці дапаўняць яго. У той жа час у артыкуле 71 Канстытуцыі БССР указвалася, што «Беларуская ССР удзельнічае ў вырашэнні пытанняў, аднесеных да ведання Саюза ССР...».

У перыяд канца 80 — пачатку 90-х гг., што атрымаў назву перабудовы, якая завяршылася спыненнем існавання Саюза ССР, у Канстытуцыю БССР 1978 г. былі ўнесены істотныя змяненні. Яе дзеянне спынілася 15 сакавіка 1994 г. пасля прыняцця на 13-й сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі 12-га склікання Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

38. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР

У канцы 80-х гг. адзначаецца ажыўленне і хуткае нарастанне руху народаў за выхад з СССР і набыццё рэспублікамі сапраўднага дзяржаўнага суверэнітэту. Першымі да практычнай рэалізацыі гэтых мэт прыступілі рэспублікі Прыбалтыкі. У сакавіку 1990 г. Вярхоўны Савет Літвы першым з рэспублік СССР абвясціў аб аднаўленні поўнага дзяржаўнага суверэнітэту Літвы, якога яна была пазбаўлена ў 1940 г. у сувязі з далучэннем да СССР. Аб сваім суверэнітэце абвясцілі таксама Латвія і Эстонія. На Беларусі рух за нацыяналыаае адраджэнне і незалежнасць ад Цэнтра таксама ўзмацніўся, але ён прадугледжваў перш за ўсё карэннае пераўтварэнне Саюза ССР у сапраўды дэмакратычную прававую дзяржаву, заснаваную на добраахвотным аб'яднанні раўнапраўных суверэнных рэспублік.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі, якая адзначала, што Беларусь выбрала ўласны шлях развіцця, хоць і не выключала магчымасці аб'яднання разам з іншымі рэспублікамі ў новы Саюз. У сакавіку 1991 г. на рэферэндуме большасць насельніцтва рэспублікі выказалася за ўваходжанне ў абноўлены Саюз.

У сакавіку 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову «Аб канцэпцыі новага Саюзнага дагавора», прадугледжвалася прызнаць мэтазгодным уваходжанне Беларускай ССР у склад Саюза ССР з улікам пераўтварэння яго ў сапраўды дэмакратычную прававую дзяржаву, заснаваную на добраахвотным аб'яднанні раўнапраўных суверэнных рэспублік. У гэтым жа дакуменце падкрэслівалася неабходнасць удзелу Беларускай ССР у падрыхтоўцы Саюзнага дагавора. Адначасова быў прыняты Закон «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Беларускай ССР», артыкул 1 якога абвяшчаў, што ўся ўлада ў Беларускай ССР належыць народу, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы. Падкрэслівалася таксама, што выключнае права выступаць ад імя ўсяго народа рэспублікі належыць Вярхоўнаму Савету Беларускай ССР.

20 лютага 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Беларускай ССР», якім вызначыў сістэму і эканамічную базу мясцовага самакіравання ў рэспубліцы, замацаваў асновы прававога становішча мясцовых органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання.

Аднак надзеі забяспечыць суверэнітэт рэспублікі і ў той жа час захаваць Саюз аказаліся нязбыўнымі. Гэтаму перашкаджалі дзве сілы, якія займалі супрацьлеглыя пазіцыі. З аднаго боку, радыкальна-патрыятычныя нацыянальныя рухі ў рэспубліках, уплыў якіх хутка ўзрастаў, патрабавалі поўнай незалежнасці і ніякага Саюза; з другога — кіруючая партыйна-дзяржаўная наменклатура стаяла за захаванне Саюза як унітарнай дзяржавы толькі з падмаляваяым фасадам. З адзінствам краіны яны не ў апошнюю чаргу звязвалі свае надзеі на захаванне камандна-эканомікі, якая забяспечвала ім панаванне ў грамадстве. Гэта і было тое галоўнае, што аб'ядноўвала інтарэсы правячых колаў у Цэнтры і ў рэспубліках.

З мэтай не дапусціць набыцця рэспублікамі незалежнасці, спыніць радыкальныя рэформы ў эканоміцы і грамадстве група вышэйшых дзяржаўных і партыйных дзеячаў СССР, якія аказаліся на чале дзяржавы, арганізавалі жнівеньскі загавор. Узнікла рэальная пагроза прыпынення працэсу дэмакратызацыі і вяртання да аднапартыйнай сістэмы і камандна-адміністрацыйных метадаў кіравання. Падаўленне загавора адчыніла шлях да хуткага набыцця рэспублікамі поўнай незалежнасці. Менавіта спроба дзяржаўнага пераваротy ў Маскве выклікала неабходнасць увядзення ў жыццё Закона ад 25 жніўня 1991 г. «Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце БССР».

Для практычнага замацавання суверэнітэту рэспублікі і пераўтварэння яе ў незалежную дзяржаву асаблівае значэнне мела абарона эканамічнага суверэнітэту Беларусі. Гэта пытанне было вырашана 26 жніўня 1991 г., калі сесія Вярхоўнага Савета Беларусі прыняла Закон «Аб забеспячэнді палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР». Усе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы саюзнага падпарадкавання, якія размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, перадаваліся ва ўласнасць Беларускай ССР. Гэтым самым прамое ўмяшанне Цэнтра ў гаспадарчае жыццё рэспублікі спынялася.

Саюзна-рэспубліканскія міністэрствы і ведамствы былі пераўтвораны ў рэспубліканскія. Перш за ўсё гэта тычылася Міністэрства ўнутраных спраў і Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Утвараюцца Міністэрства абароны, Дзяржаўны мытны камітэт, Галоўнае ўпраўленне памежных войскаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і інш. Быў прыняты шэраг законаў, якія сталі прававой базай функцыяніравання асабістых узброеных сіл рэспублікі, рэгламентавалі ваенную дактрыну, якая зыходзіць з неабходнасці станаўлення бяз'ядзернай нейтральнай дзяржавы («Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе», «Аб абароне», «Аб узброеных сілах Рэспублікі Беларусь», «Аб статусе ваеннаслужачага» і інш.).

19 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет прыняў Закон аб назве Беларускай ССР, у адпаведнасці з якім яна пачала называцца «Рэспубліка Беларусь», а ў скарочаных назвах — «Беларусь». Новым сцягам Рэспублікі Беларусь з'явілася палотнішча з бела-чырвона-белай палосамі, а дзяржаўным гербам — герб «Пагоня». 18 кастрычніка 1991 г. быў прыняты Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь».

Першараднае значэнне ў культурна-нацыянальным адраджэнні сучаснай Беларусі мае вяртанне народу яго роднай мовы. Важным крокам на гэтым шляху з'явілася прыняцце Вярхоўным Саветам Закона аб мовах, які ўстанавіў, што дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца беларуская. Гэта значыць, што кожны грамадзянін Беларусі павінен ведаць мову дзяржавы, у якой ён жыве, карыстацца ёю ў якасці афіцыйных сродкаў зносін паміж людзьмі. Разам з тым Рэспубліка Беларусь забяспечвае права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін. У выніку абмеркавання гэтая норма была замацавана ў.артыкуле 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з вынікамі праведзенага 14 мая 1995 г. рэферэндума рускай мове нададзены роўны статус з беларускай, а герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг заменены цяперашнімі гербам Рэспублікі Беларусь і сцягам чырвона-зялёнага колеру з беларускім нацыянальным

арнаментам на белым полі.

Заключным акордам у набыцці Рэспублікай Беларусь, як і іншымі рэспублікамі былога Саюза, дзяржаўнага суверэнітэту з'явілася прыняцце 8 снежня 1991 г. пагаднення, якое падпісалі кіраўнікі Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны, аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). У ім абвяшчалася, што СССР як суб'ект міжнароднага права і палітычная рэальнасць спыніў сваё існаванне. Тры дзяржавы аб'ядналіся ў СНД і прапанавалі ўступіць у Садружнасць і іншым краінам былога СССР.

10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў пагадненне аб утварэнні СНД і прыняў рашэнне аб дэнансацыі Саюзнага дагавора 1922 г., а 21 снежня 1991 г. на сустрэчы ў Алматы быў падпісаны пратакол да Белавежскага пагаднення аб утварэнні СНД, у адпаведнасці з якім на раўнапраўнай аснове ўтварылася Садружнасць 11 незалежных дзяржаў.

Усе незалежныя дзяржавы знаходзяцца ў пошуку найбольш прымальных для ўсіх удзельнікаў прынцыпаў новай садружнасці. Так, распрацаваны і прыняты шэраг дакументаў, у тым ліку Устаў СНД, дзейнічае міжпарламенцкае аб'яднанне, цэнтр якога знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу, развіваюцца шматбаковыя адносіны паміж дзяржавамі, якія ўтварыліся на месцы былога Саюза.

Статус дзяржаўнай незалежнасці Беларусі прызнаны міжнародным супольніцтвам. Рэспубліка Беларусь па стане на жнівень 2000 г. прызнана 125 дзяржавамі свету. Яна паўнапраўны ўдзельнік нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, член Міжнароднага валютнага фонду, Сусветнага банка і іншых міжнародных фінансавых інстытутаў. У сваёй знешнепалітычнай дзейнасці Беларусь прытрымліваецца нейтралітэту і бяз'ядзернасці, праводзіць курс на ўмацаванне эканамічнага ўзаемадзеяння краін СНД, хутчэйшае фарміраванне ўсходне-еўрапейскага рынку, стварэнне ўмоў для яго паступовай інтэграцыі з Еўрапейскім супольніцтвам і ўтварэнне агульнага рынку Еўропы, удзяляе ўвагу развіццю двухбаковых эканамічных адносін з еўрапейскімі дзяржавамі.

Змест:

ДА ЧЫТАЧА 3
1. Прадмет і задачы гісторыі дзяржавы і права Беларусі 4
2. Грамадскі лад усходнеславянскіх княстваў
у IX - першай палове XIII стагоддзя 5
3. Палітычны лад дзяржаў-княстваў 7
4. Станаўленне права старажытнай
Беларусі і яго характарыстыка 9
5. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага,
Рускага і Жамойцкага 13
6. Грамадскі лад Вялікага Княства Літоўскага ў
XIV — першай палове XVI стагоддзя (да 1569 г.) 16
7. Палітычны лад ВКЛ 20
8. Люблінскі сойм і ўмовы аб'яднання ВКЛ з Польшчай 24
9. Заканадаўчае замацаванне самастойнасці
Вялікага Княства Літоўскага пасля Люблінскай уніі 26
10. Крыніцы права феадальнай Беларусі 28
11. Судзебнік Казіміра 1468 г. 31
12. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 32
13. Вышэйшыя судовыя органы Вялікага Княства Літоўскага 37
14. Мясцовыя судовыя органы ВКЛ 40
15. Працэсуальнае права Вялікага Княства Літоўскага 44
16. Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай 47
17. Спробы ажыццяўлення рэформаў у галіне
дзяржаўнага кіравання Рэчы Паспалітай у другой
палове XVIII ст. 52
18. Кароткі агляд права Беларусі ў другой
палове XVI — XVIII ст. 57
19. Судовыя ўстановы і права Беларусі
ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. 60
20. Рэформа 1861 г. Мясцовыя органы дзяржаўнага
кіравання і самакіравання пасля адмены прыгоннага права 63
21. Судовая, земская і гарадская рэформы 66
22. Першы усебеларускі з'езд і абвяшчэнне Беларускай
Народнай Рэспублікі 70
23. Утварэнне БССР. Стварэнне Літоўска-
Беларускай Рэспублікі 77
24. Другое абвяшчэнне БССР 80

25. Узаемаадносівы БССР і РСФСР. Утварэнне Саюза ССР.....82
26. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае
дзяленне БССР. Пашырэнне тэрыторыі рэспублікі.....84
27. Развіццё права ў Беларускай ССР у 20 — 30-я гг.....86
28. Канстытуцыі Беларускай ССР 1927 і 1937 гг.....93
29. Судовыя органы Беларусі ў 20 — 30-я гг.....98
30. Землі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.
Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.....101
31. Прававыя меры павышэння абараназдольнасці
краіны на пярэдадні і ў час Вялікай Айчыннай вайны.....104
32. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады і кіравання
ў гады Вялікай Айчыннай вайны 107
33. Права ў гады вайны.....109
34. Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады
і кіравання БССР у другой палове40-х — 80-я гг. 112
35. Беларуская ССР на міжнароднай арэне.....115
36. Развіццё права Беларускай ССР у другой
палове 40-х — 80-я гг.....118
37. Канстытуцыя БССР 1978 г.....126
38. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту Беларускай ССР.....128

Даведачны дапаможнік


Вішнеўскі Аляксей Федаравіч
Вішнеўская Ірына Уладзіміравна

ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

Адк. за выпуск *Ф.У. Пашчасцеў*
Кансультант *Г.М. Залашка*
Карэктар *Н.Р. Пашчасцева*
Набор, верстка *А.А. Мазанаў*

Падпісана ў друк 16.10.2000г. Фармат 60х84/16.
Папера афсетная. Афсетны друк.
Ум. др. арк. 7,78. Тыраж 1000 экз. Заказ

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ФілСерв плюс».
Ліцэнзія ЛВ №198 ад 12.02.98г.
220004, г. Мінск. ул. Мельнікайтэ, 16.



ISBN 985-6489-17-2